ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца
з 9 жніўня 1917 г.

24 ВЕРАСНЯ 2015 г. ЧАЦВЕР № 183 (28041) Кошт 2000 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



Пачуць песню пчол



Стаўка — на крэатыў



Прыгожыя да жаху...

*ЛІЧБА ДНЯ*

## На 14,5%

*павялічылася колькасць турыстаў, якія наведалі Беларусь у складзе арганізаваных тургруп за 2011—2014 гады ў параўнанні з 2010-м — 137 444 чалавекі. Лідзіруючыя пазіцыі па арганізаваных турыстах у 2014 годзе захаваліся за Расіяй — 111,3 тыс. чалавек (82,3%). Варта адзначыць турыстаў з экзатычных для Беларусі краін: Аргенціна — 26 чалавек, Бразілія — 16, Алжыр — 7, Бангладэш і Судан — па 4, Аман — 3, Камерун і Кувейт — па 2, Балівія, Гватэмала і Перу — па 1. Многія турысты прыязджаюць у Беларусь з мэтай папраўкі здароўе. Так, доля замежных грамадзян, якія адпачывалі ў беларускіх здраўніцах у 2014 годзе, склала 27,3%. Актыўна развіваецца ў Беларусі і аграэкатурызм.*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 24.09.2015 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 17603,00 | ▲ |
| Еўра | 19579,00 | ▼ |
| Рас. руб. | 266,13 | ▲ |
| Укр. грыўня | 815,90 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

# ТЭХАГЛЯД ПРОЙДЗЕНЫ — ВЫЛЕТ ДАЗВОЛЕНЫ

**Аляксандр САНКЕВІЧ – авіятэхнік верталёта МІ-2. Пасля заканчэння вучылішча грамадзянскай авіяцыі з 1986 года працуе з авіяцыйнай тэхнікай, абслугоўвае лятальныя апараты ў дзяржаўнай установе «Беллесавія».**

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.



■ Спажывецкі інтарэс

# ВЫПРАБАВАННЕ ЯКАСЦЮ

Як правяраюць замежныя прысмакі і касметыку?

**Згодна з новымі правіламі, імпартныя тавары, перш чым трапіць на прылавак, павінны прайсці дзяржаўную санітарна-гігіенічную экспертызу. Пастаўшчыкі прадстаўляюць у санслужбу дакументы на прадукцыю, якую ўвозяць, і спецыялісты на падставе гэтых папер вырашаюць, ці адпавядае яна патрабаванням бяспекі і якасці. Для імпарцёраў, чый тавар даследаваўся ў рамках сертыфікацыі і дэкларавання і ўжо мае гатовыя пратаколы выпрабавання, усё проста. Астатнім жа, каб атрымаць дакументы, давядзецца здаваць партыю ў лабараторыю. Што шукаюць у замежных прысмаках, выпрабаванні якой прадукцыі абыдуцца даражэй і чым небяспечная няправільная этыкетка? Адказы на гэтыя пытанні мы шукалі ў лабараторыях Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя.**

## Майка ў прабірцы

Лабараторыі пакуль не загружаны. Пастаўшчыкі толькі разбіраюцца ў механізме экспертызы: на мінулым тыдні зала, разлічаная на 50-60 чалавек, дзе праходзяць кансультацыі, кожны раз была цалкам забіта. Але спецыялісты запэўніваюць, што справяцца з наплывам тавараў. Толькі ў сістэме Міністэрства аховы здароўя ў Беларусі каля 130 лабараторый, і ўсе яны будуць задзейнічаны для экспертызы. Непасрэдна самі выпрабаванні будуць праводзіць у найбольш моцных цэнтрах, з добрым абсталяваннем (такіх па краіне амаль 40), а браць пробы могуць і дробныя раённыя пункты.

СТАР. 3



Фота Надзеі БУЖАН.

Па вадзе і паветры ў прабірках эксперты вызначаюць, колькі хімічных рэчываў выдзяляе ў навакольнае асяроддзе тая ці іншая рэч.

ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА
5 разоў на тыдзень!

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

Падпісацца на газету на IV квартал можна ў любым аддзяленні паштовай сувязі; з дапамогай аплатна-даведачнага тэрмінала РУП «Белпошта»; праз сістэму «інтэрнэт-падпіска» на сайце www.belpost.by; у кіёсках «Белсаюздрука»; у паштальёнаў.

Падпіска, дарэчы, можа стаць добрым падарункам для вашых родных і блізкіх, для вашых сяброў.

Падпісацца на «Звязду» можна заўсёды!

# Праблема невяртання

**Прэзідэнт запатрабаваў актывізаваць работу па спагнанні знешніх дэбіторскіх запазычанасцей**

На гэтым Аляксандр Лукашэнка акцэнтаваў увагу на праведзенай учора нарадзе. Прэзідэнт падкрэсліў, што ў гэты няпросты час бічом для эканомікі і дзяржаўных фінансаў стала праблема невяртання дэбіторскай запазычанасці. «Гэта значыць, што нашы прадпрыемствы пастаўляюць тавар, а грошы або не атрымліваюць наогул, што падобна да злачынства, або атрымліваюць несвоечасова, праз паўгода, а тое і праз год і гады. Гэта значыць, асобныя прадпрыемствы тавар аддалі, а грошай няма. Утвараецца дэбіторская запазычанасць. Краіна, прадпрыемствы, калектывы недаатрымліваюць грашовыя сродкі», — канстатаваў кіраўнік дзяржавы.

Пры гэтым Прэзідэнт падкрэсліў: «Калі гэта ўнутраная запазычанасць, то мы хутка разбяромся з такімі праблемамі, але самае небяспечнае, што дэбіторская запазычанасць — знешняя». Ён нагадаў, што для вырашэння гэтых пытанняў былі прыняты жорсткія рашэнні, асабліва ўнутры краіны. «Мы не дазволім губіць дзяржаўныя і іншыя прадпрыемствы, якія займаюцца вытворчасцю, рознаму жуллю», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

На нарадзе разглядалася, як вырашаецца гэтая праблема на Мінскім трактарным заводзе, паведамляе БелТА. Што робіцца для вяртання даўгоў і чаму гэтая работа ідзе так павольна, падрабязна разглядалася на сустрэчы, якая прайшла з удзелам кіраўнікоў сілавых міністэрстваў і ведамстваў. Падставай для нарады стаў зварот кіраўніка прадпрыемства МТЗ, які паступіў на імя Прэзідэнта.

«МТЗ — гэта флагман нашай індустрыі, наш брэнд, імідж дзяржавы, і там павінен быць парадак. Я запрасіў сюды сілавікоў для таго, каб разабрацца, у чым супрацьдзеянне ў працы МТЗ з боку пракуратуры, МУС, КДБ, КДК». Аляксандр Лукашэнка папярэдзіў: «Крый Божа, каб кантрольныя і праваахоўныя органы дзесьці камусьці перашкаджалі працаваць насуперак інтарэсам дзяржавы».

Па выніках мерапрыемства прынята рашэнне, што ў практыку работы Прэзідэнта ўводзіцца разгляд на нарадах значных скаргаў і лістоў, якія паступаюць на яго імя.

Што тычыцца сітуацыі, вынесенай на абмеркаванне на гэтай нарадзе, то пасля дэталёвага разбору аказалася: сілавыя структуры і кантралёры маюць рацыю. Гэта значыць, на прадпрыемстве сапраўды немала праблемных пытанняў, і вынікі праверак паказалі іх абгрунтаванасць. Разам з тым, на нарадзе стала відавочна, што сённяшняе кіраўніцтва завода гэтыя праблемы бачыць і разумее. Зыходзячы з гэтага, кіраўнік дзяржавы агучыў галоўнае патрабаванне і да праваахоўных органаў, і да кіраўніцтва завода — працаваць скаардынавана і сістэмна на карысць як самога завода і яго калектыву, так і на карысць усёй краіны.

## ■ Дзённік парламентарыя

# ІНТЭГРАЦЫЯ — ГЭТА ЎЗАЕМНАЕ ДАПАЎНЕННЕ, А НЕ ПАГЛЫНАННЕ

**Яўген АБАЛЕНСКІ, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па прамысловасці, паліўна-энергетычным комплексе, транспарце і сувязі:**



— У Сочы, на Другім форуме рэгіёнаў Расіі і Беларусі, я выступіў з дакладам аб гарманізацыі заканадаўства Саюзнай дзяржавы ў сферы прамысловай палітыкі. Пошук агульных падыходаў у прамысловай палітыцы Беларусі і Расіі быў галоўнай тэмай сочынскіх мерапрыемстваў. Вопыту супрацоўніцтва вядучых прадпрыемстваў двух краін былі прысвечаны і выстаўка прадукцыі, і тэматычныя дыскусіі. Акрамя таго, прайшлі шматлікія перагаворы кіраўнікоў суб'ектаў гаспадарання і органаў улады. Удзельнікі форуму вырашалі задачу не толькі нарасціць тавараабарот, але і паглыбіць вытворчую кааперацыю. Быў заключаны шэраг кантрактаў, падпісана каля 15 міжрэгіянальных пагадненняў. Таму форум, на маю думку, стаў чарговым фактарам глыбокага ўзаемапранікнення тавараў Беларусі і Расіі.

На долю Расійскай Федэрацыі летась прыпадала больш за 42% усяго экспарту тавараў з Беларусі і амаль 55% усяго імпарту. Больш за 60% беларускіх буйных і сярэдніх прадпрыемстваў ажыццяўляюць кааперацыю з расійскімі. Вядучымі ў эканамічным супрацоўніцтве з Беларуссю з'яўляюцца Цэнтральная, Прыволжская, Уральская, Паўночна-Заходняя федэральныя акругі, а таксама Масква і Санкт-Пецярбург. Разам з тым, беларусы цудоўна разумеюць, што неабходна не проста адстойваць, але ўвесь час пашыраць сваю нішу на расійскім рынку. Любому новаму кантракту папярэднічае вялікая работа па ўдасканаленні якасці прадукцыі і прасоўванні яе да патэнцыйнага спажыўца.

Мы павінны выпрацаваць агульныя правілы па прасоўванні тавараў, падтрымцы вытворцаў, каб беларуская прадукцыя на тэрыторыі Расіі і расійская на тэрыторыі Беларусі не лічылася замежнай. Гэтаму паслужыць адмысловая маркіроўка еўразійскіх тавараў, што досыць актыўна абмяркоўваецца апошнім часам. Але спачатку неабходна ліквідаваць бар'еры на шляху тавараў унутры як Саюзнай дзяржавы, так і Еўразійскага эканамічнага саюза.

Прыклад такіх бар'ераў — Пастанова Урада Расійскай Федэрацыі №1224 ад 24 снежня 2013 года. Яна абмяжоўвае допуск беларускай станкаінструментальнай прадукцыі для патрэб расійскай абароны. Яшчэ адзін — рэкамендацыя Фонду садзейнічання рэфармаванню ЖКГ Расіі выкарыстоўваць матэрыялы і абсталяванне толькі расійскай вытворчасці. Падобныя перашкоды для расійскіх вытворцаў існуюць і з беларускага боку. Стварэнне для беларускіх і расійскіх вытворцаў аднолькавых умоў дазволіла б нашым МАЗам у большай ступені ўдзельнічаць ва ўрадавых мерах Расіі па падтрымцы аб'ёмаў рэалізацыі аўтатэхнікі ў сітуацыі падзення рынку, тым больш што да 60% камплектуючых сучаснага аўтамабіля МАЗ вырабляецца на расійскіх прадпрыемствах.

Усё гэта сведчыць пра тое, што па факце прадукцыя Саюзных дзяржаў застаецца ў катэгорыі замежнай, і гэта супярэчыць базавым прынцыпам інтэграцыі. На форуме былі агучаны меры, якія павінны ліквідаваць гэтую праблему. На пленарным пасяджэнні прыняты праект адпаведнага рашэння. Сочынскі форум дапамог узгадніць бачанне розных бакоў, прыйсці да адной роўніцы, адштурхнуцца ад гэтага і далей весці больш плённы дыялог.

Прамысловая інтэграцыя павінна грунтавацца на ўзаемным дапаўненні, а не паглынанні або замяшчэнні. Прынцыпы роўных правоў, уліку нацыянальных інтарэсаў, узаемавыгаднасці, добрасумленнай канкурэнцыі, празрыстасці і выключэння дыскрымінацыі закладзены ў аснову прамысловай палітыкі і ў рамках Еўразійскага эканамічнага саюза. Мы павінны выпрацаваць агульныя падыходы ў адзінай прамысловай палітыцы з улікам інтарэсаў як Беларусі, так і Расійскай Федэрацыі. Каб нашы тавары не ўспрымаліся ў Расіі як замежныя і наадварот. І каб разам, з дапамогай кааперацыі, мы выраблялі прадукцыю, якая б карысталася попытам на тэрыторыі трэціх краін. Гэта магчыма, калі мы дасягнем згоды па найбольш важных рэчах.

Нездарма кіраўнік нашай дзяржавы ў Пасланні да беларускага народа і Нацыянальнага сходу ў красавіку бягучага года адзначаў, што «стварэнне сумеснай канкурэнтаздольнай прадукцыі за кошт аб'яднання прамысловага, фінансавага і маркетынгавага патэнцыялаў умацуе нашы пазіцыі на міжнародных рынках і дазволіць канкураваць з трэцімі краінамі».

Беларусь і Расія ў сваіх напрацоўках могуць паслужыць штуршком для ЕАЭС. Саюзная дзяржава можа тут задаваць і тэмп, і пэўную планку. У Расійскай Федэрацыі ўжо прыняты закон «Аб прамысловай палітыцы», мы толькі прыступаем да такога. Вельмі важна не толькі гарманізаваць заканадаўства двух краін, але і ўлічыць узаемадзеянне ўсіх членаў Еўразійскага эканамічнага саюза. Гэты арыенцір нельга выпускаць з-пад увагі.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**
*medvedeva@zviazda.by*

■

## ■ Выбары-2015

# «ЦЭНТРАЛЬНАЯ КАМІСІЯ ПРАЦУЕ ГАЛОСНА І АДКРЫТА»

**Місіі назіральнікаў ад СНД і БДІПЧ АБСЕ апублікавалі прамежкавыя справаздачы**

**У краіне створаны ўсе неабходныя прававыя і арганізацыйна-тэхнічныя ўмовы для міжнароднага назірання за выбарамі, што сведчыць пра адкрытасць і празрыстасць выбарчага працэсу. Пра гэта гаворыцца ў прамежкавай справаздачы місіі назіральнікаў ад Садружнасці Незалежных Дзяржаў. Тэкст справаздачы размешчаны на сайце Выканаўчага камітэта СНД.**

У справаздачы канстатуецца, што Цэнтрвыбаркам як орган, адказны за арганізацыю падрыхтоўкі і правядзення выбараў, «працуе галосна і адкрыта». «Яе пасяджэнні праходзяць з удзелам міжнародных назіральнікаў, прадстаўнікоў палітычных партый і іншых грамадскіх аб'яднанняў, прадстаўнікоў сродкаў масавай інфармацыі, — адзначаецца ў дакуменце. — Рашэнні прымаюцца на аснове калегіяльнасці, свабоднага і адкрытага абмеркавання. Скаргі і заявы, якія паступаюць у Цэнтральную камісію, разглядаюцца ў тэрміны, устаноўленыя кодэксам».

У справаздачы звяртаецца ўвага на тое, што «ініцыятыўныя групы паважалі закон і працавалі карэктна, улічваючы інтарэсы грамадзян і іншых ініцыятыўных груп». Місія адзначае: вылучэнне і рэгістрацыя кандыдатаў у Прэзідэнты, а таксама разгляд скаргаў і зваротаў праходзілі ў адпаведнасці з Выбарчым кодэксам.

«Агітацыйны перыяд пачаўся і праходзіць з выкананнем заканадаўства, кандыдатам у Прэзідэнты створаны роўныя ўмовы для прадстаўлення сваіх праграм і сустрэч з выбаршчыкамі», — заяўляецца ў справаздачы.

У сваю чаргу назіральнікі ад БДІПЧ АБСЕ даюць падрабязнае апісанне сістэмы выбарчых камісій у нашай краіне, а таксама самой выбарчай кампаніі. Дэталёва апісаны нормы беларускага заканадаўства аб выбарчых правах грамадзян. Доўгатэрміновая місія БДІПЧ канстатавала, што ЦВК зарэгістравала чатырох кандыдатаў, у тым ліку адну жанчыну. Пры гэтым адзначана, што адзін з прэтэндэнтаў у кандыдаты не быў зарэгістраваны, бо ў падпісных лістах адсутнічалі некаторыя даныя аб выбаршчыках альбо была «несумяшчальная інфармацыя». Верагодна, гаворка ідзе пра Віктара Цярэшчанку.

У справаздачы таксама адзначана, што сярод ключавых тэм, якія ўзнімаюцца ў ходзе агітацыйнай кампаніі, — пытанні рэгіянальнай бяспекі, падзеі на ўсходзе Украіны, эканамічная сітуацыя, магчымае стварэнне ў Беларусі расійскай базы ВПС. Назіральнікі таксама звярнулі ўвагу, што некаторыя лідары апазіцыі заклікаюць ігнараваць выбары.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

■

## ■ Творчая змена

# ЖУРНАЛІСТ — ПРАФЕСІЯ ДЗЯРЖАЎНАЯ

**Каб абмеркаваць надзённыя праблемы медыясупольнасці, падзяліцца творчымі напрацоўкамі і падыскутаваць па актуальных пытаннях, у Нацыянальным алімпійскім камітэце Беларусі сабралася звыш 150 прадстаўнікоў сродкаў масавай інфармацыі з розных рэгіёнаў краіны. Працягваўся IV форум маладых журналістаў «Агульны погляд у будучыню. Журналістыка: выбар маладых».**

— Прафесія журналіста — як ніякая іншая — дзяржаўная прафесія, — адкрыла другі дзень форуму **міністр інфармацыі Лілія АНАНІЧ**. — Кожны журналіст, які бярэцца за пяро, ужо становіцца датычным і па-свойму адказным за тое, як слова адзавецца. Каб сцвердзіцца ў прафесіі, трэба стаць прафесіяналам. А прафесіянал — той чалавек, які валодае не толькі неабходным наборам ведаў, але і мае выразную грамадзянскую пазіцыю.

Таксама міністр інфармацыі нагадала, што мы, журналісты, зараз працуем у перыяд важнай палітычнай кампаніі, якая адбываецца ў нашай краіне. «Сёння дзяржаўнымі сродкамі масавай інфармацыі створаны роўныя ўмовы для таго, каб перадвыбарныя праграмы кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь былі вядомы кожнаму грамадзяніну нашай краіны дзеля асэнсавання аддання голасу за тую ці іншую праграму, дзеля выяўлення кожным свайго ўсвядомленага выбару, — падкрэсліла Лілія Станіславаўна. — Праграмы кандыдатаў апублікаваны, у планавым рэжыме ідуць іх выступленні па тэлебачанні і радыёвяшчанні. І задача сродкаў масавай інфармацыі — не ўпусціць галоўнага, каб яшчэ раз нагадаць выбаршчыкам, грамадзянам краіны: трэба прыйсці на выбары, аддаць свой голас — голас за будучыню Беларусі».

На думку **старшыні Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі Генадзя ДАВЫДЗЬКІ**, малады журналіст павінен добра разумець, што ён, у першую чаргу, залежны ад свайго сумлення, таленту і ад любові да Радзімы.

— Гэтыя тры якасці прыводзяць да поспеху не толькі самога журналіста, а яшчэ і краіну, якой ён служыць, у якой нарадзіўся і дзеля якой варта жыць, — перакананы Генадзь Браніслававіч. — Малады журналіст вельмі выгадна адрозніваецца ад вопытнага. Апошні валодае бездакорным стылем, формай, ведае, як і што пісаць, можа гэта рабіць у розных жанрах і добра арыентуецца, якое выданне і што жадае ад яго атрымаць. Малады журналіст не валодае такімі навыкамі, але ў яго ёсць безумоўная перавага: ён валодае мовай, інфармацыяй і пратэстным настроем, якія характэрны для маладога асяроддзя. Але кожны малады чалавек, а асабліва той, які піша, павінен разумець цану слова і яго сілу.

Як заўважыў **першы сакратар Цэнтральнага камітэта Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі Андрэй БЕЛЯКОЎ**, не сакрэт, што ў апошнія гады прафесія журналіста мае асаблівы сэнс: «Тая інфармацыя, якую нясе журналіст, можа быць накіравана як на разбурэнне (і такіх прыкладаў вельмі шмат), так і на стварэнне. Прыклад беларускай журналістыкі і людзей, якія працуюць у гэтай сферы, даказвае і паказвае, як можна ствараць разам з народам, як трэба будаваць дзяржаву, прыносячы ёй карысць».

Гэтым якраз падчас форуму з маладымі журналістамі і падзяліліся акулы пяра і тэлерадыёэфіру, эксперты. У рамках тэматычных сесій «Палітычная журналістыка: аб'ектыўнасць і прапаганда», «Сацыялогія і СМІ» адбыўся цікавы дыялог пакаленняў, дзе кожны мог выказацца па тым ці іншым пытанні. Сапраўдныя дэбаты паміж моладдзю і карыфеямі беларускай журналістыкі разгарэліся падчас панэльнай дыскусіі «Журналістыка вачамі маладых».

Як лічыць карэспандэнт раённай газеты «Горацкі веснік» Кацярына Карпіцкая, форум маладых журналістаў — выдатная пляцоўка для зносін. «Вельмі прыемна ўсведамляць, што ты не адзін, — падзялілася журналістка. — Часта ты «варышся ў сваім соку» і думаеш, што, акрамя тваёй газеты, гэтыя пытанні больш нідзе не ўздымаюцца. І дзякуючы форуму, з'яўляецца ўнікальная магчымасць даведацца, што, магчыма, хтосьці іншы знайшоў рашэнне той праблемы, з якой ты не ведаеш, як справіцца. Абмяняўшыся вопытам, разумееш, што ёсць выйсце і шмат чаму яшчэ трэба вучыцца».

**Вераніка КАНЮТА.**
*kanyuta@zviazda.by*

■



Фота Надзеі БУЖАН.

**Добрай традыцыяй форуму стала ўручэнне маладым журналістам прэміі «Дэбют». Сярод лаўрэатаў — і карэспандэнт газеты «Звязда», аўтар гэтых радкоў Вераніка КАНЮТА, якая атрымала прэмію Беларускага саюза журналістаў як найлепшы рэпарцёр. Віншуем!**

# ВЫПРАБАВАННЕ ЯКАСЦЮ

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

Для экспертызы, дарэчы, улічваюцца пратаколы любых акрэдытаваных лабараторый у краіне: Дзяржстандарта, Мінсельгасхарча, Акадэміі навук. Імпарцёру, у якога на руках дакументы, выдадзеныя гэтымі ўстановамі, не трэба праводзіць дадатковыя даследаванні.

Сярод тавараў, што падпадаюць пад экспертызу, — рыбныя кансервы, каўбасы, напоі, макароны і крупы, прыправы, харчовыя дабаўкі. Здаваць на выпрабаванні неабходна таксама дзіцячае адзенне і цацкі, касметыку, мэблю, будаўнічыя матэрыялы. А вось прадукты з тэрмінам прыдатнасці да 30 дзён і адзенне, што было ў карыстанні, ад праверкі вызвалены.

— З ежай, якая хутка псуецца, зразумела. А чаму сэканд-хэнд не даследуюць? — пытаемся ў спецыялістаў.

— Усё такое адзенне праходзіць дэзапрацоўку і толькі пасля допускаецца ў рэалізацыю, — тлумачыць **загадчык аддзела нагляду і кантролю за гігіенічнай бяспекай тавараў Вольга БАБКО.** — Гэты механізм дзейнічае ўжо каля дзесяці гадоў. Таму дадатковы кантроль непатрэбны.



Фота Надзеі БУЖАН.

Урач-лабарант Ганна ЛЕУС рыхтуе дзіцячую машынку да выпрабаванняў.

Мы ідзём у хімічную лабараторыю. Тут у прадуктах харчавання шукаюць пестыцыды, кансерванты, забароненыя дабаўкі. Спецыялісты таксама правяраюць ежу на солі цяжкіх металаў, такіх як свінец, цынк, волава, кадмій, і іншыя таксічныя элементы. Праўда, самі прадукты ў гэтай лабараторыі вы не ўбачыце — адны прабіркі з празрыстай вадкасцю. Справа ў тым, што каўбаса ці макароны спальваюцца, попел разводзіцца ў вадзе і ў такім выглядзе ежа трапляе на хімічную экспертызу.

— Ёсць шэраг рэчываў, якія могуць прыводзіць да хранічнай інтаксікацыі, незаўважнай на першы погляд. Такі эфект аказваюць, напрыклад, солі цяжкіх металаў. Яны пакрысе назапашваюцца ў арганізме, а потым становяцца ферментнай атрутай, не спрыяюць пераносу кіслароду. Таму ў харчовых прадуктах (і яшчэ касметычных крэмах) нарміруецца ўтрыманне цяжкіх металаў, — каментуе **выканаўца абавязкаў намесніка галоўнага ўрача Вадзім ГУЛІН.**

У суседні кабінет на праверку прынеслі майку, а дакладней прабірку з выцяжкай. Па ёй з дапамогай спецыяльнага прыбора — храматографа — вызначаюць, колькі хімічных рэчываў выдзяляе адзенне ў паветра. Сярод непажаданых «мігрантаў» — фармальдэгід, стырол, пластыфікатары (надаюць матэрыялам эластычнасць), антыпірэны (павышаюць тэрмаўстойлівасць). Павышаная канцэнтрацыя гэтых рэчываў у паветры, якое ўдыхаем, не найлепшым чынам уплывае на здароўе чалавека.

## Небяспечныя кропельніцы

Каб паглядзець, як тэсціруюць касметыку і парфумерыю (санслужба прызнала іх адным з самых небяспечных імпартных тавараў), накіроўваемся ў таксікалагічную лабараторыю. Гэтыя даследаванні, дарэчы, самыя дарагія — кожнае можа каштаваць да двух мільёнаў рублёў. Наколькі крэмы і шампуні небяспечныя, правяраюць на клетках некаторых раслін, на курыных эмбрыёнах. Асобныя эксперыменты ставяць на жывёлах: у клетках віварыя сядзяць дзясяткі пацукоў, марскіх свінак і трусоў. Па тэрмінах выпрабаванні на жывёлах яшчэ і найбольш доўгія. Калі ўжо ўзялі ў эксперымент пацука, то неабходна пасля ўздзеяння на працягу пэўнага часу назіраць за ім, бо могуць развівацца адтэрмінаваныя таксікалагічныя эфекты.



На гэтай кухні вараць пажыўнае асяроддзе для мікраарганізмаў.

— А без жывёл ніяк нельга?

— Там, дзе магчыма, мы выкарыстоўваем альтэрнатыўныя мадэлі, — кажа Вадзім Вячаслававіч. — Але, каб ацаніць скурараздражняльнае ўздзеянне, неабходны выпрабаванні на млекакормячых. Зараз у многіх людзей назіраецца гіперадчувальнасць. Таму надзвычай важнае пытанне — адпаведнасць інфармацыі на ўпакоўцы. Тут дробязяў быць не можа. Калі штосьці не пазначылі, а ў чалавека праз гэты кампанент развілася алергія, гэта ўжо справа падсудная.

Жывёл выкарыстоўваюць яшчэ і для таго, каб праверыць, ці не выклікае прадукцыя (не толькі касметыка, але і, напрыклад, медыцынскія прэпараты і інструменты) павышэння тэмпературы. Спецыялісты ўзгадваюць, як нядаўна ў адной з бальніц пацыенты, якім ставілі кропельніцы, пачалі скардзіцца на тэмпературу. Аказалася, што партыя тых кропельніц, завезеных з Індыі, не праходзіла выпрабаванні. Звярніся імпарцёр у лабараторыю, прылады не трапілі б у бальніцы: у труса, на якім пасля тэсціравалі небяспечны тавар, адразу падскочыла тэмпература.

## У пошуках жывых арганізмаў

І зноў да харчовых прадуктаў. Яшчэ адзін паказчык, па якім тэсціруюць ежу, — мікрабіялагічны. Эксперты даследуюць, ці няма ў імпартных прысмаках залацістага стафілакока, кішэчнай палачкі і астатніх арганізмаў, што могуць выклікаць харчовае атручванне. Так, у сухафруктах шукаюць цвіль, у каўбасе і малацэ — сальманэлы. **Ала МАРЭЙКА, урач-бактэрыёлаг**, называе сваю лабараторыю вялікай кухняй. Сапраўды, падобна. Халадзільнік, набіты смятанай, тварагом і сасіскамі (усё для выпрабаванняў), пліта з каструлямі, у якіх вараць пажыўнае асяроддзе. Гэтае асяроддзе, для кожнага прадукту сваё, разліваецца па флаконах. Туды змяшчаюць дробныя кавалачкі ядомых тавараў і адпраўляюць у тэрмастат. Свежыя прадукты — на 5-6 дзён, кансерваваныя — на 11. За гэты час усё жывое, што ёсць у прысмаках, павінна сябе праявіць. Да апрацоўкі выкарыстанага посуду ставяцца вельмі ўважліва, бо ўсе кубкі, на якіх выраслі арганізмы, лічацца патэнцыйна небяспечнымі.

Пастаўшчыку выпрабаванні харчовых прадуктаў абыдуцца найтанней — каля 500 тысяч за адно найменне. Сума быццам бы невялікая, але ў сецыве былі меркаванні, што ўвядзенне экспертызы прымусіць імпарцёраў павысіць кошты. Замежныя тавары сапраўды ў хуткім часе падаражэюць?

— Думаю, экспертыза — не настолькі істотная затрата, як гэта жадаюць некаторыя прадставіць, — выказваецца Вадзім Вячаслававіч. — Не можа яе кошт у разы адбіцца на тавары. Падлічыце: 150-300 тысяч за экспертызу плюс 500 тысяч за выпрабаванні пры тым, што адна фура прадуктаў ацэньваецца ў 15-20 тысяч долараў. Справа, хутчэй, у гандлёвай нацэнцы. Тым больш, асноўная частка экспертыз — разгляд раней праведзеных работ па ацэнках адпаведнасці. Часцей гэта і заканчваецца прызнаннем тых пратаколаў.

Так і ёсць: усе 400 заключэнняў, атрыманыя імпарцёрамі з 27 верасня, выдадзены згодна з гатовымі пратаколамі выпрабаванняў. Пастаўшчыкі праводзілі даследаванні раней, у рамках сертыфікацыі і дэкларавання, таму спецыяльна для экспертызы тэсціраваць нічога не даявлялася. За тры тыдні, што дзейнічае пастанова №666, была толькі адна адмова — з прычыны няпоўнага пакета дакументаў. Аднак у санслужбе папярэджваюць: лічбы неадпаведнасці пойдуць потым, калі ў лабараторыі хлынуць астатнія імпарцёры. І некаторыя з іх загадзя ведаюць, што выпрабаванне якасцю не вытрымаюць. Днямі Міністэрства аховы здароўя расказала, што асобныя пастаўшчыкі дзіцячых бразготак, разумеючы, што іх тавар не адпавядае стандартам, спрабавалі замаскіраваць свой недагляд. Свядома завышалі ўзроставае прызначэнне цацак. Але навошта малому, старэйшаму за тры гады, бразготка? Выпадак не адзінкавы. У санслужбе прыводзяць прыклады, калі імпарцёры посуду, якія пяць гадоў працуюць на рынку, за ўвесь час так і не аднеслі тавар у лабараторыю. Спадзяюцца на добрасумленнасць вытворцы. Аднак у пытаннях небяспекі наўрад ці варта верыць на слова.



«Тэсціроўшчыкі» крэмаў і шампуняў.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by*

## «ЖЭНЬМІНЬ ЖЫБАА»: ЯДНАННЕ ПРАСТОРЫ І ЧАСУ

**У Пекіне вядучыя СМІ Беларусі — газеты «СБ. Беларусь сегодня», «Звязда» і БЕЛТА — падпісалі мемарандумы аб узаемаразуменні і супрацоўніцтве з рэдакцыяй газеты «Жэньмінь жыбаа».**

— Удзельнічаючы ў міжнародным інфармацыйным форуме «Адзін пояс, адзін шлях», — распавядае **дырэктар — галоўны рэдактар Выдавецкага дома «Звязда» Алесь КАРЛЮКЕВІЧ**, — мы пазнаёміліся з інфармацыйнымі механізмамі, яшчэ больш выразна ўсвядомілі іх «кітайскі складнік» у прапагандзе эканамічнага пояса «Вялікага шаўковага шляху». «Жэньмінь жыбаа», нягледзячы на свой велізарны наклад, шукае надзейных партнёраў у распаўсюджванні кампетэнтнай інфармацыі аб кітайскіх ініцыятывах па будаўніцтве міралюбівай эканамічнай супольнасці.

У форуме прынялі ўдзел больш за 150 кіраўнікоў і вядучых журналістаў СМІ з 60 краін свету.

Дзеянне дамовы, падпісанай «Жэньмінь жыбаа» са «Звяздой», як і з іншымі беларускімі СМІ, разлічана на тры гады. Але, несумненна, сам дакумент — толькі пачатак рэалізацыі многіх двухбаковых беларуска-кітайскіх інфармацыйных ініцыятыў. І ў першую чаргу — у галіне абмену як навінамі, так і аналітычнымі матэрыяламі з дапамогай інтэрнэту і сацыяльных сетак.

**Кастусь ЛАДУЦЬКА,**
*г. Пекін, Кітай.*

■ Вось дык шчаслівчык!

## ЁСЦЬ МІЛЬЁННЫ ПАСАЖЫР

**Беларуская чыгунка вызначыла мільённага інтэрнэт-пасажыра 2015 года.**

У выніку маніторынгу, які магістраль праводзіла з пачатку года, устаноўлены продаж мільённага электроннага праязнога дакумента на сайце сістэмы продажу праязных дакументаў poezd.rw.by. Білет быў набыты 16 верасня. Мільённы інтэрнэт-пасажыр здзейсніць паездку 24 верасня поездам №83 па маршруце Гомель — Магілёў. Перад адпраўленнем поезда на вакзале станцыі Гомель мільённаму пасажыру будзе ўручаны сертыфікат, які пацвярджае яго статус, і падарунак ад Беларускай чыгункі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

■ Запрашальнік

## ЗАХАПІЦЕ ЖМЕНЬКУ ЗБОЖЖА ДЛЯ «БАГАЧА»

**Трэці раз Студэнцкае этнаграфічнае таварыства і Дзяржаўны літаратурны музей Янкі Купалы ладзяць у Вязынцы «Багач». Сёлета свята адбудзецца 27 верасня, у адзін дзень з Узвіжаннем.**

У народным календары «Багач» прымеркаваны да заканчэння збору ўраджаю («к гэтаму часу ў кожнага ўсяго багата») і першаму запальванню хатняй васковай свечкі у лубцы з жытам, якую ставяць на покуць і захоўваюць там на працягу ўсяго года, што прыносіць у дом багацце і шчасце. Абрад скіраваны на захаванне дабрабыту, ураджайнасці, плоднасці жывёлы, сямейнага ладу. Асноўнай дзеяй свята з'яўляецца ссыпанне агульнага «Багача», таму арганізатары просяць усіх гасцей захапіць з сабой па жменьцы зярнят.

Сёлета на свяце праспяваюць урачыстыя дажынкавыя песні гурты «Рутвіца», «Мярэжа», «Горынь», «Дайнава» і «Варган», а танцавальную вечарынку зладзяць музыкі і танцоры клуба традыцыйнага танца «Сіта». Апроч таго, будзе працаваць дзіцячая пляцоўка, а для дарослых запланаваны тэматычныя лекцыі і майстар-класы. Як заўжды, будзе дзейнічаць традыцыйная кухня і кірмаш.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

# НА РЫНКУ ПАВІННА БЫЦЬ ТОЛЬКІ ПРАВЕРАНАЯ ПРАДУКЦЫЯ

**Дзяржстандартам сёлета толькі з 1 чэрвеня забаронена рэалізацыя прадукцыі, якая не адпавядае патрабаванням, на суму каля 12 млрд рублёў.**

Як адзначыў **намеснік старшыні Дзяржстандарта Сяргей ІЎЛЕЎ**, з уступленнем у сілу ў пачатку лета Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь №48 «Аб мерах па забеспячэнні дзяржаўнага кантролю (нагляду) за выкананнем патрабаванняў тэхнічных рэгламентаў» паўнамоцтвы наглядных органаў пашырыліся.

— Мы цяпер маем права забараняць увоз небяспечнай прадукцыі на тэрыторыю нашай краіны, выдаваць загады аб выманні з абарачэння ўсяго тавару, які не адпавядае абавязковым патрабаванням, а таксама прымаць меры па спыненні дзеяння дакументаў аб ацэнцы адпаведнасці на тэрыторыі Беларусі на такую прадукцыю, — сказаў Сяргей Іўлеў. — Гэта вельмі сур'ёзныя меры, якімі мы сёння карыстаемся.

Указам вызначаны дзяржаўныя органы, упаўнаважаныя ажыццяўляць кантроль (нагляд) за забеспячэннем адпаведнасці прадукцыі на рынку краіны патрабаванням тэхнічных рэгламентаў Мытнага саюза. Гэта Дзяржстандарт, Міністэрства аховы здароўя, Мінсельгасхарч, Мінгандаль, МНС. Паміж імі размежаваны сферы кантролю (нагляду).

Інфармаванне ў СМІ, інтэрнэце аб парушэннях, выяўленых інспектарамі падчас наглядных мерапрыемстваў, на думку Сяргея Іўлева, таксама з'яўляецца эфектыўным метадам: «На гэтых прыкладах іншыя пастаўшчыкі задумаюцца, ці варта везці такую прадукцыю ў нашу краіну».

На сайце Дзяржстандарта ў раздзеле «Дзяржаўны нагляд/Актуальная інфармацыя» можна азнаёміцца з Рэестрам небяспечнай прадукцыі, забароненай да ўвозу і (або) абарачэння на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, а таксама Рэестрам дакументаў аб пацвярджэнні адпаведнасці прадукцыі патрабаванням тэхнічных рэгламентаў Мытнага саюза (Еўразійскага эканамічнага саюза), дзеянне якіх спынена на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь.

Дзяржстандарт прымае і будзе прымаць меры, у тым ліку прадугледжаныя ўказам, каб на рынку краіны прысутнічала якасная, бяспечная прадукцыя, а вытворцы, імпарцёры, прадаўцы адказна ставіліся да той прадукцыі, якую яны прапаноўваюць спажыўцам.

**Дар'я ШОЦІК.**

## ПЕРАДВЫБАРНАЯ ПРАГРАМА КАНДЫДАТА Ў ПРЭЗІДЭНТЫ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ ТАЦЦЯНЫ КАРАТКЕВІЧ

# «ЗА МІРНЫЯ ПЕРАМЕНЫ»

*Прэзідэнт павінен накіраваць сваю дзейнасць на стварэнне ўмоў для павышэння ўзроўню і якасці жыцця грамадзян Беларусі. Гэта можа быць зроблена толькі на аснове эфектыўнай эканомікі. Пазітыўныя перамены немагчымыя без правядзення глыбокіх палітычных рэформаў.*



### САЦЫЯЛЬНАЯ ПАЛІТЫКА: КЛОПАТ ПРА ЛЮДЗЕЙ І САЦЫЯЛЬНАЯ СПРАВЯДЛІВАСЦЬ

Галоўным прынцыпам сацыяльнай палітыкі павінен стаць **прынцып роўных магчымасцяў**, заснаваны на сацыяльнай салідарнасці моцных і слабых.

У сацыяльнай сферы неабходна вярнуцца да ўжо задэклараваных у Канстытуцыі **гарантый** і ажыццявіць шэраг **рэформаў**:

**Медыцына** — забяспечыць доступ усіх грамадзян да бясплатнага якаснага медыцынскага абслугоўвання ў дзяржаўных медыцынскіх установах пры паралельным развіцці сістэмы страхавой і прыватнай медыцыны.

**Адукацыя** — павялічыць інвестыцыі ў адукацыю, якія накіраваць на павелічэнне заробкаў выкладчыкаў і абнаўленне матэрыяльна-тэхнічнай базы школ і ўніверсітэтаў. Забяспечыць пераемнасць розных узроўняў адукацыі, звязаць іх з рынкам працы. Павысіць сацыяльны статус выкладчыкаў. Вызваліць настаўнікаў ад лішняй адміністрацыйнай і ідэалагічнай нагрузкі. Развіваць дыстанцыйную вышэйшую адукацыю. Размеркаванне павінна быць па жаданні. Адмяніць плату за навучанне ў дзяржаўных навучальных установах з той прычыны, што такая плата супярэчыць Канстытуцыі.

**Пенсійнае забеспячэнне** — правесці пенсійную рэформу без павышэння пенсійнага ўзросту. Распрацаваць сістэму накапляльных пенсій, дадатковага пенсійнага страхавання, развіваць прыватныя пенсійныя фонды разам з дзяржаўнымі.

**Адрасная дапамога** — распрацаваць эфектыўную сістэму адрасных грашовых выплат: шматдзетным сем'ям, беспрацоўным, грамадзянам з абмежаванымі магчымасцямі; у тым ліку на праезд у грамадскім транспарце і камунальныя плацяжы. Пашырыць удзел грамадскіх арганізацый у ажыццяўленні сацыяльнай дапамогі насельніцтву праз дзяржаўны заказ.

**Рэформа працоўных узаемаадносін** — перагледзець кантрактную сістэму найму на працу, адмяніць паборы дзяржавы з грамадзян, якія страцілі працу ў выніку эканамічнага крызісу. Аказаць дапамогу ў набыцці новай спецыяльнасці і ў адкрыцці ўласнай справы.

**Пераадоленне наступстваў чарнобыльскай катастрофы** — аднавіць «чарнобыльскія праграмы» ў поўным аб'ёме. Стварыць эфектыўную сістэму медыцынскага абследавання пацярпелага насельніцтва з ужываннем сучасных метадаў і абсталявання.

**Дапамога сем'ям** — аказваць падтрымку сем'ям, садзейнічаць прадпрымальніцкай дзейнасці сем'яў. Падтрымаць будаўніцтва жылля ў рэгіёнах для маладых сем'яў і маладых спецыялістаў, у першую чаргу — індывідуальных жылых дамоў на ўласным зямельным участку.

**Партнёрства дзяржавы і бізнесу** — распрацаваць сістэму падтрымкі сацыяльна адказнага бізнесу, стымуляваць інвестыцыі працадаўцаў ў сістэму сацыяльнай абароны работнікаў свайго прадпрыемства. Увесці падатковыя льготы за спонсарскую падтрымку сацыяльных праектаў.

### ЭКАНАМІЧНАЕ АБНАЎЛЕННЕ: РАЗВІЦЦЁ ДЗЕЛАВОЙ ІНІЦЫЯТЫВЫ І ПРЫЦЯГНЕННЕ ІНВЕСТЫЦЫЙ

*Асновай павышэння ўзроўню і якасці жыцця грамадзян можа стаць толькі эфектыўная эканоміка, якая развіваецца на аснове прынцыпаў і падыходаў, ужо рэалізаваных у паспяховых краінах.*

**Дзяржаўныя фінансы** — забяспечыць незалежнасць Нацыянальнага банка, дамагчыся стабільнасці валюты і абароны ўкладаў, утаймаваць рост цэн, зрабіць даступнымі банкаўскія крэдыты, спыніць растрату дзяржаўных сродкаў па запытах галіновых лабістаў.

**Прыцягненне інвестыцый і развіццё біснес-асяроддзя** — забяспечыць стабільнасць, празрыстасць сістэмы падаткаабкладання, пашырыць прымяненне спрошчанага падаткаабкладання. Прыняць Інвестыцыйны кодэкс. Адмяніць канфіскацыйныя меры ў дачыненні да бізнесу. Выключыць паняцце «незаконнае прадпрымальніцтва», правесці дэкрыміналізацыю эканамічных злачынстваў.

**Мадэрнізацыя заводаў і прадпрыемстваў** — стварыць антыкрызісныя праграмы для праблемных заводаў, прыцягнуць пад іх інвестыцыі. Прыватызаваць нежыццяздольныя прадпрыемствы. Гарантаваць тым, хто трапіў пад скарачэнне, атрыманне новай прафесіі, забеспячэнне льготным крэдытам для адкрыцця сваёй справы або сацыяльнай падтрымкай у памеры 75% ад заробку на працягу 6 месяцаў.

**Больш свабоды і ініцыятывы** — падтрымліваць ініцыятыву кіраўніцтва заводаў і прадпрыемстваў. Забраць у чыноўнікаў правы ўказваць, што і колькі вырабляць.

**Развіццё інавацыйных сектараў эканомікі** — стварыць асяроддзе для развіцця канкурэнтаздольных галін — інфармацыйных тэхналогій, экалагічнага турызму, транзіту і лагістыкі, ваенна-прамысловага комплексу, альтэрнатыўнай энергетыкі, інжынірынгу, банкаўскіх паслуг.

**Развіццё канкурэнцыі** — забяспечыць роўную канкурэнцыю прадпрыемстваў усіх формаў уласнасці, што выкліча зніжэнне коштаў на тавары і паслугі.

**Стварэнне працоўных месцаў, стымуляванне самазанятасці** — прыцягваць інвестыцыі і стымуляваць развіццё нацыянальнага бізнесу, якія будуць ствараць новыя працоўныя месцы.

**Развіццё энергетычнага сектара** — укараніць энергазберагальныя тэхналогіі і развіваць выкарыстанне аднаўляльных крыніц энергіі. Ажыццявіць мадэрнізацыю існуючых энергетычных магутнасцяў. Правесці рэвізію рашэння па АЭС аб неабходнасці яе будаўніцтва.

**Сельская гаспадарка** — рэфармаваць на аснове шматукладнасці, свабоднага развіцця ўсіх формаў уласнасці і стварэння рынку зямлі, падтрымаць развіццё фермерскіх гаспадарак.

**Развіццё навукі** — аднавіць страчаныя пазіцыі праз стымуляванне ўключэння ў сусветную навуковую кааперацыю і аказанне мэтавай дзяржаўнай падтрымкі эфектыўным распрацоўкам, прыцягнуць да падтрымкі даследаванняў зацікаўленыя прыватныя структуры.

**Свабодны фінансавы рынак** — выпусціць у свабоднае абарачэнне акцыі. Стварыць новыя магчымасці зберажэнняў, крэдытавання, інвестыцый для грамадзян і прадпрыемстваў, садзейнічаць зніжэнню крэдытнай працэнтнай стаўкі.

**Развіццё малых і сярэдніх гарадоў** — стымуляваць стварэнне новых заводаў і прадпрыемстваў у рэгіёнах. Павышэнне ўзроўню даходаў і развіццё іпатэкі павінны дазволіць сем'ям набываць уласнае жыллё ў сярэднім за пяць-шэсць гадоў.

### СУЧАСНАЯ І ЭФЕКТЫЎНАЯ ДЗЯРЖАВА

*Закон стане падмуркам беларускай дзяржавы. Роўнасць усіх перад законам і падзел уладаў зробіць Беларусь багатай і стабільнай краінай.*

**Канстытуцыйная рэформа** — Беларусь павінна быць парламенцка-прэзідэнцкай рэспублікай. Адна і тая ж асоба не павінна займаць пасаду Прэзідэнта больш за два тэрміны. Скараціць паўнамоцтвы Прэзідэнта, якія перашкаджаюць функцыянаванню асобных галін улады і эфектыўнай працы дзяржавы.

**Рэформа сістэмы мясцовага самакіравання** — падпісаць Еўрапейскую хартыю мясцовага самакіравання. Увесці прамыя выбары мясцовых кіраўнікоў і зрабіць іх залежнымі ад грамадзян, а не ад чыноўнікаў з Цэнтра.

**Незалежнасць судовай улады** — забяспечыць незалежнасць судоў, выкараніць «тэлефоннае права».

**Эфектыўны дзяржапарат** — аптымізаваць колькасць чыноўнікаў, павысіўшы зарплаты. Адкрыты конкурс стане адзінай формай найму на дзяржаўныя пасады. Усе чыноўнікі на працягу 5 гадоў пройдуць стажыроўкі за мяжой для вывучэння найлепшых практык.

**Электронны ўрад** — публікаваць у інтэрнэце бюджэты ўсіх узроўняў, зарплаты службоўцаў, рашэнні судоў, інфармацыю аб тэндарах, конкурсах на дзяржаўныя пасады. Пазбавіць грамадзян ад бясконцых даведак, пячатак, ліцэнзій. У новай Беларусі прадпрымальнікі змогуць рэгістраваць бізнес праз інтэрнэт, кожны грамадзянін будзе атрымліваць пашпарт і іншыя дакументы за 15 хвілін.

**Грамадзянская супольнасць** — стварыць спрыяльныя ўмовы для развіцця некамерцыйных арганізацый, забяспечыць роўны доступ да дзяржаўнага фінансавання праз удзел у тэндарах і конкурсах нароўні з дзяржаўнымі.

### ЗНЕШНЯЯ ПАЛІТЫКА. МІРНАЯ БЕЛАРУСЬ: АДКАЗНАЕ СУСЕДСТВА І НЕЙТРАЛІТЭТ

*Беларусь павінна будаваць раўнапраўныя і ўзаемавыгадныя адносіны як са сваімі суседзямі, так і з астатнімі краінамі свету. Знешняя палітыка павінна грунтавацца на нацыянальных інтарэсах і садзейнічаць міру і бяспецы ў нашым рэгіёне.*

**Сапраўдны нейтралітэт** — на самай справе рэалізаваць шматвектарную знешнюю палітыку. Вывесці з краіны замежныя ваенныя базы і аб'екты. Беларусь не будзе ўваходзіць ні ў якія ваенныя блокі, якія могуць уцягнуць яе ва ўзброены канфлікт.

**Адказнае суседства** — выбудоўваць добрыя і ўзаемавыгадныя адносіны як з Захадам, так і з Усходам, няўхільна выконваючы ўзятыя на сябе міжнародныя абавязацельствы і патрабуючы гэтага ад нашых партнёраў. Заключыць з Еўрасаюзам дамову аб супрацоўніцтве і партнёрстве. Дамагчыся бязвізавага рэжыму з большасцю краін свету.

**Рэгіянальная бяспека** — садзейнічаць міру і бяспецы ў рэгіёне. Умацоўваць і мадэрнізаваць нашы Узброеныя Сілы.

**Развіццё знешніх эканамічных стасункаў** — уступіць у Сусветную гандлёвую арганізацыю, вярнуцца ў рэжым абагульненых прэферэнцый з ЕС, каб забяспечыць бесперашкодную рэалізацыю нашай прадукцыі. Выбудаваць гандлёвы шлях не толькі паміж Усходам і Захадам, але і ад «мора да мора» — паміж поўначчу і поўднем.

### АДРАДЖЭННЕ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ КУЛЬТУРЫ — АСНОВА БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ

*Беларусь не стане стабільнай дзяржавай, калі не будзе грунтавацца на гістарычных і культурных традыцыях беларускага народа. Улада будзе адраджаць беларускую культуру і ўмацоўваць нацыянальную самасвядомасць як аснову беларускай дзяржаўнасці і нацыянальнай бяспекі.*

**Прыярытэтная падтрымка сферы культуры** — устанавіць падатковыя льготы і ствараць умовы для свабоднай рэалізацыі ініцыятыў грамадзянскай супольнасці і бізнесу, накіраваных на развіццё беларускай культуры, мовы і нацыянальных каштоўнасцяў.

**Падтрымка беларускай мовы** — прыняць Закон аб дзяржаўнай падтрымцы беларускай мовы, адкрыць Нацыянальны ўніверсітэт, а ў кожным райцэнтры — школу альбо гімназію з выкладаннем усіх прадметаў на беларускай мове. Чыноўнік, дэпутат або кіраўнік дзяржавы абавязаны валодаць дзвюма дзяржаўнымі мовамі.

**Свабода слова і друку** — зняць існуючыя бар'еры для стварэння свабоднай дзейнасці СМІ і журналістаў.

**Свабода веравызнання і павага да асобы** — забяспечыць раўнапраўе для ўсіх канфесій і нацыянальна-культурных меншасцяў.

Поўны тэкст праграмы чытайце на *www.karatkevich.by*. Калі вы падтрымліваеце мірныя перамены, галасуйце за Таццяну Караткевіч і пералічвайце грошы для правядзення агітацыі на рахунак:

КАРАТКЕВІЧ ТАЦЦЯНА МІКАЛАЕЎНА
№ 3014555500230
УНП 100633430 ААТ «Беларусбанк», Філіял №510, код банка 603

■ Супрацоўніцтва

# ВОПЫТ ДЛЯ ПРАКТЫЧНАГА ПРЫМЯНЕННЯ

## Беларусы дзеляцца навацыямі ў сферы маладзёжнай палітыкі

**У Мінску прынялі чарговы семінар у межах праекта «Праграма падтрымкі маладзёжнай палітыкі рэгіёна «Усходняга партнёрства». Ён прысвечаны ўнікальнаму беларускаму вопыту — падрыхтоўцы спецыялістаў па рабоце з моладдзю. Каб болей даведацца пра яго, у Мінск завіталі прадстаўнікі ад краін — партнёраў Беларусі па праграме «Усходняе партнёрства» — Азербайджана, Арменіі, Грузіі, Малдовы і Украіны.**

«Беларусь прэзентуе свой нацыянальны вопыт работы з моладдзю для краін «Усходняга партнёрства» і для еўрапейскіх экспертаў», — гаворыць **намеснік міністра адукацыі Беларусі Віктар ЯКЖЫК** і дадае, што гэта даволі ганаровая і адказная місія. «Семінар невыпадкова праходзіць у нас. Быў варыянт правядзення ў любой з краін «Усходняга партнёрства», але кіраўніцтва праекта аддала перавагу нашай», — кажа Віктар Віктаравіч. На яго думку, дасягненні Беларусі значныя не толькі ў сферы падрыхтоўкі спецыялістаў, але і ўвогуле ў сферы працы з моладдзю.

— Сутнасць праекта якраз у вывучэнні вопыту работы органаў дзяржаўнага кіравання з моладдзю ў розных краінах, — распавядае намеснік міністра адукацыі. — Нашы госці атрымалі магчымасць паўдзельнічаць у навучальным семінары. На ім прапаноўваюцца канкрэтныя методыкі, якія можна скарыстаць у далейшым.

Па словах Віктара Якжыка, дыпламаваныя спецыялісты па рабоце з моладдзю з'явіліся ў Рэспубліцы Беларусь 5 гадоў таму. А сёння ужо на 65 прадпрыемствах уведзена поўная стаўка на пасаду «спецыяліст па рабоце з моладдзю», і праграма перападрыхтоўкі карыстаецца попытам сярод працадаўцаў.

«У цэнтры ўвагі нашага семінара — пытанні стварэння сістэмы навучання супрацоўнікаў у сферы работы з моладдзю», — кажа **Ханс-Юрген МЭТ, каардынатар праекта «Праграма падтрымкі маладзёжнай палітыкі рэгіёна «Усходняга партнёрства» з боку Еўрасаюза**. На яго думку, у некаторых краінах «Партнёрства» існуюць вялікія адрозненні ў гэтай сферы. А дадзены семінар праводзіцца для таго, каб узбагаціць вопыт краін — удзельніц праекта: «Удзельнікі атрымаюць тут не толькі тэарэтычныя асновы, але змогуць пабачыць і практычнае прымяненне ў гэтай сферы».

На думку прадстаўніка Еўрасаюза, наша краіна мае канкрэтную навацыю: «У Рэспубліцы Беларусь існуе прызнаная прафесія — спецыяліст у сферы работы з моладдзю. Таму, безумоўна, нам вельмі важна пазнаёміцца з досведам у стварэнні структур па навучанні такіх спецыялістаў, як і дзе яны працуюць, якія тэарэтычныя веды атрымалі, якія практычныя выгады ёсць для дзяржавы і, зразумела ж, для моладзі». Ханс-Юрген Мэт лічыць, што атрыманыя веды дадуць нашым партнёрам з іншых краін «Усходняга партнёрства» «імпульс таксама займацца гэтымі пытаннямі».

**Вераніка ПУСТАВІТ.**
*pustavit@zviazda.by*

# ЧЫРВОНКА
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

24 ВЕРАСНЯ 2015 г.
ЧАЦВЕР
№ 19 (15778)

Выдаецца
з 21 красавіка 1921 года


Імёны

Ян МАЕРС:

## «Не думаю, як прадаць сябе...»



**На сцэне прафесіянал, а ў жыцці — просты і шчыры чалавек. Саліст гурта Misters, мне здаецца, менавіта з такіх. Ён вучыўся і вучыцца ў самых лепшых (напрыклад, у Васіля Раінчыка, пад кіраўніцтвам якога быў у ансамблі «Верасы»), умее пралічваць свае крокі (удзел у праектах «Містар Беларусь» і «Хачу да Меладзэ» таму пацвярджэнне), не баіцца быць сапраўдным ні на сцэне, ні за яе межамі. І можа быць розным, спалучаючы ў сабе і творцу, і кіраўніка. Як складваюцца яго адносіны з калегамі, якіх ілюзій ён назаўсёды пазбавіўся і чаму імкнецца ўсё трымаць пад кантролем? Аб гэтым спявак расказаў карэспандэнту «Чырвонкі».**

***— Нядаўна вы з Кацяй Волкавай парадавалі прыхільнікаў песняй «Мы станем бліжэй». Як узнікла ідэя папрацаваць разам?***

— Першы раз пра Кацю я даведаўся, калі ішло шоу «Хачу ў ВІА Гру», дзе яна ўдзельнічала. На Тыдні беларускай моды мы з ёй былі ў адным паказе. Яшчэ перасякаліся на здымках розных праектаў тэлеканала АНТ і так паступова пасябравалі. Першай нашай сумеснай працай стаў запіс навагодняга трэка. Потым Каця вырашыла падарыць гурту Misters песню ўласнага аўтарства. Я, паглядзеўшы матэрыял, зразумеў, што можа атрымацца выдатны дуэт. Мы дапрацавалі з ёй музыку, і ў выніку атрымалася класічная лірычная кампазіцыя.

***— Што натхніла вас на думку зняць кліп?***

— Студыя ў мяне знаходзіцца дома, таму часта важныя падзеі адбываюцца за кубачкам кавы на кухні. Неяк Каця прыйшла ў госці і мы пачалі разважаць пра кліп. Мы з жонкай тады былі пад уражаннем ад прагляду «Абацтва Даўнтан», дзе прыгожыя касцюмы, дэкарацыі, таму вырашылі зняць нешта ў такой стылістыцы. Падзяліліся думкай з рэжысёрам Ільём Шапірам, і ён адразу знайшоў натуру для здымкаў. Праводзілі іх у двух месцах: у Гродне, у Каралінскім фальварку Тызенгаўза каля вадасховішча Юбілейнае, і ў сядзібе Чацвярцінскіх у вёсцы Жалудок... З Кацяй працаваць было весела, але месцамі складана, нават сварыліся на здымачнай пляцоўцы. Паколькі мы дзве яркія творчыя асобы, то кожны адстойваў свае ідэі. Але ў спрэчцы нарадзілася тое, што цяпер гледачы могуць убачыць на экране.

***— Калі гаварыць наогул пра вашы ўзаемаадносіны ў артыстычным асяродку, то якія яны?***

— Ніколі нікому не набіваюся ў сябры. Хоць упэўнены, што сяброўства паміж артыстамі магчымае. Наш асяродак — канкурэнтная сфера, і мы, творчыя людзі, вельмі ранімыя. Таму, можа, і не проста знайсці сяброў сярод калег. Але я імкнуся з усімі падтрымліваць добрыя стасункі. Заўсёды радуюся, назіраючы за чужым поспехам. Я прытрымліваюся думкі, што ў кожнага выканаўцы знойдзецца свой слухач, калі правільна працаваць.

*(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)*

Тэхналогіі з «разынačкай»

## Чым больш крэатыву, тым лепш

Беларускія ВНУ ўкараняюць міждысцыплінарную падрыхтоўку спецыялістаў




Фота Надзеі БУЖАН.

**Супрацьстаянне фізікаў і лірыкаў для XXI стагоддзя ўжо неактуальнае. І шанцаў працаўладкавацца ў IT-кампанію з сусветным іменем у праграміста з інжынернай адукацыяй значна менш, чым у праграміста, які мае веды яшчэ і ў сумежных галінах: псіхалогіі, сацыялогіі, менеджменце, мастацтве і гэтак далей. Скажам, у Оксфардскім універсітэце можна выбраць праграму, якая спалучае камп'ютарныя тэхналогіі і філасофію. А ў Томскім дзяржаўным універсітэце (Расія) магістраў рыхтуюць па спецыяльнасці «Гуманітарная інфарматыка»...**

**Міждысцыплінарная падрыхтоўка спецыялістаў у вышэйшай школе стала тэмай міжнароднага семінара, які прайшоў у рамках праграмы Erasmus+ з прыцягненнем міжнародных экспертаў Еўрапейскай асацыяцыі ўніверсітэтаў. Мэтай было знаёмства з найлепшымі практыкамі, якія існуюць ва ўніверсітэтах краін — удзельніц Балонскага працэсу.**

### Адукацыя праз усё жыццё

За апошнія тры гады паказчыкі акадэмічнай мабільнасці студэнтаў, аспірантаў, выкладчыкаў і вучоных ВНУ выраслі ў Беларусі больш чым удвая. Выклікі новага часу ў многім звязаны з масавасцю вышэйшай адукацыі, таму неабходна распрацоўка новых механізмаў забеспячэння якасці падрыхтоўкі ў вышэйшай школе.

*(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)*

Адраджэнне традыцый

## ПАЧУЦЬ ПЕСНЮ ПЧОЛ,

альбо Чаму эканаміст стаў па дрэвах лазіць?

**Калоды, тварба, лазбень, лязіва... Гэтыя словы многім вядомы хіба што па вытрымках з падручніка па айчыннай гісторыі. Бортніцтва сёння лічыцца ледзь не экзатычным занняткам. Аднак даследчык Іван ОСІПАЎ, які займаецца вывучэннем старадаўняга промыслу ўжо на працягу сямі гадоў, абвяргае мае словы. Дык ці ёсць будучыня ў бортніцтва?**

### ВЯСКОВЫ МЕНЕДЖМЕНТ

Будучы бортнік вырас у вёсцы пад Лоевам і ўжо з дзяцінства стаў знаёміца з наваколлем. Падлетак не ленаваўся распытваць у вяскоўцаў пра мясцовыя прыказкі, прымаўкі, песні, казкі, танцы, рабіў замалёўкі хат. Словам, назапашваў усё, што звязана з малой радзімай. Іван моцна захапіўся мікратапанімікай. Кожны лапік лесу, ручай, азярцо жывуць пад імёнамі, вядомымі толькі мясцовым жыхарам. Юны даследчык сабраў усе «імёны» ў адну кнігу.

Хлопец быў актыўным удзельнікам археалагічных раскопак: ратаваў іх ад «чорных капальнікаў». Здаецца, выбар быў відавочны — Іван стане гісторыкам. Але ён пайшоў па шляху бацькоў і паступіў у Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт.

— Вёска выхоўвае прагматызм, а археалогія — гэта авантурны занятак, — адзначае Іван. — Я пайшоў у эканамісты, каб навучыцца кіраваць гаспадаркай і займацца вясковым менеджментам.

А аднойчы знаёмы бацькі прынёс кнігу «Занятак спрадвеку высакародны», якая апавяла пра развіццё бортнага і калоднага пчалярства на Беларусі.

— Я пачаў яе чытаць і адкрыў для сябе новы свет. Пачаў распытваць у бацькі, ці бачыў ён у вёсцы калоду? Аказалася, раней у кожным двары трымалі па дзве-тры штукі. Калі промысел прыйшоў у занядад, людзі калоды папалілі. Тады я пачаў шукаць інфармацыю па інтэрнэт-крыніцах і зразумеў, што ў сеціве бортніцтва прадстаўлена вельмі сціпла, — узгадвае будучы бортнік.

Іван працягвае свае даследаванне: шмат чытаў, вывучаў. Пасля напісаў у «Вікіпедыі» першы артыкул пра бортніцтва.

*(Заканчэнне на 5-й стар. «ЧЗ».)*



Фота Надзеі БУЖАН.

Пяшня і лязіва — інструменты бортніка.

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
24 09 2015 г.

# Чым больш крэатыву, тым лепш

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

— Сёння патрабуюцца спецыялісты, якія ў стане вырашаць глабальныя праблемы, што вымагае асаблівай міждысцыплінарнай падрыхтоўкі і фарміравання кампетэнцый, якія б дазвалялі хутка перабудоўвацца, а можа, і змяняць на працягу прафесійнай кар'еры неаднойчы сваю спецыялізацыю, — падкрэсліў **рэктар БДПУ Аляксандр ЖУК**. — Таму ў свеце рэалізуецца канцэпцыя пераходу ад «адукацыі на ўсё жыццё» да «адукацыі праз усё жыццё». Нацыянальная вышэйшая школа развіваецца ў адпаведнасці з патрабаваннямі Балонскага працэсу.

Як сведчыць еўрапейская практыка, сумесныя міжнародныя адукацыйныя праграмы найбольш запатрабаваны на ўзроўні магістратуры. Пры гэтым беларускія ВНУ ўжо маюць першы вопыт стварэння і рэалізацыі такіх праграм. Сёння іх налічваецца больш за трыццаць. 13 беларускіх універсітэтаў рэалізуюць сумесныя адукацыйныя праграмы з універсітэтамі такіх краін, як Францыя, Кітай, Германія, Польшча, В'етнам, Швецыя, Расія, Літва, Украіна. Але адной з галоўных умоў прыцягальнасці магістарскіх праграм застаецца міждысцыплінарная падрыхтоўка спецыялістаў...

## У прыярытэце — інтарэсы працадаўцаў

— Швецыя даволі позна далучылася да Балонскага працэсу (у 2007 годзе), затое была магчымасць вучыцца на чужых памылках, — расказала беларускім калегам **саветнік Асацыяцыі ўніверсітэтаў Еўропы, грамадзянка Швецыі Ханне ШМІТ**. — Магістарская падрыхтоўка была для нас справай адносна новай. Да ўключэння ў Балонскі працэс у Швецыі была толькі ўніверсітэцкая адукацыя і аспірантура, але літаральна за год было распрацавана каля 600 магістарскіх праграм. Усе яны сталі вынікам цесных кансультацый з зацікаўленымі бакамі, у прыватнасці, з патэнцыяльнымі працадаўцамі. Мы павінны былі ўлічваць спецыфічныя запатрабаванні рынку працы. Медыцынскія ўніверсітэты ўшчыльную супрацоўнічалі з прадстаўнікамі медыцынскага рынку для таго, каб зразумець, якія канкрэтна спецыялісты ім патрабуюцца.

Праз шэсць гадоў з таго часу, як першыя выпускнікі магістратуры выйшлі на рынак працы, многае змянілася, але працэс не спраціўся. Шведскія ўніверсітэты самі шукаюць новыя сферы, дзе яны маглі б распрацаваць і прапанаваць студэнтам прывабныя праграмы, у тым ліку і для замежных грамадзян...

**Амаль усе вынаходнікі і навукоўцы былі таксама музыкантамі, мастакамі, пісьменнікамі або паэтамі.**

— Зараз створана ўжо каля 1014 курсаў, якія маюць міждысцыплінарны характар. З іх 870 — гэта міждысцыплінарныя курсы на англійскай мове, — дадала Ханне Шміт. — Патрабаванні, якія ўлічваюцца пры распрацоўцы міждысцыплінарных праграм, маюць на ўвазе развіццё ў студэнтаў і магістрантаў крэатыўнасці, крытычнага мыслення, бачання праблемы з розных бакоў, навыкаў камунікацыі, здольнасцяў да калектыўнага вырашэння задач, навыкаў работы ў праектах, кіравання інфармацыйнымі рэсурсамі, развіццё прадпрымальнасці і мультыкультуралізм (пад гэтым тэрмінам хаваецца веданне замежных моў).

## Ключ да інавацый

Для ўсіх краін, якія выбралі шлях інавацыйнай эканомікі, сёння паўстала пытанне суадносін тэхнічнага і крэатыўнага напрамкаў у адукацыі.

У пачатку 1990-х гадоў фізіёлаг Р. Рут-Бернштэйн вывучыў 150 біяграфій самых вядомых навукоўцаў ад Пастэра да Эйнштэйна. Як высветлілася, амаль усе вынаходнікі і навукоўцы былі таксама музыкантамі, мастакамі, пісьменнікамі або паэтамі: Галілей — паэтам і літаратурным крытыкам, Морзэ — мастаком-партрэтыстам, Эйнштэйн іграў на скрыпцы і г.д.

У 2010 годзе арганізацыяй «Амерыканцы за мастацтва» сумесна з Амерыканскай асацыяцыяй адміністратараў



Фота Анатолія КЛЕШЧУКА.

школ было праведзена даследаванне на тэму «Гатоўнасць да інавацый». І выявілася цікавая тэндэнцыя: усё часцей наймальнікі прад'яўляюць да сваіх новых супрацоўнікаў патрабаванні ў большай ступені мастацка-крэатыўнага, чым навукова-матэматычнага плана. Кампаніі хочуць наймаць работнікаў, якія, акрамя тэхналагічных навыкаў, валодаюць яшчэ і здольнасцю эфектыўна ўдзельнічаць у разнастайных мазгавых штурмах, рашэннях актуальных праблем, крэатыўна супрацоўнічаць, генерыраваць новыя ідэі.

На думку амерыканскіх навукоўцаў, супрацьпастаўленне навукі і мастацтва непрадукцыйнае, і абодва гэтыя напрамкі трэба развіваць у тандэме. Спроба актывізаваць адукацыю толькі ў кірунку навукі, інжынернай справы і матэматыкі без паралельнага развіцця Arts-дысцыплін можа прывесці да таго, што маладое пакаленне будзе пазбаўлена крэатыўнасці.Толькі адзінства дакладных навук і гуманітарных падыходаў дапаможа выхаваць усебакова развітых спецыялістаў, вынаходнікаў і наватараў у сваёй сферы. Таму сёння не толькі ў ЗША, але і ва ўсім свеце расце армія прыхільнікаў пераходу ад STEM-адукацыі (абрэвіятура расшыфроўваецца як «science, technology, engineering і mathematics» — «прыродазнаўчыя навукі, тэхналогіі, інжынерыя і матэматыка») да STEAM-адукацыі (тыя ж навукі плюс творчасць). У краінах, дзе развіваюць высокатэхналагічную вытворчасць, STEAM-адукацыя, якая развівае крэатыўныя навыкі, становіцца прыярытэтнай.

Тэхналогіі — ключавы аспект тавараў і паслуг, якія вырабляюцца на экспарт, але менавіта крэатыўная культура з'яўляецца той «разыначкай», якая дазваляе прадаваць іх за мяжой. Што рабіла б карпарацыя Apple без візуальнага дызайну сваіх прадуктаў, актыўных рэкламных кампаній і вонкавай лёгкасці дызайну інтэрфейсу? Без літары «А» (Arts) нельга было б рэалізаваць нават самыя відавочныя перавагі, якія дае STEM-адукацыя.

Вялікіх поспехаў у развіцці крэатыўнай эканомікі дамагліся азіяцкія краіны, напрыклад Сінгапур. Яшчэ ў 2002 годзе тут была запушчана ініцыятыва (RemakingSingapore), нацэленая на ператварэнне гэтага горада-дзяржавы ў сусветны цэнтр крэатыўнасці, інавацый і дызайну. Урад Сінгапура рэфармуе сістэму адукацыі так, каб стымуляваць крэатыўныя якасці моладзі і ўводзіць маладых, таленавітых людзей з новым тыпам мыслення ў розныя дзяржаўныя структуры, якія адказваюць за эканамічную палітыку.

**Што рабіла б карпарацыя Apple без візуальнага дызайну сваіх прадуктаў, актыўных рэкламных кампаній і вонкавай лёгкасці дызайну інтэрфейсу?**

Дзяржаўныя праграмы ў галіне STEAM-адукацыі праводзяць Аўстралія, Кітай, Вялікабрытанія, Ізраіль, Карэя, Расія...

## Задачкі прыкладнога характару

**Дацэнт кафедры педагогікі і праблем развіцця адукацыі БДУ, кандыдат педагагічных навук Святлана СІРЭНКА** падзялілася беларускім досведам у рэалізацыі міждысціплінарнага падыходу ў вышэйшай школе. Міждысцыплінарная інтэграцыя была ўкаранёна ў БДУ ў выкладанне вучэбных дысцыплін «Асновы інфармацыйных тэхналогій» (для студэнтаў спецыяльнасцяў «Філасофія», «Сацыялогія» і «Паліталогія»), «Педагогіка» (на спецыяльнасці «Інфармацыя і камунікацыя» факультэта філасофіі і сацыяльных навук»), «Педагогіка і псіхалогія вышэйшай школы» (для магістрантаў БДУ, якія аб'ядноўваліся ў міждысцыплінарныя каманды для вырашэння пэўных задач), а таксама рэалізаваная ў Акадэміі кіравання пры выкладанні дысцыплін «Распрацоўка і суправаджэнне web-рэсурсаў», «Камп'ютарная графіка і мультымедыя», «Web-дызайн і камп'ютарная графіка» (для студэнтаў спецыяльнасці «Кіраванне інфармацыйнымі рэсурсамі»). Больш як 300 студэнтаў з гэтых ВНУ былі ўцягнуты ў эксперыментальную працу.

З гэтага навучальнага года плануецца выкладаць на факультэце прыкладной матэматыкі і інфарматыкі таксама на міждысцыплінарнай аснове спецкурс «Бізнес і сацыяльная інфармацыя».

А вясной Белдзяржуніверсітэт сумесна з Нацыянальнай акадэміяй навук правёў міжнародны студэнцкі турнір прыродазнаўчых дысцыплін і навук «СТЭНД», які сабраў 14 каманд з універсітэтаў Беларусі, Расіі і Украіны. Пры падборы задач аргкамітэт стараўся выбіраць задачы з кожнай дысцыпліны: фізікі, хіміі, біялогіі, але гэта былі не акадэмічныя заданні, а праблемы прыкладнога характару. Удзельнікі турніру павінны прапанаваць свае шляхі выхаду, абапіраючыся на міждысцыплінарныя веды. Немалаважна, што кампаніі-спонсары далі студэнтам магчымасць папрацаваць над канкрэтнымі вытворчымі праблемамі. Аналагічныя турніры даўно ладзяцца ў Расіі і ва Украіне, але для Беларусі «СТЭНД» стаў першым падобным досведам: дагэтуль праводзіліся спаборніцтвы, спецыялізаваныя на канкрэтным прадмеце, — хіміі, фізіцы альбо біялогіі, а «СТЭНД» аб'яднаў гэтыя дысцыпліны. У фінале каманды-прызёры за адну гадзіну, карыстаючыся рознымі крыніцамі інфармацыі, аператыўна распрацавалі план па абароне насельніцтва ад наступстваў маштабнага выкіду радыеактыўных ізатопаў у асяроддзе. Крэатыўнасцю гэтых маладых людзей Бог не пакрыўдзіў...

### ДАВЕДКА

**У 2014 годзе на змену добра знаёмым у Беларусі праграмам Еўрапейскай камісіі для сферы вышэйшай адукацыі Tempus і Erasmus Mundus прыйшла новая праграма Erasmus +. Яна разлічана на сямігадовы перыяд (да 2020 года) і тэматычна скіравана на адукацыю, прафесійнае навучанне, моладзь і спорт. У рамках Erasmus + будзе фінансавацца больш за 10 розных тыпаў праектаў, правілы ўдзелу ў якіх адрозніваюцца для прадстаўнікоў розных краін. Абноўленая праграма прапануе больш магчымасцяў студэнтам, выкладчыкам і валанцёрам. Каб праграма стала даступнай і адкрытай, яе структура была істотна спрошчаная. У Erasmus + зліліся шэсць папярэдніх праграм (Lifelong Learning, Erasmus, Leonardo da Vinci, Comenius, Grundtvig, Youth in Action), чатыры праграмы міжнароднага супрацоўніцтва Erasmus Mundus, Tempus, Alfa, Edulink, а таксама праграмы супрацоўніцтва з развітымі краінамі.**

---

*Факт*

## ЗВЯЗАНЫЯ З АТАМАМ

**Тры беларускія ўніверсітэты плануецца задзейнічаць у рэгіянальнай сетцы ядзернай адукацыі і падрыхтоўцы персаналу ў галіне атамнай прамысловасці STAR-NET.**

У сетку ўвойдуць ВНУ шасці дзяржаў: Расіі, Беларусі, Украіны, Азербайджана, Арменіі і Казахстана. У цэнтры ўвагі будуць знаходзіцца пытанні стандартызацыі праграм падрыхтоўкі будучых інжынераў, прызнання дыпломаў, абмену студэнтамі, выкладчыцкім складам і многае іншае.

Па словах міністра адукацыі Міхаіла Жураўкова, цікавасць абітурыентаў да спецыяльнасцяў, звязаных з атамнай энергетыкай, узрастае, пра што сведчыць і рост конкурсу падчас уступнай кампаніі. Сума прахадных балаў на некаторыя з іх павялічылася ў 1,5-2 разы. Сёння кадры для ядзернай энергетыкі ў Беларусі рыхтуюць чатыры ВНУ: БДУ, БНТУ, БДУІР і Міжнародны дзяржаўны экалагічны ўніверсітэт імя А.Д. Сахарава, які ўвайшоў у склад БДУ. Веды тут атрымліваюць 800 чалавек па шасці спецыяльнасцях. Выпушчана ўжо больш за 500 спецыялістаў.

Міхаіл Жураўкоў распавёў, што кожны з гэтых чатырох універсітэтаў мае доўгатэрміновыя дагаворы з расійскімі ВНУ для таго, каб беларускія студэнты праходзілі на іх базе практыку. Напрыклад, БДУ актыўна супрацоўнічае з Нацыянальным даследчым ядзерным універсітэтам «МІФІ», а БНТУ — з Ніжагародскім універсітэтам імя М.І. Лабачэўскага.

Маладыя людзі, якія вырашылі звязаць сваё жыццё з атамнай энергетыкай, маюць магчымасць стажыравацца на атамных электрастанцыях у Расіі. Найбольш адораныя праходзяць практыку ў навучальных цэнтрах Швейцарыі, Францыі і Фінляндыі.

---

*Не вучобай адзінай!*

## ПРЫСЛУХАЦЦА ДА МОЛАДЗІ...

**Першая міжнародная студэнцкая канферэнцыя «Студэнцкае самакіраванне: вопыт і перспектывы развіцця» пройдзе 28—29 верасня на базе Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.**

Яе арганізатарам выступілі Міністэрства адукацыі, Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы і Грамадскі рэспубліканскі студэнцкі савет.

Удзельнікамі канферэнцыі стануць маладыя людзі ва ўзросце ад 18 да 30 гадоў з ліку актывістаў студэнцкіх арганізацый, а таксама прадстаўнікі органаў дзяржаўнага кіравання, якія курыруюць пытанні маладзёжнай палітыкі, — усяго 120 чалавек. Запланавана работа чатырох секцый: «Студэнцкае самакіраванне ў адукацыйнай прасторы ўстановы вышэйшай адукацыі: кіраванне, якасць, развіццё», «Інавацыйныя формы работы органаў студэнцкага самакіравання», «Студэнцкае самакіраванне ў інфармацыйнай прасторы» і «Лідар студэнцкага самакіравання». На другі дзень работы канферэнцыі адбудзецца сустрэча міністра адукацыі Міхаіла Жураўкова з самымі актыўнымі прадстаўнікамі моладзі.

---

*Прывітанне, альма-матар!*

## АДАПТАЦЫЯ ПРАЗ СЕЦІВА

**Электронны гід першакурсніка запушчаны ў БДУ. Анлайн-праект дапамагае ім даведацца, як атрымаць месца ў інтэрнаце, як знізіць аплату за навучанне, а таксама пра тое, дзе можна больш танна падсілкавацца.**

Студэнтаў знаёмяць з маладзёжнымі арганізацыямі і органамі студэнцкага самакіравання, творчымі і спартыўнымі секцыямі, якія дзейнічаюць у БДУ. Немалаважнае значэнне для сучасных студэнтаў маюць і магчымасці для міжнародных абменаў. Гід накіруе ў патрэбны раздзел, які падкажа, як можна прыняць удзел у адукацыйным праекце за мяжой.

Шмат месца адведзена сацыяльным гарантыям для студэнтаў. Першакурснікі могуць даведацца, як атрымаць абанемент у басейн, трэнажорную залу і аздаравіцца ў санаторыі-прафілакторыі. Уся інфармацыя электроннага рэсурсу падаецца праз інфаграфіку і відэа.

«Першакурснікам важна сацыяльна адаптавацца з першых дзён свайго навучання ва ўніверсітэце, — падкрэслівае кіраўнік медыяцэнтра БДУ Павел САЛАЎЁЎ. — Галоўная задача сайта — дапамагчы навічкам сацыялізавацца. Студэнты таксама павінны ведаць пра магчымасці, якія прапаноўвае ўніверсітэт, а патэнцыял у БДУ сапраўды вялікі».

Матэрыялы паласы падрыхтавала Надзея НІКАЛАЕВА. nikalaeva@zviazda.by

*Хто, калі не мы*

# СТУДЭНТ, РАЗВАЖАЙ! ЦЯБЕ СЛУХАЮЦЬ

**Чарговыя адкрытыя дэбаты БРСМ «Выбірай.by!» прайшлі ў Беларускім дзяржаўным універсітэце. На гэты раз моладзь абмяркоўвала тэму студэнцкага самакіравання. Лідары пярвічных арганізацый БРСМ устаноў вышэйшай адукацыі з усіх рэгіёнаў краіны сабраліся, каб падыскутаваць аб тым, як сёння працуе студэнцкае самакіраванне, чаго яму не хапае і ў якім кірунку яму трэба развівацца. У якасці экспертаў выступілі міністр адукацыі Міхаіл ЖУРАЎКОЎ, першы сакратар Цэнтральнага камітэта БРСМ Андрэй БЕЛЯКОЎ, а таксама рэктары сталічных ВНУ Сяргей АБЛАМЕЙКА (БДУ), Наталля БАРАНАВА (МДЛУ), Станіслаў КНЯЗЕЎ («МІТСО») і іншыя.**






Каманды ўдзельнікаў («Актыў.by» і «Perpetuum Mobile») стваралiся літаральна напярэдадні. Спецыяльна да дэбатаў ніхто не рыхтаваўся, ды і асаблівай патрэбы не было: хлопцы і дзяўчаты ўваходзяць у студэнцкае самакіраванне ў сваіх ВНУ, таму гэтая тэма для іх не новая. Але кожны меў сваё бачанне, свае прыклады і ідэі.

Так, каманда «Актыў.by» сфармулявала наступнае паняцце: «Студэнцкае самакіраванне — гэта першы крок на шляху да твайго поспеху, магчымасць быць пачутым, самарэалізацыя, фундамент для асобы будучага кіраўніка, дэмакратыя ў дзеянні».

Падчас дыскусіі ўдзельнікі прыйшлі да думкі, што пра эфектыўнасць самакіравання можна меркаваць па тым, з якой хуткасцю вырашаюцца праблемы ва ўніверсітэце. Студэнты, як правіла, бачаць недахопы знутры. Іх галоўная задача — растлумачыць кіраўніцтву ВНУ сутнасць праблемы і, магчыма, прапанаваць варыянты яе рашэння.

Паколькі студэнцкае самакіраванне існуе ва ўсіх ВНУ Беларусі, была закранута і тэма яго ўніфікацыі. Студэнцкія лідары прыйшлі да думкі, што гэта немагчыма, паколькі кожная навучальная ўстанова мае свае традыцыі.

Падчас дэбатаў міністр адукацыі неаднаразова выказваў думку, што мэта студэнцкага самакіравання заключаецца не толькі ў тым, каб арганізоўваць нейкія культурна-масавыя або спартыўныя мерапрыемствы. Міхаіл Жураўкоў падкрэсліў: неабходна, каб студэнты актыўна ўплывалі і на адукацыйны працэс, былі неабыякавымі да таго, што і як яны вывучаюць.

— Апошнім часам мяне хвалюе сацыяльная інфантыльнасць моладзі, — прызнаўся міністр. — Створаны цудоўныя ўмовы для развіцця маладога пакалення, аднак многія перастаюць цаніць гэта і ўспрымаюць як належнае, нібыта дзяржава ім павінна.

Эксперты не толькі каментавалі выказванні студэнцкіх лідараў і давалі ім парады, але і задавалі пытанні. Андрэй Белякоў нечакана запытаўся ў моладзі: «Ці хацеў бы хто-небудзь з вас у будучым стаць рэктарам?» Такое пытанне дазволіла ўдзельнікам дэбатаў на некаторы час адысці ад сур'ёзных разважанняў і крышачку памарыць.

— Дэбаты атрымаліся плённымі і для нас, лідараў студэнцкіх арганізацый, і для экспертаў, таму што ва ўсіх была магчымасць выказацца і паслухаць. Увогуле, пасля падобных мерапрыемстваў у мяне з'яўляецца шмат ідэй, якія я магу рэалізаваць у сваім універсітэце. Напрыклад, прагучала думка, што неабходна аб'ядноўвацца лідарам розных студэнцкіх арганізацый, якія існуюць у ВНУ, для больш эфектыўнага самакіравання, — расказаў **Аляксандр СЯНЧУК, сакратар БРСМ Брэсцкага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта.**

Таксама падзялілася ўражаннямі **Хрысціна КІСЛОВА, сакратар БРСМ Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта:**

— Мне было цікава не толькі самой паразважаць на тэму студэнцкага самакіравання, але і пачуць меркаванні экспертаў, паколькі яны ўспрымаюць яе з іншага пункту гледжання. Я задумалася і пра тое, як праводзяцца выбары лідараў студэнцкіх арганізацый. Напэўна, было б карысна ва ўніверсітэцкім асяродку ладзіць перадвыбарныя кампаніі.

Вынікі дэбатаў Міхаіл Жураўкоў падвёў адной ёмістай фразай пра ўдзельнікаў: «Вы іншыя, але вы класныя!»

**Ганна КУРАК,**
**студэнтка IV курса Інстытута журналістыкі БДУ.**

*Ты — справішся!*

# ПЕРШЫ КУРС — ПАЧАТАК УСЯГО...

**Гэты год стаў для мяне асаблівым па многіх прычынах. Я скончыла школу, паспяхова здала цэнтралізаванае тэсціраванне, паступіла ў ВНУ і пераехала ў вялікі горад. І ў ім шмат што для мяне аказалася новым, раней невядомым. Не адразу прывыкла да пастаяннага шуму, вялікай колькасці машын і доўгага чакання на пешаходных пераходах. Нават сістэма аплаты праезду ў грамадскім транспарце тут не такая, як у маім родным горадзе. Кожны дзень я спасцігаю нешта новае для сябе, усё яшчэ прывыкаю да статусу студэнта і асвойваюся на новым месцы...**


Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Студэнцтва заўсёды ўяўлялася мне гэткай прыгодай. Думка «ў інстытуце лягчэй, чым у школе, і няма хатніх заданняў» — мой галоўны самападман. У тым, што не ўсё так проста, нас пераканалі на першай жа пары. «Давядзецца шмат займацца. У адрозненне ад школы, тут асноўная частка падрыхтоўкі кладзецца на вашы плечы. Нікога не будзе хваляваць, што вы не знайшлі патрэбны падручнік ці праспалі лекцыю», — такім быў вердыкт выкладчыка (настаўнікі, дарэчы, засталіся ў школе). Прывыкай, што шмат часу ты будзеш праводзіць у бібліятэцы. Рэфератам, узятым з інтэрнэту, ужо нікога не здзівіш. Некаторыя такія «працы» студэнты прыносяць з года ў год, і выкладчыкі ведаюць іх на памяць.

Думаеш, з'ехаў ад бацькоў і больш ніякага кантролю? Забудзь. Вядома, шмат у чым ты становішся больш самастойным: прыйдзецца самому вырашаць многія праблемы, разлічваць выдаткі, каб хапіла да стыпендыі. Напрыклад, ты даведаешся, колькі каштуе гаспадарчае мыла і як змагацца з накіпам у чайніку. Калі дома ў цябе быў свой пакой, то, жывучы ў інтэрнаце, па першым часе будзе цяжка прывыкнуць да таго, што побач пастаянна хтосьці ёсць. З суседзямі па пакоі трэба не толькі ўжывацца, але і весці сумесны побыт. Раю адразу падзяліць абавязкі, устанавіць дзяжурства па прыборцы. Маці, якая магла б зрабіць заўвагу за незасланы ложак, побач не будзе, але каменданта інтэрната ніхто не адмяняў, таму за невыкананне санітарных нормаў можна і вымову атрымаць.

Асаблівае месца ў інтэрнаце — гэта кухня. Не ўмееш ці не любіш гатаваць? Не перажывай, есці захочаш — хутка навучышся. А калі што, то старэйшыя таварышы галодным не пакінуць і навучаць хоць бы аўсянку варыць. А вось адціраць за табой рэшткі абеду з пліты не будзе ніхто. Гатуеш — прыбірай за сабой.

**«Рэфератам, узятым з інтэрнэту, ужо нікога не здзівіш. Некаторыя такія «працы» студэнты прыносяць з года ў год, і выкладчыкі ведаюць іх на памяць».**

Вячэрні горад мае асаблівую атмасферу. Аднак не забывай, што большасць інтэрнатаў зачыняецца ў 23 гадзіны і, не разлічыўшы час, ты рызыкуеш не паспець дадому.

Магчымасці вялікага горада і адсутнасць кантролю бацькоў могуць закружыць галаву. Аднак увесь час памятай, што ты першакурснік. З боку выкладчыкаў да цябе — самая пільная ўвага. Добра сябе зарэкамендуй, пакажы свае таленты, удзельнічай у грамадскай дзейнасці. А пагуляць яшчэ паспееш. Пагадзіся, крыўдна будзе вылецець пасля першай жа сесіі.

Як бы там ні было, студэнцтва — важны і ў той жа час займальны жыццёвы этап. Ты даведаешся шмат новага, завядзеш новых сяброў (нават не сумнявайся), прывыкнеш да самастойнасці. Але галоўнае — гэта шлях ад «зялёнага» першакурсніка да сапраўднага спецыяліста. Vivat, студэнт!

**Арына КАГАЛЁНАК,**
**студэнтка I курса факультэта арганізацыі паветранага руху Беларускай дзяржаўнай акадэміі авіяцыі.**

*Дах над галавой*

# МЕСЦА Ў ІНТЭРНАЦЕ МОЖНА АТРЫМАЦЬ, А МОЖНА «ЗАРАБІЦЬ»

**Што неабходна рабіць, каб атрымаць месца ў інтэрнаце? З гэтым пытаннем я звярнулася да Міхаіла ЧАРАПЕННІКАВА, намесніка прарэктара па вучэбна-выхаваўчай працы і сацыяльных пытаннях БДУ:**

— Калі студэнту не далі месца ў інтэрнаце сёлета, то ёсць толькі адзін варыянт — чакаць. Чарга рухаецца ўвесь год, таму што ва ўніверсітэце заўсёды адбываюцца нейкія змены. Хтосьці на завочнае аддзяленне сыходзіць, кагосьці, на жаль, адлічваюць, нехта адмаўляецца ад інтэрната, напрыклад, дзяўчаты замуж выходзяць і перасяляюцца.

Пры гэтым ёсць выразная траекторыя, што можна зрабіць для таго, каб засяліцца ў інтэрнат. Яна апісана ў нашым крытэрыі прадастаўлення жылога памяшкання.

1 частка. Тыя, хто мае льготы, засяляюцца па-за чаргой. Зразумела, яны не могуць не атрымаць месца ў інтэрнаце.

2 частка. Тыя, хто мае правa на засяленне ў першую чаргу. Гэтую частку ўніверсітэт пашырыў. Гаворка ідзе пра паспяховых студэнтаў (пры сярэднім бале паспяховасці за ўвесь перыяд навучання, за выключэннем вясновай экзаменацыйнай сесіі 2014/2015 навучальнага года, 6.0 і вышэй), шматдзетныя сем'і, студэнтаў з няпоўных сем'яў, інвалідаў III групы, тых, у каго бацькі загінулі або памерлі. Універсітэцкаму актыву прадастаўляецца жыллё пры сярэднім бале паспяховасці за ўвесь перыяд навучання, за выключэннем вясновай сесіі 2014/2015 навучальнага года, 7,5 і вышэй.

Мы ўсіх заклікаем актыўна ўдзельнічаць у жыцці ўніверсітэта. Адукацыя — гэта не толькі вучоба, лекцыі і практыка, але і тая частка, якая звязана з самарэалізацыяй і выхаваннем.

Са студэнцкага актыву першымі ў спіс прэтэндэнтаў на месца ў інтэрнаце трапляюць спартсмены. Ацэньваюцца актыўны ўдзел у спартыўным жыцці і высокія дасягненні (майстры і кандыдаты ў майстры спорту). Пад гэты ж крытэрый трапляюць і студэнты, якія маюць I разрад па гульнявых відах спорту.

Яшчэ варыянт — гэта актыўны ўдзел у навуковай дзейнасці, у культурным жыцці ўніверсітэта (ёсць агульнаўніверсітэцкія калектывы, якія маюць званне заслужаных і народных).

Грамадскае жыццё. Ва ўніверсітэце велізарная колькасць арганізацый. Практычна ў любой з іх можна сябе праявіць.

Ёсць варыянт удзелу ў студэнцкіх атрадах. Але гэта не азначае, што калі ты трапіў, напрыклад, у будатрад, дык аўтаматычна засяліўся. Пры ўмове, калі ты якасна адпрацаваў, то, вядома, будзеш мець такое права.

Усе гэтыя варыянты — для будучага года. Што рабіць таму, каму не далі месца ў інтэрнаце сёлета? Па-першае, чакаць чаргі, па-другое, мы дапамагаем з найманнем жылля: на сайце bsu.by перыядычна абнаўляецца спіс, па-трэцяе, студэнты дзённай бюджэтнай формы навучання могуць атрымліваць кампенсацыю ў тры базавыя велічыні ў месяц (гэта 540 тысяч рублёў), падаўшы дакументы ў Студгарадок. Дзяржава кампенсуе не наём жылля, а ложка-месца ў пакоі. Умоўна кажучы, здымны пакой каштуе 100 долараў, а ў інтэрнаце студэнты не жывуць па адным у пакоі, таму калі здымаць утраіх, 540 тысяч — тыя ж 30 долараў з чалавека. У прынцыпе, ложка-месца кампенсуецца амаль у поўным аб'ёме. Гэта добрая дапамога.

## А ЯК СТУДЭНТЫ СТАЛІЧНЫХ ВНУ СПРАЎЛЯЮЦЦА З ПРАБЛЕМАЙ ПОШУКУ ДАХУ НАД ГАЛАВОЙ?

**Радзівон МАГІЛЕЎЧЫК, III курс эканамічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, *г. Барысаў:***

— Безумоўна, хацеў бы жыць у інтэрнаце. Весялей, лягчэй рыхтавацца да сесіі, ёсць магчымасць наведваць трэнажорную залу. Улетку я пайшоў у будатрад, таму атрымаў магчымасць засяліцца ў інтэрнат. Разам з іншымі студэнтамі фарбаваў, прыбіраў, мыў свой жа інтэрнат. Я лічу, калі задацца мэтай атрымаць месца ў ім, то ўніверсітэт прапануе дастатковую для таго колькасць шанцаў. Так што мая думка такая: не прыклаў намаганняў — плаці.

**Аліна ГАЎРЫЛЕНКА, III курс факультэта электрасувязі Вышэйшага дзяржаўнага каледжа сувязі, *г. Дуброўна:***

— Я жыла ў інтэрнаце тры гады, а цяпер здымаю жытло за 90 долараў на «Пятроўшчыне». Жыву з гаспадыняй, але пакой асобны. Вучэбны корпус знаходзіцца на вуліцы Ф. Скарыны. Да яго еду каля 50-60 хвілін.

**Алеся ЗУБОК, III курс філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, *г. Бабруйск:***

— Ужо некалькі разоў была ў будатрадзе і тры гады — у самакіраванні. Я жыву ў інтэрнаце трэці год. Там мая другая сям'я — мой любімы студэнцкі савет. На першым курсе я стала яго старшынёй. Давялося вучыцца кіраваць, быць лідарам і пазбавіцца комплексаў і страхаў.

**Настасся ЖУХАРАВА,**
**студэнтка IV курса Інстытута журналістыкі БДУ.**

Подыум

**Апці ЭЗІЕЎ:**

# «Адну мадэль двойчы не шыю»



## МАЛАДЫ МАДЭЛЬЕР — ПРА МАРУ СТАЦЬ ТРЭНЕРАМ, ІТАЛЬЯНСКІЯ ТКАНІНЫ І ГУСТЫ БЕЛАРУСКІХ МУЖЧЫН

**Паказы гэтага дызайнера ні з чым не пераблытаеш. Толькі Апці Эзіеў можа выпусціць на подыум мужчын у сукенках і мадэль з сівой барадой. Яго незвычайны погляд на моду знайшоў прыхільнікаў не толькі сярод беларусаў. 26-гадовы мадэльер упэўнена штурмуе расійскія і еўрапейскія подыумы. Даказвае, што свабоднае, зручнае, брутальнае (няважна, жаноцкае ці мужчынскае) адзенне можа быць у трэндзе. Кожную рэч Апці шые сам, бо для яго мода — гэта мастацтва, якое небяспечна ставіць на паток: можна страціць сябе.**

— У школьныя гады не даводзілася выбіраць адзенне, — узгадвае дызайнер, — апраналі бацькі. Дырэктар школы вызначаў строгія рамкі наконт знешняга выгляду. Але мама, якая сама з дзяцінства шые, нейкімі дэталямі спрабавала вылучыць нас са старэйшым братам — цікавым гальштукам-матыльком, «амерыканскім» заплечнікам.

***— Памятаеце, калі самі пачалі шыць?***

— Напэўна, у пятым класе. Мы да 8 сакавіка на невялікіх кавалачках тканіны вышывалі чырвонымі ніткамі ружу. Тады я яшчэ, вядома, не разумеў, што шыць — гэта маё, проста хацеў парадаваць маму. У моду прыйшоў па нейкіх касмічных абставінах. Я 13 гадоў займаўся настольным тэнісам, збіраўся стаць трэнерам. Але зламаў руку, не змог гуляць, не паступіў у фізкультурны ўніверсітэт... Памятаю, у той дзень, калі на факультэце сказалі, што я не залічаны, іду ў слязах, баюся дома паказацца: бацька сварыцца будзе. Я не ведаў, якую прафесію выбраць, але мне падабалася хораша апранацца. Знаёмая параіла аднесці дакументы ў мінскі швейны каледж, на завулку Розы Люксембург. Так я паступіў на мадэльера-канструктара

***— Як з'явілася першая калекцыя?***

— У 2010 годзе ад сваёй выкладчыцы па мадэляванні я даведаўся пра рэспубліканскі фестываль «Млын моды», дзе дызайнеры-пачаткоўцы могуць смела выстаўляцца. Праходзіш эскізны тур, потым даюць дазвол на пашыў калекцыі. Трэба было зрабіць пяць мадэляў адзення. Каледж закупіў мне тканіну, шыць дапамагалі дзве аднагрупніцы. Самае страшнае, што пасля стварэння яе маглі не ўхваліць і не выпусціць на подыум. Але для мяне ўсё склалася ўдала. На тым «Млыне моды» я трапіў у дзясятку найлепшых дызайнераў краіны.

***— З якімі цяжкасцямі сутыкаюцца маладыя мадэльеры?***

— Самая адчувальная — фінансавая праблема. Не кожны можа купіць прамысловае абсталяванне. А пачнеш шыць на звычайным бытавым — потым не адвыкнеш. Не хапае грошай на матэрыялы. Я, напрыклад, працую з італьянскімі тканінамі, яны вельмі дарагія. Мала хто з дызайнераў-пачаткоўцаў дазволіць сабе іх набыць, дый не кожны кліент потым зможа купіць такі тавар. Які чалавек тут аддасць некалькі мільёнаў рублёў за штаны?

**«Казалі, што ў нашай краіне мае рэчы не пойдуць, маўляў, гэта вулічнае адзенне, хутчэй, для Берліна ці Нью-Ёрка, а тут патрэбна штосьці больш класічнае».**

***— Навошта тады выбіраць такія дарагія матэрыялы?***

— Калі пашыць майку з турэцкай тканіны, то літаральна праз два-тры мыцці яна скачаецца, бо Турцыя арыентуецца на аптовыя продажы. Італія, каб не псаваць сваю рэпутацыю цэнтра моды, сочыць за якасцю. Вось уявіце, звярнуўся да вас кліент, хоча пашыць касцюм, каб у ім пайсці на вяселле да сяброў. Дзень адгуляў — тканіна выцвіла і стала блішчаць. Гэты чалавек больш нічога ў вас не закажа. Напачатку, калі грошай не было, я набываў танны матэрыял, але потым вырашыў, што лепш купляць даражэйшы, за большую суму прадаваць свае вырабы, затое кліент будзе задаволены, бо разумее, за што заплаціў. Увогуле, у нашых крамах не хапае тканін, з якімі дызайнеры хацелі б працаваць.



***— Ваш стыль — вулічны, брутальны, свабодны — значна адрозніваецца ад таго, што прэзентуе большасць беларускіх брэндаў.***

— Я не гляджу модных часопісаў і тэматычных праграм па тэлебачанні. Таму што калі сочыш за тэндэнцыямі, то, ствараючы свае рэчы, міжволі ўспамінаеш убачаныя мадэлі і пачынаеш іх капіраваць. Мой стыль — гэта мая душа. Я свабодны чалавек, таму люблю ў адзенні ўсё аб'ёмнае і шырокае.

***— А як астатнія напачатку ўспрымалі яго?***

— Людзі пыталі: а чаму ты не зробіш, напрыклад, джынсавую вопратку? Казалі, што ў нашай краіне мае рэчы не пойдуць, маўляў, гэта вулічнае адзенне, хутчэй, для Берліна ці Нью-Ёрка, а тут патрэбна штосьці больш класічнае. Калі б я слухаў іх меркаванні, то не стаў бы тым, кім ёсць.

***— Але ж мода — гэта бізнес. Трэба вылучацца і ў той жа час рабіць адзенне, якое будзе добра прадавацца...***

— На гэты момант я займаюся творчасцю, не ганюся за грашыма. У першую чаргу хачу ствараць адзенне, каб радаваць сябе і сваіх бацькоў. Кліенты любяць мяне за тое, што я не раблю адну мадэль двойчы. Нават калі рэчы падобныя па сілуэце, па крої, за кошт зашпілек ці колеру скуры яны глядзяцца па-рознаму. У масмаркет не хачу. Так, можна зарабіць на дом, машыну, купіць залаты злітак і павесіць сабе на шыю. Але я выбіраю творчасць, а не камерцыю.

***— Дарэчы, пра першую. У модзе, кажуць, прыдумаць новае ўжо немагчыма. А публіка ж чакае!***

— Вядома, ёсць база: штаны, кашуля, пінжак. Аднак кожны падыходзіць па-свойму, у гэтым і ёсць унікальнасць. На паказах я стараюся зрабіць так, каб у гледачоў мурашкі поўзалі. З дапамогай аксесуараў, макіяжу, музыкі ствараю цэлую гісторыю. Паказваць на тыднях моды «сырое» адзенне — непрафесійна. Гэта павінна быць мастацтва.

***— Сярод вашых калекцый ёсць мужчынскія. Ведаю, што некаторыя дызайнеры не разглядаюць мужчын як сваю аўдыторыю: маўляў, модай не цікавяцца, шыць для іх непрыбыткова...***

— Калі б я ствараў гардэроб толькі для жанчын, было б дзіўна: я сам мужчына і не магу зрабіць мужчынскае адзенне? Не сутыкаўся з праблемай продажу: і тое, і тое бяруць аднолькава добра. Чаму мужчына павінен апранацца горш? Жанчына хоча бачыць побач прыгожага спадарожніка — ахайнага, ад якога прыемна пахне.

***— Вам падабаецца, як апранаюцца нашы мужчыны?***

— Яны з кожным днём выглядаюць усё лепш і лепш, таму што падарожнічаюць. Праўда, ездзяць звычайна ў Турцыю і Егіпет, але, нават знаходзячыся там, яны становяцца больш свабоднымі і, калі вяртаюцца сюды, могуць спакойна прайсціся па вуліцы ў шортах і рванай майцы. Мысленне змяняецца, калі пачынаеш вандраваць. У Беларусі шмат прыгожых і стыльных хлопцаў. Думаю, Мінск хутка стане адным з цэнтраў моды. Сур'ёзна!

***— А якія рэчы ў гардэробе гараджан вам здаюцца абсурдам?***

— Для мяне не зразумелыя барсеткі пад рукой, абутак з узорам у дробныя дзірачкі. Але непрыгожа асуджаць людзей за іх знешні выгляд. Магчыма, у чалавека няма сродкаў на іншую вопратку ці ён не разумее, што яму больш пасуе. Нельга абражаць з-за адзення, псаваць камусьці цэлы дзень толькі таму, што нам здаецца, быццам ён выглядае клоўнам. Стыль — гэта выбар кожнага. Аднаму падабаюцца брыжыкі, іншаму — скура... Не трэба навязваць сваё бачанне.

***— Якую калекцыю чакаць ад вас у найбліжэйшы час?***

— Не ведаю, што гэта будзе. Усё нараджаецца спантанна. Неўзабаве планую зняць незвычайны fashion-кліп у Чачэнскай Рэспубліцы (Апці адтуль родам. — **Аўт.**). У гарах, на вышыні чатырох тысяч метраў над узроўнем мора, зрабіць подыум з драўляных брускоў, запусціць мадэляў, а замест гледачоў пасадзіць хаскі... Я цяпер спрабую наладзіць сваё жыццё, тады я зразумею, як развівацца далей. Не хачу быць дызайнерам адзення: так называюцца, каб пахваліцца сярод сяброў. Хачу быць чалавекам, у якога атрымліваецца тварыць.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
lubneuskaya@zviazda.by



Сваімі рукамі

# Хэндмэйд: зроблена з душой...

**Сацыялагічнае анлайн-даследаванне на тэму «Адзенне і аксесуары хэндмэйд: модны трэнд або прывід мінулага?» правялі супрацоўнікі кафедры эканамічнай сацыялогіі Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта сярод карыстальнікаў сацыяльных сетак. Апытаннем было ахоплена больш як 400 рэспандэнтаў.**

Падчас даследавання высветлілася, што адзенне і аксесуары, зробленыя рукамі ўмелых майстроў, імкліва набіраюць папулярнасць у Беларусі, набываючы статус дызайнерскіх. І калі раней ручная вышыўка асацыявалася, у першую чаргу, з бабуліным куфрам, то цяпер такі арнамент усё часцей можна ўбачыць у элементах адзення сучаснай моладзі і дзелавых людзей.

Высветлілася, што хэндмэйд часцей за ўсё асацыюецца ў рэспандэнтаў з падарункамі, ручным вырабам аксесуараў і адзення. Большасць з тых, хто набывае тавары хэндмэйд, адзначаюць, што гэта прадукцыя не масавай вытворчасці, яна арыгінальная і дазваляе вылучацца, у ёй прысутнічае «душэўнасць» выканання і арыгінальная дызайнерская ідэя. Якасць тавараў хэндмэйд не ацэньваецца рэспандэнтамі адназначна як добрая ці дрэнная, але ўсе апытаныя сышліся ў думцы, што такія тавары прываблiваюць сваёй унікальнасцю і высокай сімвалічнай значнасцю.



Фота Надзеі БУЖАН.

Галоўнай прычынай набыцця адзення з нацыянальнай беларускай сімволікай з'яўляецца патрыятычны стыль прадукцыі — на гэта ўказалі 69,3% рэспандэнтаў. Унікальнасць дызайнерскай прапановы ў якасці прычыны выбару адзначылі 49,5% апытаных, адпаведнасць прадукцыі з нацыянальнай беларускай сімволікай модным запатрабаванням «прасунутай» беларускай моладзі — 31%, а 29,4% рэспандэнтаў лічаць, што такія тавары даюць магчымасць вылучацца сярод іншых.

Для дзяўчат больш значна, чым для мужчын, з'яўляецца прысутнасць у адзенні не толькі нацыянальнай беларускай сімволікі, але і элементаў ручной працы.

Рэспандэнты адзначылі, што прадукцыя хэндмэйд шырока прадстаўлена ў Мінску ў этнакрамах, на спецыялізаваных выстаўках і кірмашах. Аднак усе рэспандэнты назвалі самым папулярным і дзейсным каналам распаўсюджвання сацыяльныя сеткі. Што тычыцца коштаў на тавары катэгорыі хэндмэйд, то 52,9% рэспандэнтаў лічаць іх прымальнымі, улічваючы эканамічныя выдаткі і каштоўнасць тавару.



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Цэняць карыстальнікі сацыяльных сетак і беларускамоўнае афармленне старонак у вытворцаў тавараў хэндмэйд — больш за палову рэспандэнтаў паведамілі, што гэта з'яўляецца істотным плюсам і прыцягвае патэнцыйных спажыўцоў.

З мэтай высвятлення партрэта спажыўца тавараў хэндмэйд рэспандэнтам было зададзена пытанне «Кім у беларускім грамадстве лічаць людзей, якія носяць адзенне з элементамі нацыянальнай сімволікі?» Адказы былі наступныя: гэта людзі, «якія падтрымліваюць нацыянальныя традыцыі» (так адказалі 49,7% рэспандэнтаў), «якія намагаюцца звярнуць на сябе ўвагу» (21,7%), «якія цікавяцца моднымі тэндэнцыямі» (20,6% рэспандэнтаў).

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
nikalaeva@zviazda.by

*Ёсці пададзена!*

# ДЫРЫЖОР СМАКУ

## Чаму страву ядуць найперш вачыма?

**Праца ў сферы грамадскага харчавання толькі на першы погляд лёгкая. Кліенты ў сілу розных аб'ектыўных і суб'ектыўных прычын не заўсёды застаюцца задаволенымі, але ўсё ж імкнуцца да гэтага трэба. Маладому і энергічнаму повару ўздзенскага рэстарана «Нёман» Таццяне КОЗІЧ *(на здымку)* тое ўдаецца.**

— Я вырасла ў вясковай сям'і, дзе была старэйшай з дзяцей: мама працуе настаўніцай, бацька — інжынер-электрык. Пасля заканчэння Суткаўскай школы вырашыла паступаць у сталічны гандлёвы каледж на спецыяльнасць «тэхнік-тэхнолаг грамадскага харчавання». Кухарам хацела стаць з дзяцінства. У дзевяць гадоў прыгатавала сваю першую страву — блінчыкі. Потым зварыла грыбны суп. Родныя былі ў захапленні, — распавядае Таццяна.

Пасля заканчэння каледжа спачатку працавала ў кулінарным цэху райспажыўтаварыства, затым прапанавалі месца тэхнолага. Але работа з дакументамі не для мяне. Я заўсёды хацела гатаваць, ствараць кулінарную казку на талерках. Побач з больш вопытнымі калегамі вучуся разумець і адчуваць людзей. У рэстараннай справе важны кожны нюанс, не толькі тое, наколькі прафесійна і смачна повар прыгатуе страву, але і тое, як афіцыянт падасць яе кліенту. Праца кухара падобна да працы дырыжора, які кіруе вялікім аркестрам, і ад таго, наколькі дакладна і правільна «сыграе» кожны асобны чалавек, залежыць поспех усяго калектыву.



***— Для вас гатаваць — гэта...***

— ...Сэнс жыцця. Я не стаўлюся да працэсу як да працы, не гляджу на гадзіннік, калі закончыцца рабочы дзень. Гатаваць — гэта таксама творчасць. Мне не трэба шукаць натхнення, яно заўсёды ў мяне ёсць. Гэта магчымасць праявіць фантазію і кулінарныя здольнасці.

Увогуле кухар — прафесія, якая патрабуе шмат часу, фізічных і душэўных сіл. Я не ўяўляю, як можна працаваць без душы! Заўсёды прыемна, калі бачыш удзячныя твары наведвальнікаў рэстарана. А ветлівае і культурнае абслугоўванне гарантуюць афіцыянты, усмешка — іх візітная картка пры стасунках з наведвальнікамі.

***— Як прыходзяць ідэі, канцэпцыі, што натхняе?***

— Для таго, каб ствараць, трэба перыядычна цалкам абстрагавацца ад таго, што ты робіш. Лепш за ўсё гэта атрымліваецца на радзіме, калі адпачываеш сярод родных і блізкіх людзей. А вось крэатыўныя ідэі нараджаюцца звычайна ў дынаміцы, а не падчас руцінный працы. Асаблівую ўдзячнасць я хачу выказаць шэф-повару Галіне Ганчарык, якая стала маёй настаўніцай і правадніком у свет кулінарнай казкі. Калі трэба прыгатаваць штосьці неардынарнае, то іду раіцца менавіта да яе. А часам, ва ўмовах стрэсу, мозг знаходзіць простае і геніяльнае рашэнне самастойна. Чым складанейшая сітуацыя, тым больш вытанчанае рашэнне. Асабіста я аддаю перавагу класічнай еўрапейскай кухні. Падабаецца падаваць усё ярка, каб людзі былі здзіўлены, захоплены ўбачаным, бо ў першую чаргу страву ядуць вачыма. Упрыгожванне займае мала часу, было б жаданне.

***— Добрым кухарам можна стаць ці ім трэба нарадзіцца?***

— Можна нарадзіцца, а можна і стаць. Галоўнае — разумець, што ў гэтую секунду ты робіш, адчуваць сам прадукт, зрабіць так, каб ён раскрыў усе свае смакавыя якасці. Некаторыя ідуць вучыцца на кухараў толькі таму, што можна паесці. Але ж бываюць моманты, калі за ўвесь дзень у цябе проста няма на гэта часу. Паспытаць — так, але не паесці.

...Таццяна яшчэ не стала «зоркай» на кулінарным небасхіле, але шмат працуе над тым, каб здзіўляць наведвальнікаў рэстарана новымі і цікавымі стравамі, арыгінальнай падачай. І я веру, што ў яе ўсё яшчэ наперадзе!..

**Дар'я ЗЯНЬКОВІЧ.**

# ПАЧУЦЬ ПЕСНЮ ПЧОЛ



Фота Надзеі БУЖАН.

На трэніровачным дубе бортнік-пачатковец зрабіў свае першыя крокі па дрэве.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

Праз некаторы час «выдаў» другі матэрыял, на гэты раз прысвечаны бортным прыладам. А далей выйшла так, што хлопец пазнаёміўся з польскімі бортнікамі і з'ездзіў да іх на канферэнцыю, дзе паглядзеў дакументальную стужку 1939 года пра бортніцтва...

## ПАЛЕСКІ «АЛЬПІНІЗМ»

Пасля натхняльнай паездкі Іван зразумеў: надышоў час перайсці ад тэорыі да практыкі. Для пачатку задумаў зрабіць лязіва — плеценае прыстасаванне, з дапамогай якога бортнікі залазяць на дрэва.

**Сярод прымхаў быў нават такі: бортнік перад «паходам» на дрэва цягам месяца мусіў не дакранацца да жонкі. Жанчына магла хіба што стаяць унізе ды падаваць інструменты.**

— Вядома ж, паўстала пытанне — як яго плесці? — кажа Іван. — У роднай вёсцы не засталося людзей, якія б змаглі навучыць рамяству. Тэхналогію даводзілася аднаўляць па розных крыніцах. У Тураўскім музеі прыроды Палесся выпадкова заўважыў лязіва, створанае стагоддзе таму. Прыгледзеўся, а пасля, дзякуючы захаваным фотаздымкам, зразумеў, як трэба плесці. Першае лязіва рабіў на працягу пяці дзён, працаваў па дзесяць гадзін. З лязівам дапамог разабрацца патомны бортнік з вёскі Глушкавічы Лельчыцкага раёна Васіль: ён навучыў збіраць «васьмёркамі» гэты «канат».

Іван дэманструе ўжо другую прыладу. Тоўстая моцная «вяроўка» пакідае ўражанне бяспечнасці. Пасля ў арсенале з'явілася і пяшня — долата для выдзёўбвання борці, калоды, якую Іван замовіў у каваля. З лязівам і пяшнёй можна лезці на дрэва.

...Мы выходзім да старога шырокага дуба, які Іван праззваў «трэніровачным». Тут ён зрабіў свае першыя крокі па дрэве. Для дуба хлопец нясе падарунак — бохан хлеба. Аказваецца, на Палессі існавала такое павер'е: без дару бортнік не меў права лезці на дрэва. Лічылася, што магло здарыцца благое — ірвалася лязіва. Для Івана традыцыйныя дзеянні становяцца правіламі, якія ён пераймае.

Бортнік-пачатковец прызнаецца: хутка разабрацца з тэхналогіяй лажання з лязівам па дрэве не ўдалося. Ён пільна, кадр за кадрам, пpаглядваў польскую стужку пра бортнікаў і запамінаў. Узлезшы на дрэва, гаворыць: «У такія моманты адчуваеш, што нас трое — ты, дрэва і лязіва». Такі сабе палескі «альпінізм».



Лезці трэба не спяшаючыся.

## БОРТНІЦТВА Ў... СЕЦІВЕ

Сёлета ў борць да Івана пчолы не засяліліся, але ён ужо адшукаў таму прычыну.

— Дупло я знайшоў добрае, зачысціў, бо калі будзе добрае жытло, знойдуцца і пчолы, — распавядае бортнік. — Далей трэба яго затварбіць — прынесці розных траў, якія даспадобы пчолам. Напрыклад, багун — самая пахучая трава, але я яе не браў, і, здаецца, дарма. Абжылі гэтае дупло восы, што можна лічыць добрым знакам: пчолы будуць пасля.

У борці засяляецца дзікая пчала — палеская ці сярэднярускaя. Пчала-бароўка жыла ў лясах яшчэ два стагоддзі таму. Ёсць малюнкі, як яна выглядала, але цяпер вызначыць яе вельмі цяжка.

Мне ж цікава, ці займаліся бортніцтвам жанчыны, пра што я пытаюся ў Івана. Аказваецца, сведчанняў пра тое не засталося. Можна адшукаць лагічнае тлумачэнне: хіба ўсцягне яна калоду на дрэва, ці залезе самастойна наверх? Але Іван вяртаецца да народнай мудрасці і цытуе: «Пах жанчыны пчолы не любяць». Сярод прымхаў быў нават такі: бортнік перад «паходам» на дрэва цягам месяца мусіў не дакранацца да жонкі. Жанчына магла хіба што стаяць унізе ды падаваць інструменты. Дарэчы, у народзе да бортнікаў ставіліся па-рознаму: прымалі і за знахараў, і за ведзьмароў (не кожны мог лазіць па дрэвах).

— Галоўным у сваёй справе я лічу пчалу, а не мёд, — кажа Іван. — Каб наесціся мёду, трэба не менш за 200 калод. Мая мара — пачуць, як пяе лес. Украінскі пчаляр Мікола Вітвіцкі некалі казаў, што пчаліная матка ўначы ў бары пяе песню, каб пчолы, якія згубіліся, вярнуліся да вулля. Калі гэта праўда, то мне хацелася б яе пачуць.

Пакуль эканаміст спасцігае бортніцтва на практыцы, але развівае і іншы напрамак — «сеціўнае» бортніцтва. Іншымі словамі, ён робіць грунтоўную інтэрнэт-энцыклапедыю: акрамя артыкулаў у «Вікіпедыі», стварыў суполкі ў сацыяльных сетках, сайт «Дрэва сусвету» і нават запусціў першы бортны канал на Youtube. Сам робіць аматарскія відэазапісы, таксама зрабіў вельмі простую і зразумелую інфаграфіку пра бортніцтва. Матэрыялаў назапасіў на цэлую кнігу і прызнаецца, што галоўная мэта яго працы заключаецца ў папулярызацыі забытага промыслу.

Некаторыя пчаляры лічаць бортніцтва неперспектыўным заняткам: маўляў, пчолы сталі свойскімі насякомымі, без дапамогі чалавека ў калодах яны не выжывуць. Але для Івана найперш важна адрадзіць традыцыю, якая перадавалася спакон вякоў. Спадзяёмся, налета ў яго борці з'явяцца доўгачаканыя меданосныя госці.

**Кацярына РАДЗЮК.**

*radziuk@zviazda.by*

*Мінск—Лоеўскі раён—Мінск.*

## А ЯК У СУСЕДЗЯЎ?

У Еўропе выдзяляюць гранты на развіццё бортніцтва. Польскія леснікі займаюцца гэтым старадаўнім промыслам: яны робяць борці на старых дрэвах. Ім не забараняюць дзяўбці старыя дрэвы нават у ландшафтных заказніках. Дарэчы, усе борці палякі пазначаюць на гугл-картах. У Беларусі бортніцтва жыве як традыцыя, якая перадаецца ад майстра да вучня. Ва Украіне яно разглядаецца як частка традыцыйнага промыслу. У Башкартастане існуе запаведнік Шульган-таш, дзе ў калодах жыве абарыгенная бортная меданосная пчала «бурзянка». Гэта пакуль што адзіная ў свеце зона, дзе ахоўваюцца дзікія пчолы.



Разабрацца з лязівам Івану дапамог патомны бортнік з вёскі Глушкавічы Лельчыцкага раёна.

**Филиал «Центр «Белтехинвентаризация»**
**г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2**

- ✓ Оценка оборудования и транспортных средств
- ✓ Оценка недвижимости и сетей всех форм собственности
- ✓ Раздел и вычленение недвижимости и земельных участков

## ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА
## по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, принадлежащих УО «Гомельский государственный университет имени Франциска Скорины», 8(0232) 60 70 51

| № лота | Наименование объекта | Начальная цена продажи лота, бел. руб. (с НДС) | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | - часть капитального строения (здание столовой №3) в составе: помещения подвала площадью 566,67 кв.м, помещения 1-го этажа площадью 629,28 кв.м; часть капитального строения (склад) площадью 109,4 кв.м. Размер арендной платы в месяц составит 1174,81 базовой арендной величины без учета коммунальных услуг. Договор аренды заключается сроком на 3 (три) года. Цель использования: организация питания, розничная торговля, производство продуктов питания;<br>- часть капитального строения (здание столовой №3) в составе: помещения 2-го этажа площадью 625,1 кв.м. Договор безвозмездного пользования помещениями сроком на 3 (три) года для организации питания студентов и организации питания студентов, проходящих оздоровление (лечение) в студенческом санатории-профилактории университета. | 7 048 890 | 704 889 |

| | |
|---|---|
| **Адрес объекта** | **Гомельская обл., г. Гомель, ул. Песина, 74** |
| **Срок подачи заявления** | **По 5 октября 2015 г. в рабочие дни с $9^{00}$ до $17^{00}$ от даты опубликования настоящего извещения по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2** |
| **Дата, время, место проведения аукциона** | **07 октября 2015 г. в 11.00 по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2** |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | р/с 3012105618108 в РД №700 ОАО«БПС-Сбербанк», код 369, УНП 102353509<br>Получатель платежа: Филиал «Центр «Белтехинвентаризация» РУП «Жилкоммунтехника» |
| **Условия продажи** | Цены указаны с НДС. Шаг аукционных торгов – 5%, заключить договор аренды в течение 10-ти календарных дней после подписания протокола о результатах аукциона, оплатить стоимость права аренды согласно договора аренды. Победитель возмещает затраты на организацию и проведение аукциона. |

Для участия в аукционе необходимо:

1. **Оплатить задаток на расчетный счет Организатора аукциона (Филиал РУП «Жилкоммунтехника» «Центр «Белтехинвентаризация») р/с 3012105618108 в РД №700 ОАО «БПС-Сбербанк», код 369, УНП 102353509 по 05 октября 2015 года от даты опубликования настоящего извещения.**

2. **Подать заявление Организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2, по 05 октября 2015 года в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 от даты опубликования настоящего извещения.**

К заявлению прилагаются следующие документы:

- заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на расчетный счет, указанный в извещении (информационном сообщении);

- индивидуальным предпринимателем – копия (без нотариального засвидетельствования) свидетельства о государственной регистрации; юридическим лицом – доверенность, выданная представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), а также копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации юридического лица; иностранным юридическим лицом, иностранной организацией, не являющейся юридическим лицом, созданной в соответствии с законодательством иностранных государств, иностранным государством и их административно-территориальными единицами в лице уполномоченных органов, международной организацией – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов, выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией; представителем иностранного инвестора – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности иностранного инвестора, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, без нотариального засвидетельствования; гражданину Республики Беларусь – копия паспорта и копия договора на открытие текущего (расчетного) счета (в случае отсутствия у физического лица текущего счета – необходимо его открыть); представителем гражданина Республики Беларусь или индивидуального предпринимателя – доверенность, заверенная нотариально.

При подаче документов на участие в торгах граждане Республики Беларусь, иностранные граждане, физические лица (граждане Республики Беларусь и лица без гражданства), постоянно проживающие за пределами Республики Беларусь, в том числе представители юридических лиц Республики Беларусь, представители иностранных инвесторов предъявляют паспорт.

В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, объекты аукциона продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5%.

Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие в них. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается Организатором аукциона в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов.

Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор аренды в срок не позднее 10 календарных дней от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить право аренды в сроки, определенные в договоре аренды и возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в т.ч. расходы по изготовлению и предоставлению участникам аукциона документации, необходимой для его проведения в течение 3(трех) рабочих дней. Информация о затратах, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников до начала аукциона. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору аренды.

**Дополнительная информация по тел.: (0232) 75 06 62, 75 06 63 (факс), сайт www.bti.by**

**Центр Промышленной Оценки**

- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, офис 1703.** |
| **Продавец** | **ОАО «Плещеницлес», Минская обл., Логойский р-н., г.п. Плещеницы, ул. Октябрьская, 47.** |

**Предмет аукциона**

| *Наименование* | *Тип ТС* | *Год выпуска* | *Двигатель (тип)* |
|---|---|---|---|
| **Лесовоз на базе шасси Камаз с гидроманипулятором Fiskars 65 (2502 АМ-5)** | **грузовой специальный лесовоз** | **1990** | **дизель** |

**Начальная цена с НДС 20% – 121 564 800 бел. руб.**

**Задаток 10% от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с №3012343260010; нерезидентами РБ в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – 3012343265044; в евро (EUR) – 3012343265060; в российских рублях (RUB) – 3012343265028; в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области, БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение **10** (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также порядок оплаты вознаграждения и фактических затрат на организацию и проведение аукциона оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by.**

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения аукциона** | **27.10.2015 в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки».** |
| **Дата и время окончания приема документов** | **26.10.2015 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки».** |
| **Контактная информация** | **Тел.: +375 17-280-36-37; +375 29-183-69-71. www.cpo.by E-mail: auction@cpo.by.** |

Утерянное страховое свидетельство «Обязательное страхование гражданской ответственности владельцев транспортных средств на территории Республики Беларусь» серии ВА № 4430167 в количестве 1 штуки в Представительстве Белгосстраха по Минскому району **считать недействительным.**

УНП 600013344

В **суд Мозырского района Гомельской области** поступило заявление об объявлении умершим БАКУРИНА Владимира Николаевича, 12 мая 1966 года рождения, уроженца с-за Тюрнясевский Октябрьского района Татарской АССР Российской Федерации, проживавшего по последнему известному адресу: Гомельская область, г. Мозырь, пер. Коллективный, 16, к. 320.

Просьба ко всем гражданам и юридическим лицам сообщить в суд Мозырского района в течение 2-х месяцев со дня публикации имеющиеся сведения о Бакурине В.Н.

# УП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ»
## извещает о проведении 27 октября 2015 г. аукционных торгов по продаже права заключения договоров аренды имущества в рамках 174-го открытого аукциона по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной и иной собственности

| № предмета аукциона | Местонахождение имущества | Площадь (кв.м) | Размер коэффициента к базовой ставке арендной платы или размер арендной платы | Начальная цена права заключения договора аренды имущества (руб.) | Целевое использование имущества | Сумма задатка (руб.) | Характеристика имущества |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **Арендодатель – ГУ «Главное управление по обслуживанию дипломатического корпуса и официальных делегаций «Дипсервис»**, *тел.: +375 (17) 210 12 31, +375 (17) 210 17 58, +375 (17) 284 49 23, +375 (17) 284 70 56* | | | | | | | |
| 125 | г. Минск, ул. Пулихова, 31/1-1н | 295,8 | 3,0 | 8 874 000 | Под административные цели (офис) | 887 000 | Изолированное помещение 1н. Срок аренды – 3 года. |
| **Арендодатель – УП «Комплекс по оказанию услуг имени П.М. Машерова»**, *тел.: +375 (17) 306 47 35, +375 (17) 219 48 21* | | | | | | | |
| 126 | г. Минск, ул. Немига, 42 | 12,24 | 0,5 БАВ за 1 кв.м | 367 200 | Машино-место | 36 000 | Изолированное помещение, машино-место №17. Срок аренды – 3 года. |
| **Арендодатель – РУП «Белорусский институт строительного проектирования»**, *тел.: +375 (17) 226 42 12, +375 (17) 226 42 11* | | | | | | | |
| 127 | г. Минск, ул. Смоленская, 15 | 51,9 | 2,0 | 1 557 000 | Под административные цели (офис) | 155 000 | Кабинет № 39 на 10 этаже 13-этажного здания. Срок аренды – 3 года. (51*) |
| | *51* Имеется естественное освещение, отопление, электроснабжение, кондиционер. Помещение после ремонта. Санузел и вход совместный с другими арендаторами.* | | | | | | |
| **Арендодатель – УП «Белтрансавтоматика»**, *тел.: +375 (17) 225 53 47, +375 (17) 225 62 86* | | | | | | | |
| 128 | г. Минск, ул. Московская, 7 | 82,8 | 3,0 | 2 484 000 | Под административные цели (офис), за исключением размещения общественных объединений, коллегии адвокатов, центров поддержки предпринимательства; склад и иные цели по согласованию с арендодателем | 248 000 | Помещение 2Н в подвале жилого здания с отдельным входом, оснащено центральным отоплением, водопроводом, канализацией, телефонной связью, кондиционером, пожарной сигнализацией, частично естественным освещением. Срок аренды – 5 лет. |
| **Арендодатель – УП «Минское отделение Белорусской железной дороги» отдел материально-технического снабжения,** *тел.: +375 (17) 225 01 80, +375 (17) 225 35 80* | | | | | | | |
| 129 | Минская обл., г. Молодечно, ул. Либаво-Роменская, д. 58А | 1345,2 | 3,0 | 12 106 800 | Под размещение работников, под складские помещения | 1 210 000 | Комплекс зданий. Года постройки: склад арочный – 1995, зданий кладовой – 1944, здание уборной – 1949, проходная – 1994, контора кладовых – 1954. Срок аренды – 5 лет. (52*) |
| | *52* Текущий ремонт помещений конторы кладовых и проходной произведен в 2011 году. Комплекс зданий окружен забором, имеется проходная, два отдельных въезда для заезда транспорта, оборудованных воротами. Отопление местное, сан. узел – на улице. Контора кладовых оснащена умывальником с технической водой. Общая площадь земельного участка – 2,658 га. Участок оснащен пожарным водоемом. Все помещения (кроме уборной, склада арочного) имеют естественное освещение. Все помещения имеют искусственное освещение. Имеется пожарная сигнализация. Отсутствует охрана. Помещения не используется с мая 2015 года. Здания сдаются в аренду с печью-камином и котлом отопительным по отдельно заключаемому договору.* | | | | | | |

БАВ – базовая арендная величина (с 01.04.2015 составляет 120 000 рублей).

**Договор аренды заключается по предметам аукциона:**

**- №№ 125 – 127 – на 3 года.**

**- №№ 128, 129 – сроком на 5 лет;**

**Организатор аукциона – УП «Минский городской центр недвижимости», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 10.**

**Аукцион состоится 27 октября 2015 г. в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.**

Возможность **осмотра Имущества**, право заключения договора аренды которого выставлено на аукцион, **обеспечивает арендодатель**. Организатор аукциона настоятельно рекомендует лицам, желающим участвовать в аукционе, уточнять у арендодателя возможность использования объекта под планируемые виды деятельности (в том числе с учетом требований санитарных и противопожарных норм), а также размер коммунальных платежей.

Аукцион проводится в порядке, предусмотренном Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 № 1049, а также иными актами законодательства.

Участвовать в аукционе могут юридические и физические лица, включая индивидуальных предпринимателей.

**Лицо, желающее принять участие в аукционе:**

- уплачивает задаток (юридические лица и индивидуальные предприниматели оплату производят **платежным поручением**!) по соответствующему предмету торгов (назначение платежа – **задаток для участия в аукционе № 174 от 27.10.2015 по предмету аукциона № _____**), перечисляемый на расчетный счет № 3012104971019 в региональной дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанк», код 153001369, УНП 190398583, УП «Минский городской центр недвижимости» (сумма задатка по каждому предмету торгов указана в соответствующей графе таблицы). **Сумма задатка для участия в аукционе должна быть внесена в срок, установленный для приема документов;**

- подает организатору аукциона заявление на участие в аукционе с приложением следующих документов (бланк заявления можно получить у организатора аукциона):

***юридическое лицо – резидент Республики Беларусь:***

копии документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица;

копии **платежного поручения** о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона;

***юридическое лицо – нерезидент Республики Беларусь:***

легализованной в установленном порядке копии учредительных документов и выписки из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иного эквивалентного доказательства юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения;

копии **платежного поручения** либо иного документа о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона;

***индивидуальный предприниматель:***

копии документа, подтверждающего государственную регистрацию индивидуального предпринимателя;

копии **платежного поручения** о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона;

***физическое лицо*** – копии платежного документа о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона;

- заключает с организатором аукциона соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (далее – соглашение), бланк которого можно получить у организатора аукциона.

При подаче заявления на участие в аукционе с прилагаемыми документами и заключении соглашения:

физическое лицо, индивидуальный предприниматель предъявляют организатору аукциона документ, удостоверяющий личность;

представитель физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица предъявляет организатору аукциона оригинал доверенности (документ, подтверждающий полномочия должностного лица), документ, удостоверяющий личность.

**Прием документов** и консультации по вопросам участия в аукционе **осуществляются с 24 сентября 2015 г. по 21 октября 2015 г. включительно в рабочие дни с 9.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.**

Ответственность за достоверность сведений, указанных в документах, представленных для участия в торгах, несут лица, их подавшие.

**Заявления на участие в аукционе, поступившие после установленного срока, не рассматриваются.**

**Порядок оформления участия в аукционе:** лицу, допущенному к участию в аукционе, организатор аукциона выдает билет участника аукциона, в котором указывается порядковый номер, под которым данное лицо зарегистрировано. *При отсутствии у лица, желающего участвовать в аукционе, текущего (расчетного) счета в учреждении банка, он должен быть открыт до подачи заявления на участие в аукционе и указан в заявлении.*

**Порядок определения победителя аукциона:**

- торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены и проводятся аукционистом, определяемым организатором аукциона;

- аукцион продолжается до тех пор, пока по новой объявленной аукционистом цене аукционный номер поднимает только один участник аукциона или пока не останется только один участник, предложивший наиболее высокую цену. Аукционист трижды называет цену, по которой продан предмет аукциона, и объявляет о продаже данного предмета аукциона, а также сообщает номер участника аукциона, выигравшего аукцион по данному предмету аукциона (далее – победитель аукциона).

**Размер штрафа, уплачиваемого участником аукциона и (или) его победителем (приравненным к нему лицом) в случаях, предусмотренных законодательством и соглашением, составляет 18 000 000 рублей.**

Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) в течение 3 рабочих дней со дня его проведения обязан в установленном порядке перечислить **на текущий (расчетный) счет арендодателя** сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом внесенной им суммы задатка, а также возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение. **Информация о затратах доводится до сведения участников перед началом аукциона**.

***Важно!*** *Договор аренды по результатам аукциона может быть заключен исключительно с участником аукциона, ставшим победителем (приравненным к нему лицом). Заключение договора аренды помещения, целевое назначение которого предполагает осуществление предпринимательской деятельности, с субъектом, который в силу законодательства не может осуществлять названную деятельность, не допускается.*

**Договора аренды имущества должны быть заключены в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона и подписания протокола аукциона.**

**Телефоны для справок:** отдел аукционов – + 375 (17) 327 40 22, **отдел аренды** – + 375 (17) 327 41 70, 327 47 29, 328 36 57, **бухгалтерия** – + 375 (17) 328 36 58.

**Интернет: www.mgcn.by.**

*Шкілет у шафе*

# ПРЫГОЖЫЯ ДА ЖАХУ,

## альбо Крывое люстэрка анарэксіі



**У 2008 годзе італьянская марка адзення Nolita, якая ўваходзіць у групу Flash & Partners, пачала кампанію пад назвай No Anorexia. На фота 27-гадовая француженка Ізабэль Каро, якая на той момант адчайна змагалася з анарэксіяй (пры росце 1,65 метра важыла 33 кілаграмы). Здымаў дзяўчыну скандальны італьянскі фатограф Аліўера Таскані.**

**Мала хто любіць адкрыта гаварыць пра свае хваробы з чужым чалавекам. З Марынай я пазнаёмілася праз сацыяльную сетку. Напаўненне асабістай старонкі можа многае расказаць пра чалавека. У дзяўчыны на ёй было мноства «паблікаў», рэкламы, інфармацыі пра дыеты, цудадзейныя пілюлі і напоі, якія спрыяюць зніжэнню вагі. А вось асабістых фота на старонцы не было. Маю прапанову сустрэцца дзяўчына рашуча адхіліла, але праз нейкі час усё ж пагадзілася адказаць на пытанні, але толькі ў завочна-друкаваным фармаце. Вось ужо паўтара года, як сямнаццацігадовая Марына змагаецца з анарэксіяй...**

Ідэя пахудзець захапіла яе ў 15 гадоў. Пасля санаторнага лячэння дзяўчына трохі паправілася, і калі прыйшла ў родную школу, аднакласніцы сталі шаптацца: «Марына так патаўсцела, на карову стала падобная». Тады, як прыгадвае яна, у яе зямля ўцякла з-пад ног. Паколькі вагаў дома не было, дзяўчына стала круціцца каля люстэрка, і чым больш яна ўглядалася, тым мацней пераконвалася ў праваце школьных «сябровак». Апошняй кропляй стала заўвага каханага хлопца. Той у жартаўлівай форме паляпаў дзяўчыну па шчочцы, назваўшы «хамячком»... Гэта цяпер Марына разумее, што асаблівай прыбаўкі ў вазе ў яе ніколі і не было. Так, трохі паправілася, але асяроддзе адрэагавала жорстка. Паколькі раней дзяўчына ніколі спецыяльна не худзела, то і не ведала, як гэта зрабіць без шкоды для здароўя.

Самым эфектыўным на той момант падалося звычайнае галаданне. Устаноўка была на кубак зялёнай гарбаты і некалькі галет за суткі. Маці шмат працавала, таму адразу не заўважыла асаблівых змен у харчаванні дачкі. Айчым ніколі не цікавіўся жыццём Марыны, а пры зручным выпадку стараўся яе зняважыць. З кожным днём Марына ўсё больш сыходзіла ў сябе, адносіны з аднакласнікамі зусім сапсаваліся. «Я зненавідзела сябе, зненавідзела ўсё сваё асяроддзе, галаданнем я хацела як бы адпомсціць ім за прычыненыя крыўды», — дзеліцца мая суразмоўца.

Кілаграмы «раставалі», але радасці Марына чамусьці не адчувала. «Я глядзела на сябе і бачыла тую самую «тлустую карову», дыеты цалкам завалодалі мной», — распавядае дзяўчына. «Мама вельмі моцна перажывала, мне і цяпер сорамна перад ёй...» — і шмат сумных смайлікаў. Адчувала дзяўчына сябе жудасна, у яе прапалі «крытычныя дні», валасы проста сыпаліся. Праз чатыры месяцы Марына пагадзілася на шпіталізацыю...

Анарэксія ўжо даўно ступіла з подыумаў у падлеткавае асяроддзе і зламала нямала лёсаў. Пікавасць захворвання прыпадае на ўзрост 13—20 гадоў. Ахвяры — пераважна дзяўчаты. Калі мы паспрабуем намаляваць псіхалагічны партрэт анарэксіка, то, магчыма, заўважым такія якасці, як перфекцыянізм, або «сіндром выдатніка», педантызм, упартасць. Да асноўных прычын медыкі звычайна адносяць сацыяльную дззадаптацыю і біялагічную пераемнасць, акцэнтуючы ўвагу ўсё ж такі на псіхалагічных фактарах.

**Урач-псіхатэрапеўт цэнтра пагранічных станаў Мінскага гарадскога клінічнага псіхіятрычнага дыспансера Алена КАЯН:**

— На станаўленне паўнавартаснай асобы велізарны ўплыў аказвае блізкае асяроддзе — сям'я. У зоне рызыкі знаходзяцца дзеці, якія выхоўваюцца ва ўмовах непахіснага аўтарытэту аднаго з бацькоў, пастаяннага кантролю, пакеплівання. Немалы ўклад у фарміраванне светапогляду маладых людзей адыгрываюць сучасныя СМІ. Тыя ж глянцавыя часопісы рэкламуюць хваравітую худнечу як ідэал прыгажосці, але замоўчваюць пра паслугі фоташопа. Пры анарэксіі адбываецца бачнае парушэнне схемы цела. Хворы і бачыць, і адчувае сябе тоўстым. Закранаецца вобраз мыслення, а гэта цяжка паддаецца карэкцыі.

Хвароба цалкам завалодвае ахвярай, прымушаючы яе ўсё з большай стараннасцю вылічваць спажытыя калорыі. Адной з самых распаўсюджаных памылак тых, хто худнее, з'яўляецца ўжыванне прадуктаў з мінімальным працэнтам тлушчу. Возьмем, напрыклад, дзве ўпакоўкі кефіру — тлустасцю 3,2% і 1,5%. Як толькі прадукт абястлушчваецца, ён аўтаматычна страчвае тэрмін годнасці. Для таго, каб яго падоўжыць, выкарыстоўваюцца кансерванты, узмацняльнікі смаку, эмульгатары і г.д. Кожная з гэтых дабавак мае сваю каларыйнасць, таму 1:0 — на карысць кефіру з 3,2% тлушчу.

Другой не менш важнай памылкай з'яўляецца рэзкае галаданне. Людзі думаюць, што калі нейкі час не будуць есці зусім, то ўвесь лішні тлушч «растане» ледзьве не на вачах. Але ва ўмовах галадання арганізм можа існаваць вельмі абмежаваны час, які залежыць ад колькасці і якасці яго запасаў. Калі паступленне ежы спыняецца, арганізм пераходзіць на эндагеннае харчаванне — ужывае ўласныя запасы. Можна сказаць — «есць сам сябе». Арганізм пачынае расшчапляць уласныя тканкі дзеля атрымання энергіі. У першую чаргу расходуюцца запасы вугляводаў — глікаген, які патрэбен для функцыянавання цела і мозга. Запасы глікагена вельмі хутка заканчваюцца. Далей, каб сілкаваць мазгавыя клеткі і чырвоныя клеткі крыві, арганізм вырабляе неабходную для іх глюкозу, пераўтвараючы гліцэрын, што змяшчаецца ў тлушчавай тканцы, і расшчапляючы амінакіслоты, якія знаходзяцца ў мышачных тканках. Калі ўсе запасы глюкозы ў арганізме цалкам вычарпаны (а гэта адбываецца прыкладна на трэці дзень галадання), пячонка пачынае выпрацоўваць кетоны. На гэтай стадыі, калі ўзровень глюкозы вельмі нізкі, пачынаецца працэс, што называецца кетозісам. Дзякуючы яму мозг, мышцы і сэрца яшчэ атрымліваюць нейкую энергію.

**Урач-дыетолаг мінскага медыцынскага цэнтра «Гарызонт» Наталля ДАВЫДАВА:**

— Арганізм рэагуе на стрэсы мабілізацыяй усіх рэсурсаў для выжывання. Пры наяўнасці запасаў лягчэй перанесці голад, таму галаданне прыводзіць не да змяншэння колькасці тлушчу, а да яго паскоранага назапашвання. Недарэчна імкнуцца адпавядаць заяўленым стандартам 90—60—90. У кожнага з нас розны шкілет, аб'ём груднай клеткі.

Анарэксія нясе ў сабе страту важных для арганізма мікраэлементаў, парушаюцца электралітныя працэсы. Страўнікавы сок, што выдзяляецца, пашкоджвае зубы. Зніжаецца сексуальная сіла. У дзяўчат знікаюць «крытычныя дні». Могуць не развівацца другасныя палавыя прыкметы. У стацыянарах хворыя праходзяць курс псіхатэрапіі і прымаюць антыдэпрэсанты. У цяжкіх выпадках іх кормяць унутрывенна або праз катэтар...

*Што на відэльцы?*

# МОРКВА НА СНЯДАНАК, СЛІВЫ НА АБЕД



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

**Неяк, бавячы час у сацыяльнай сетцы, я натрапіла на свайго даўняга сябра. Як не сустрэцца? І вось мы ўжо ва ўтульнай кавярні вывучаем меню. Раптам хлопец пляскае ім па століку і выдае: «Я буду салат з садавіны і ваду». Мары аб смажаным стэйку з печанай бульбай у той вечар так і не спраўдзіліся: мы сядзелі насупраць адно аднаго і моўчкі елі ківі...**

**А потым сябра расказаў, што вось ужо год, як яго рацыён складаюць толькі гароднiна і садавіна, прычым тры чвэрці іх тэрмічна не апрацоўваюцца. Такі тып харчавання называецца фруктарыянствам і з'яўляецца разнавіднасцю сыраедзення. Нельга ўжываць харчовыя дабаўкі, спецыі, узмацняльнікі смаку, але можна есці арэхі і сухафрукты. Прычына для пераходу да фруктарыянства можа быць рознай. Для майго суразмоўцы — этычная, на якой грунтуецца мірнае суіснаванне ўсяго жывога. Хлопец падзяліўся, што, дзякуючы пераходу на такі тып харчавання, ён скінуў сем кілаграмаў, стаў менш хварэць на прастуду. Пасля гаворкі з ім я загарэлася жаданнем на сабе выпрабаваць такі рацыён. Для эксперыменту адвяла тыдзень, завяла асабісты дзённік, каб усё фіксаваць, і схадзіла ў краму па сакавітую правізію. Праўда, увечары напаследак вырашыла паесці смажанай курыцы з макаронай...**

## Дзень першы

На сняданак у мяне былі свежавыціснуты маркоўны сок і жменька ягад. Ну, што тут можна сказаць, трохі падмацавалася — і добра. Прыйшла на працу і вось тут пачалося... Найперш даўілася адмовіцца ад ранішняй кавы з печывам, што ўжо даўно стала нашай з сяброўкай традыцыяй. Прайшло дзве гадзіны, і тут мой страўнік распачаў са мной «гутарку». На гэты выпадак у мяне быў падрыхтаваны яблык. Падчас абеду калегі пачалі распакоўваць «ссабойкі», а я нясмела дастала падрыхтаваны зранку два бананы, гронку зялёнага вінаграду, трошкі курагі і чарнасліву. Усе вырашылі, што ў мяне разгрузачны дзень, таму з роспытамі асабліва не дакучалі. Да шасці гадзін я з'ела яшчэ адзін яблык і дома ўжо прыгатавала гарбузовы суп. Страва гэтая, я вам скажу, так сабе. Уявіце перамолаты ў блендары гарбуз, а зверху трохі арахісу з кунжутам... Перад сном выпіла шклянку вады і хутчэй лягла спаць. Мне здавалася, быццам я ўжо стала больш фізічна падцягнутай, больш лёгкай. Я задаволена ўцягвала жывот і ўзуляла, як ўлезу ў старыя джынсы...

## Дзень другі

Зранку выпіла шклянку вады і пачала збірацца на працу. Праз паўгадзіны настаў час сняданку. Адзін зеленаваты банан і два спелыя персікі — вось і на стол сабрала. На працы ўсё было, як учора: яблыкі, вішня, трохі капусткі. Вечарам патэлефанавала сяброўка і прапанавала схадзіць у кавярню. Давялося адмовіцца. Ноччу ніяк не магла заснуць, чамусьці пачала прыгадваць, хто што мне такога за дзень сказаў... А яшчэ захацелася з'есці бутэрброд. Ну такі, ведаеце, звычайны, з варанай каўбасой, нават без сыру. Неяк не радаваў ужо і трохі ўпалы жывот. Але я супакойвала сябе: хлопец той неяк жа трывае, дык і я змагу.

## Дзень трэці

Ранак прайшоў як звычайна: вада, слівы і персік. Па дарозе на працу купіла велізарны кавун і пацягнула яго за сабой у офіс. Але ўвечары не было сіл глядзець ні на яго, ні на ўсю садавіну. Прыгатавала сабе капусны сок, зрабіла некалькі глыткоў, а астатняе выліла ў ракавіну. У жываце ўсё булькала, гуло, давялося даставаць медыкаменты...

## Дзень чацвёрты

Вырашыла налягаць на агародніну. На сняданак — летняя салата: агуркі, памідоры, перац, нават пятрушку дабавіла, з якой у мяне даўно так сабе «адносіны». Усё гэта трэба было есці без хлеба і ўсякіх прыпраў, але я трошкі адышла ад правіла і крыху пасаліла салату. Пару глыткоў вады — і я зноў «на кані». Але зменлівасць настрою не давала нармальна працаваць, людзі раздражнялі, я пачала прыглядацца, хто што есць... Вечарам, ідучы дадому, я прагна лавіла водар свежага печыва, які ішоў з утульных піцырый і кавярняў. А дома давілася пацягваць праз трубачку свежавыціснуты бурачны сок (з капусным, як вы памятаеце, у мяне «не склалася»).

## Дзень пяты

...Зранку ўсё тая ж летняя салата. На абед некалькі лустачак дыні і грэйпфрут. Калегі ўжо здзіўлена паглядвалі на мяне, выказваючы асцярогу наконт здароўя. А хтосьці жартаваў і прапаноўваў для большага эфекту падчас перапынкаў у працы скакаць на скакалцы, бо ўсе вырашылі, што я хачу пахудзець. За гэтыя дні мне надакучыла звычайная садавіна і агародніна і захацелася нечага экзатычнага. Я купіла сабе авакада, какос і лайм. Ну, магу сказаць, што з экзотыкай жыць весялей. Какосавае малако дастаткова каларыйнае, таму пачуцця голаду ўжо не было, але цана на гэтыя прысмакі кусаецца. Сок лайма падышоў у якасці заправкі да салатаў. У нядзелю я лягла спаць як мага раней, каб хутчэй паставіць кропку ў гэтым эксперыменце.

...Ніякага пазітыўнага ўплыву, акрамя пары скінутых кілаграмаў, я на сабе больш не адчула. Мой сябра запэўнівае, што першыя два тыдні — самыя цяжкія: пастаянна хочацца катлет са смажанай бульбачкай. Але цяпер ён і думаць не думае пра гэта. Зімой, бывае, цяжка знайсці патрэбныя прадукты, тады на дапамогу прыходзяць сухафрукты. Пахудзенне праз фруктарыянства дасць хуткі вынік, але такі рэзкі скачок можа прывесці да абвісання скуры. Наогул важна памятаць: тое, што пайшло на карысць аднаму, можа нашкодзіць другому. Слухайце свой арганізм, і ён адкажа вам тым жа.

Рэцэпт ад фруктарыянца

**РАФАЭЛКІ**

***Спатрэбіцца:*** *банан, 20-25 фінікаў, 250 грамаў ядраў грэцкіх арэхаў, 150 грамаў міндалю, пяць абрыкосаў і какосавая стружка.* ***Гатаванне:*** *усе кампаненты здрабніць, змяшаць і абкачаць у стружцы. Усярэдзіну кожнай рафаэлкі можна пакласці арэшак або курагу. Смачна есці!*

Каментарый спецыяліста

**Марына ПАПОВА, галоўны пазаштатны дыетолаг Міністэрства аховы здароўя:**

— Штодня чалавеку належыць з'ядаць 400 грамаў садавіны пры адсутнасці алергічных рэакцый, супрацьпаказанняў з боку страўнікава-кішачнага тракту. Няма нічога дрэннага, калі адмова ад прадуктаў жывёльнага паходжання носіць аднадзённы характар. Простыя вугляводы хутка ўсмоктваюцца ў кроў, у выніку чаго рэзка павышаецца цукар у крыві і чалавек адчувае сябе значна лепш. Аднак стан касцей, мышцаў, работа ферментаў, гармонаў залежыць ад паступлення з ежай у арганізм жывёльнага бялку. Расліны бялок адрозніваецца ад жывёльнага, а некаторыя незаменныя амінакіслоты знаходзяцца толькі ў жывёльнай ежы. Працяглая адмова ад мяса можа абярнуцца для арганізма бялковым галаданнем.

**Матэрыялы паласы падрыхтавала Алёна ЯКАВЕНКА, студэнтка V курса Інстытута журналістыкі БДУ.**

SEX-БАЛЯСЫ

# СВОЙ МАТЫЎ — БЛІЖЭЙ ДА ЦЕЛА...

**Мы ўжо коратка паведамлялі пра тое, што ў Кітаі ўкаранілі новы незвычайны спосаб матывацыі праграмістаў і павышэння прадукцыйнасці іх працы. Інтэрнэт-кампаніі пачалі наймаць прыгожых дзяўчат, каб падымаць настрой работнікам. Фактычна яны выконваюць ролю офісных чырлідараў, ствараючы вясёлую рабочую атмасферу, купляюць праграмістам сняданкі і гуляюць з імі ў пінг-понг. Усё гэта, на думку менеджараў па персанале, настройвае работнікаў (пераважна мужчынскага полу) на эфектыўную працу. («Мужчына, чаго вы на мяне так утаропіліся? Хопіць ужо, вы ж мяне позіркам раздзяваеце!» — «Ну што вы, што вы... Вы ж адзяваецеся, а я куру...»)**



Фота Надзеі БУЖАН.

Ну, наконт таго, што вынаходка належыць кітайцам, я паспрачаўся б. Ведаю, што ў нашых сталічных інтэрнэт-кампаніях даўно існуе традыцыя, напрыклад, заказваць сушы, якія супрацоўнікам-мужчынам разносяць прыгожыя дзяўчаты топлес. Дарэчы, як думаеце, можа, менавіта з гэтай прычыны праграмісты так няблага зарабляюць? («Дрэнна без дзяўчат...» — «Дрэнна без дзяўчат — гэта добра. Вось калі добра без іх — гэта ўжо дрэнна»). Таму тэма падалася нам вартай увагі, што дало падставы пагаварыць пра матывацыю больш падрабязна. Бо штó, як не яна, рухае ўсіх і ўсё наперад?.. («Ёсць мэта? Ідзі да яе! Не атрымліваецца? Тады паўзі да яе! Не можаш? Лажыся і ляжы ў яе кірунку!»). І, магчыма, за рэдкім выключэннем матывацыі патрэбны глядач ці слухач. Праўда, у гэтым выпадку ўсё — дзеля працэсу. Як там у рамантычнай камедыі «Кейт і Леа» адзін герой павучаў другога, як трэба дамагацца ўвагі дзяўчыны? «Навошта мыць посуд, калі гэтага ніхто не бачыць?» Маўляў, закладзі ўсё загадзя ў пасудамыйную машыну, а як толькі яна зойдзе, на яе вачах націсні кнопку.

Вось куды вы скіруеце позірк, убачыўшы, напрыклад, Анастасію Валачкову? (Ну, як жа без гэтага нястомнага ньюсмейкера эратычнага фронту?) Не хвалюйцеся, яна сама падкажа: дзе б колішняя балерына ні знаходзілася, яна абавязкова дэманструе сваю расцяжку. («Мужчына робіць 70 працэнтаў з таго, што абяцаў зрабіць. Жанчына робіць 70 працэнтаў з таго, чаго абяцала не рабіць»). Апошнім разам не ўстрымалася, развяла ногі ў бакі ў... паветры. Ведаеце такую забаўку, калі парашут чапляюць за маторку, якая і цягне яго? Ну вось, парадавала курортнікаў. Іншая тэледзіва, Анфіса Чэхава, вельмі ганарыцца сваёй «фігурыстай» фігурай. Нядаўна яна абвясціла вайну худнечы, заявіўшы, што дыетамі сябе не вымотвае («Пайшла купляць сукенку. Не ўлезла! Настрой сапсаваўся — купіла торцік. Улез, гад...»). І спортам занялася выключна дзеля таго, каб стаць у выніку, як сама ж напісала у сеціве, «бройлерный куражкай» («Чорны колер робіць стройнай толькі да 48-га памеру. Далей ён ужо нічым не дапаможа»). А Наташа Каралёва што зрабіла, ведаеце? Сэлфі ўласнага дэкальтэ, прычым размясціла камеру так, што яе пышны бюст ледзьве не выскоквае з экрана. (Разам спяваем на манер вядомай песенькі: «Говорят, не повезёт, если грудь размером меньше, чем живот...»). Не паспела яна выкласці фота для ўсеагульнага прагляду, як інтэрнэт тут жа адрэагаваў, як той казаў, секануў крапівою. («Убачыў загаловак у газеце: «Королева оправдалась за свои интимные фото». Няўжо, думаю, англійская каралева вырашыла ўспомніць маладосць? Прыглядзеўся... А, не — гэта Наташка».)

А вы чулі, што нядаўна ў Гродне адна абутковая крама правяла акцыю, падчас якой можна было бясплатна (пах матывацыі ўжо адчуваеце ў паветры?) разжыцца новай парай абутку? Была, праўда, адна ўмова: па боты ці чаравікі трэба было прыйсці ў купальным касцюме. І яшчэ. Па ўмовах акцыі праводзілася фатаграфаванне пакупнікоў у гэтых самых купальных касцюмах і новым абутку з наступным выкладаннем здымкаў у сацыяльных сетках. І што б вы думалі — знайшліся ахвотныя і сярод жанчын (нават цяжарная была), і сярод мужчын! («Спадарожніка жыцця трэба выбіраць не па супадзенні інтарэсаў, а па супадзенні любімых смяротных грахоў»). У купальніках і плаўках яны без кропелькі сарамлівасці дэманстравалі на камеру выбраныя абновы... Гэта пры тым, што фігуры некаторых былі далёкімі ад ідэальных («Калі ўбачыла сваю вагу на шкале вагі, міжволі ўсвядоміла, што надпіс на цукерках «кароўка» — гэта зусім не назва, а папярэджанне»). З гэтай нагоды тут жа разгарнулася дыскусія на тэму «ну, на пляж жа мы менавіта так ходзім». Давайце яшчэ разам прыгадаем, чаму б не ў такім кантэксце? Але ж галоўнае, на мой погляд, у іншым. Раней пра падобныя «акцыі» мы ведалі выключна з замежнага досведу. А цяпер, выходзіць, тыя самыя замежнікі могуць пра беларусаў сказаць словамі Шуры Балаганава з «Залатога цяляці»: «Пазнаю, пазнаю брата Колю!» Можна колькі заўгодна спрачацца пра тое, была гэта «хвіліна славы» ці «хвіліна ганьбы» для тых людзей, але бясспрэчна адно: пах дармавога пазбавіў іх комплексаў не горш за ласкавае сонейка («Бублік, атрыманы на халяву, па смакавых якасцях набліжаецца да круасана»). Дарэчы, краму зачынілі на некалькі гадзін раней звычайнага: наведвальнікі тэлефанавалі родным, знаёмым, ехалі дадому пераапранацца або адразу распраналіся на месцы. Кіраўніцтва гандлёвага аб'екта спужалася натоўпу, і «атракцыён нечуванай прагнасці» быў спынены. Ці вы лічыце, што гэта было нешта іншае?..

**Кастусь ХАЦЕЛАЎ-ЗМАГЕЛАЎ.**

# «Не думаю, як прадаць сябе...»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

***— Ствараючы музычны прадукт, вы думаеце пра тое, ці зможаце зарабіць?***

— На мой погляд, артысту не варта думаць пра грошы ў першую чаргу. Ёсць жа менеджар, канцэртны дырэктар... Той, хто піша музыку, перш за ўсё павінен думаць пра творчасць. Зразумела, ствараючы песню, я задумваюся, ці спадабаецца яна слухачам, ці возьмуць яе ў ратацыю на радыё (бо для гэтага яна павінна быць фарматнай), ці зможам мы выконваць яе на тэлебачанні. Але не думаю, як гэта будзе прадавацца, бо тады прападзе элемент творчасці ў напісанні музыкі. Мне б такога не хацелася, таму што кожная кампазіцыя для мяне па-свойму дарагая.

***— А ці складана сёння трапіць у ратацыю на радыё?***

— Напачатку майго творчага існавання ўпісацца ў фармат было складана. Быў час, калі мае песні наогул не бралі ні на адну радыёстанцыю. Цяпер сітуацыя складваецца ўжо па-іншаму. Таму магу сказаць, фармат — гэта ў першую чаргу якаснае, сучаснае гучанне. Плюс наяўнасць сэнсу ў тэксце. У прынцыпе патлумачыць паняцце «фармат для радыё» складана. Трэба проста «паварыцца» ў гэтым, паслухаць радыёстанцыі, каб разумець тэндэнцыі.

***— Калі вы выкладваеце песні ў інтэрнэт, вам не крыўдна, што за іх не заплацяць?***

— Музычны рынак СНД пакуль не гатовы да той формы ўзаемаадносін, калі за кампазіцыю ў сеціве трэба плаціць, як робяць гэта ў Еўропе, Амерыцы. Мы прызвычаіліся атрымліваць музыку бясплатна. Я пакуль не ў тым статусе, каб ламаць гэты стэрэатып. Як пачатковец, хачу верыць, што нехта, праслухаўшы нашу музыку, захоча пацікавіцца, хто такія гэтыя хлопцы з гурта Misters? Прадаваць музыку сёння для мяне раскоша, якую зараз не магу сабе дазволіць.



***— Прыняўшы рашэнне паспрабаваць сябе ў тэлешоу «Хачу да Меладзэ» вы думалі аб тым, ці гатовы — калі ўсё складзецца — пачаць з чыстага ліста ў іншым праекце?***

— Тым, хто верыць у ілюзіі, быццам у такія праекты бяруць неправерaных людзей, варта зразумець, што цуды бываюць толькі ў казках. І мая мэта была не ў тым, каб трапіць у новую групу, для мяне гэта была магчымасць засвяціцца. Разумеўшы, што на шоу са мной хочуць весці гульню, на правілы якой я першапачаткова не падпісваўся, проста сказаў «дзякуй» і сышоў... Такія конкурсы не прыносяць поспеху, яны даюць толькі лепшым выпадку пазнавальнасць. Бо, калі не прыкладаюць сіл для далейшага развіцця, ніякі чараўнік вас ратаваць і прасоўваць не будзе.

***— У групе вы і кіраўнік, і чалавек, які піша музычны матэрыял. Складана ўсё рабіць самастойна?***

**«Музычны рынак СНД пакуль не гатовы да той формы ўзаемаадносін, калі за кампазіцыю ў сеціве трэба плаціць, як робяць гэта ў Еўропе, Амерыцы. Мы прызвычаіліся атрымліваць музыку бясплатна. Я пакуль не ў тым статусе, каб ламаць гэты стэрэатып».**

— Мяне жыццё навучыла, што рашэнні заўсёды трэба прымаць самастойна, бо табе і несці за іх адказнасць. З хлопцамі мы адразу дамаўляліся пра такія ўзаемаадносіны. Сумяшчаць творчасць з іншымі абавязкамі складана.

Я ніколі не марыў быць аранжыроўшчыкам, стылістам, кіроўцам і гэтак далей, але даводзіцца выконваць розныя ролі, бо так можна скараціць выдаткі. Разумееце, калі ў 18 гадоў я прыехаў са Слуцка і вучыўся, падпрацоўваючы ў рэстаране, то мне на жыццё хапала. Але заплаціць за гатовую песню я не мог, таму стаў імкнуцца рабіць усё сам. Студыя ў мяне з'явілася пасля вяселля, за што ўдзячны ўсім нашым гасцям. На ім пазнаёміўся з Ільём Шапірам і цяпер мы супрацоўнічаем... Я за тое, каб спадзявацца толькі на свае сілы і заставацца заўсёды самім сабой.



**Алена ДРАПКО.** *drapko@zviazda.by*

Запрашальнік

# МОЙ ВЫБАР — БЕЛАРУСЬ!

**Рэспубліканскі інтэрнэт-конкурс патрыятычнага фота і відэа «Радзіма вачыма студэнтаў» пройдзе ў Беларусі з 26 верасня па 7 кастрычніка.**

Ва ўпраўленні па справах моладзі Міністэрства адукацыі ўдакладнілі, што, згодна з умовамі творчага спаборніцтва, кожная ўстанова адукацыі па рашэнні органаў студэнцкага самакіравання мае права накіраваць толькі адну работу (фота і відэа) па кожнай з намінацый. Даўжыня відэароліка не павінна перавышаць пяць хвілін.

Пераможцаў вызначаць з дапамогай сацыяльных сетак у наступных намінацыях: «Мой выбар — мая Беларусь», «Кім я стану, кім мне быць, каб Радзіме служыць», «Свету — мір» і «Люблю цябе, мая родная ВНУ!» Аўтары найлепшых работ будуць узнагароджаны дыпломамі ўдзельніка і памятнымі прызамі.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ №12
ад 19 лютага 2009 года выдадзена
Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі газеты —
Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»,
грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Дырэктар — галоўны рэдактар
КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

Адказныя за выпуск: рэдактар аддзела
Надзея НІКАЛАЕВА, рэдактар аддзела Сяргей РАСОЛЬКА.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.

Кантактныя тэлефоны: 292 44 12, 287 17 41.
e-mail: info@zvyazda.minsk.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛД №02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.
Тыраж 20.022.
Нумар падпісаны ў 19.30 23.09.2015 г.

■ Разважанні пра сучаснасць

# ЗНАЙСЦІ З ЛЮДЗЬМІ АГУЛЬНУЮ МОВУ

## Епіскап Слуцкі і Салігорскі Антоній — пра змяшаныя шлюбы, стасункі з каталікамі і любоў да бліжняга

Слуцк здаўна быў цэнтрам праваслаўнага жыцця. Менавіта адсюль пачыналася гісторыя Мінскай епархіі, створанай у 1793 годзе. Але ў Мінску не знайшлося месца для епіскапа, дзе ён мог бы жыць, размясціць сваю канцылярыю, прымаць наведвальнікаў. Такія ўмовы існавалі ў Слуцку, дзе з 1793 па 1799 год архіерэй і пражываў у славутым Свята-Троіцкім (Трайчанскім) манастыры.

Да рэвалюцыі 1917 года ў горадзе, па розных сведчаннях, налічвалася да 15 праваслаўных храмаў на 14 тыс. насельніцтва, некалькі манастыроў, як жаночых, так і мужчынскіх. На жаль, сёння ў Слуцку захавалася толькі адна гістарычная царква — драўляная Міхайлаўская, канца XVIII стагоддзя (сёння кафедральны сабор). Манастырскі храм святых Касмы і Даміяна быў перабудаваны з салдацкага клуба. Усяго на слуцкай зямлі налічваецца 19 зарэгістраваных праваслаўных абшчын, у тым ліку 4 — у самім горадзе. Тры з іх маюць свае храмы. У горадзе плануецца пабудаваць яшчэ адзін вялікі кафедральны сабор і сабраць у ім галоўныя рэліквіі Слуцка. Выдатным помнікам беларускай праваслаўнай культуры з'яўляецца Слуцкае Евангелле: тэкст Новага Запавету перапісаў у 1582 годзе ўласнаручна князь Юрый Алелькавіч — бацька святой праведнай Сафіі Слуцкай. Слуцкае Евангелле захоўвалася ў Магілёве, у пакоі-сейфе абкама партыі да лета 1941 года разам з Крыжам прападобнай Еўфрасінні Полацкай: у 1929 годзе туды меркавалася перанесці сталіцу Беларусі. Падчас Вялікай Айчыннай вайны святыні адначасова зніклі. Але Слуцкае Евангелле знайшлося цудоўным чынам.

### УВАСКРАШЭННЕ З НЕБЫЦЦЯ І КАЎЧЭГ ДЛЯ ПРАВЕДНІЦЫ

— Настаяцель Пакроўскага прыхода Мінска айцец Віктар Белякоў адпяваў нябожчыка ў доме адной з прыхаджанак. Жанчына ў знак удзячнасці ахвяравала яму сямейную рэліквію: кнігу, што захоўваў яе бацька, які доўгі час правёў у ссылцы пры савецкай уладзе, — распавёў **епіскап Слуцкі і Салігорскі АНТОНІЙ**. — Ён расказваў, што ў тыя мясціны, дзе ён адбываў зняволенне, звозіліся кнігі з усіх куткоў Савецкага Саюза для спальвання. Калі прыйшоў чарговы абоз, яму ўдалося схаваць адну з кніг пад крысом кажуха і зберагчы да самага вызвалення. Святар прыняў кнігу ў дар, і яна праляжала ў яго некалькі гадоў. Аднойчы ён прымаў у гасцях археолага, паказаў яму сваю бібліятэку, у тым ліку і падораную кнігу. Калі той пачаў яе гартаць, то натрапіў на радкі, якія сведчылі, што кніга напісана рукой князя Юрыя Алелькавіча. Пра гэта ён паведаміў Патрыяршаму Экзарху ўсяе Беларусі Мітрапаліту Філарэту. Вось так у 2002 годзе Слуцкае Евангелле ўваскрэсла з небыцця.

Да 1930 года ў Слуцку ў Свята-Троіцкім манастыры захоўваліся мошчы праведнай Сафіі Слуцкай, якая памерла ў 1612 годзе. Затым яны былі перанесены ў Мінск і цяпер знаходзяцца ў Свята-Духавым кафедральным саборы. Мошчы цалкам нятленныя, захавалася нават скура.

— З заснаваннем Слуцкай епархіі да мяне пачалі звяртацца людзі з просьбай вярнуць мошчы, паколькі ў Слуцку няма такога месца, дзе прыхаджане адчувалі б прысутнасць праведніцы. Я ж адказваў, што такое пытанне пакуль дачаснае, таму што іх няма дзе размясціць. Але запэўніў прыхаджан, што будзем прасіць у мітрапаліта Паўла, каб дазволіў перанесці ў Слуцк нейкую частку цела святой, калі такое магчыма. Калі адкрылі раку, то ўбачылі, што левая ступня праведніцы ляжыць асобна.



1 красавіка гэтага года з благаслаўлення Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі Мітрапаліта Паўла яе перанеслі ў Сафійскі жаночы манастыр, — падзяліўся радасцю ўладыка Антоній.

Дарэчы, у 1930 годзе экспертыза астанкаў Сафіі Слуцкай выявіла, што не было ніякага бальзамавання, мошчы захаваліся натуральным чынам. Каўчэг, дзе захоўваецца нятленная ступня, уяўляе сабой сапраўдны твор мастацтва: зроблены з серабра, упрыгожаны каштоўнымі камянямі. Гэта работа ювеліра з Мінска. Але епіскап пакуль не называе яго імя. Да 900-годдзя Слуцка рыхтуецца кніга, дзе падрабязна апішуць гісторыю стварэння каўчэга.

### БЛІЖЭЙ ДА ПРЫХАДЖАН

Слуцкая епархія была створана 23 кастрычніка 2014 года. У гэты дзень з Мінскай епархіі былі выдзелены яшчэ дзве: Барысаўская і Маладзечанская. Мінская епархія цяпер займае тэрыторыю Мінскага раёна і сталіцы.

— Кожная з абласцей Беларусі налічвае па дзве епархіі. І толькі Мінская складала адзіную епархію, якая падпарадкоўвалася Патрыяршаму Экзарху ўсяе Беларусі, — растлумачыў уладыка Антоній. — На той час яна разраслася да незвычайных памераў: 413 праваслаўных прыходаў знаходзіліся ў распараджэнні аднаго епіскапа. За год ён не мог фізічна правесці службу нават па адным разе ў кожным храме. Для таго, каб актывізаваць прыходскае жыццё, каб епіскап быў бліжэй да народа, змог на месцах вырашаць усе пытанні, Мінскую епархію раздзялілі на чатыры часткі. У склад Слуцкай увайшло сем паўднёвых раёнаў: Клецкі, Салігорскі, Любанскі, Старадарожскі, Капыльскі, Нясвіжскі, Слуцкі — з цэнтрам у Слуцку, гістарычнай цвярдыні праваслаўя на беларускай зямлі. У межах епархіі дзейнічаюць 103 прыходы, але ў 30 з іх пакуль няма храмаў. Богаслужэнні праводзяцца ў часова прыстасаваных памяшканнях. Шмат трэба зрабіць у Салігорску: горад вельмі разросся, з трох зарэгістраваных абшчын толькі адна мае царкву. Спадзяёмся, у найбліжэйшы час будзе выдзелена зямля пад будаўніцтва святыні.

### ЖЫЦЬ ПА ЗАПАВЕДЗЯХ

— Для царквы, як і для дзяржавы, самым галоўным набыткам з'яўляюцца людзі, а кожны чалавек — каштоўнай жамчужынай. Бывае, хтосьці са святароў кажа, што яму складана ладзіць стасункі з жыхарамі, маўляў, рэгіён асаблівы. Спрабую растлумачыць яму, што няма складаных прыхаджан: трэба знайсці з імі агульную мову, каб данесці евангельскую веру. Святы Мікалай Японскі сказаў дзівосную рэч: «Пры сустрэчы з людзьмі ніколі не пачынай гаварыць аб Хрысце, нават калі прыйшоў з гэтай мэтай. Спачатку ты павінен палюбіць усіх людзей, з якімі працуеш, потым яны павінны палюбіць цябе, затым ужо ты павінен ім казаць аб Хрысце». Таму ўсё залежыць ад святара: ці ўбачаць людзі ў яго вачах святло евангельскай веры. Мітрапаліт Антоній Суражскі казаў: «Калі хрысціяне страцяць Евангелле, не застанецца ніводнай кнігі, мы зможам чытаць яго ў вачах адзін аднаго, веруючых людзей». Інакш, словы Хрыстовы захоўваюцца ў сэрцы чалавека. Хрысціянства — не кніга, не слова, а жыццё па запаведзях, якія дараваў нам Хрыстос.

Я наведаў амаль усе прыходы нашай Слуцкай епархіі і пераканаўся, што ўсюды людзі з радасцю прымаюць Праваслаўную Царкву. Праваслаўная вера існуе на нашай зямлі больш як тысячагоддзе, гэта наша спрадвечная вера, таму людзі і цягнуцца да зносін са святарамі, — працягвае ўладыка Антоній. — У нас звыш 10 прыходаў, у якіх патрабуюцца настаяцелі. У асноўным у вёсках, дзе засталося няшмат жыхароў. Але яны больш шчырыя, адкрытыя, чым у горадзе. Нашы людзі, на мой погляд, не навучыліся жыць у мегаполісе. Да рэвалюцыі 80% насельніцтва было вясковым, усе жылі адной дружнай сям'ёй, дапамагалі адно аднаму. У горадзе яшчэ застаецца паміж людзьмі нейкая раз'яднанасць. І праваслаўныя храмы з'яўляюцца тымі цэнтрамі, дзе людзі становяцца адным цэлым — вялікай сям'ёй. Святар не проста чалавек, які прыйшоў, прачытаў малітву і закрыў царкву. Ён павінен стаць бацькам для кожнага. І я бачу, што ім удаецца гэта.

### РАЗАМ СУПРАЦЬ СУЧАСНЫХ ВЫКЛІКАЎ

У Праваслаўнай Царквы, лічыць епіскап, самыя добрыя стасункі з каталіцкай царквой, няма міжканфесійнай напружанасці. Гэта вельмі блізкія галіны хрысціянства, пра тое сведчаць шматлікія змяшаныя шлюбы: жонка праваслаўная, муж католік, або наадварот. Сваіх дзяцей яны выхоўваюць у павазе да адной і другой веры. У такіх сем'ях адзначаюць як каталіцкія, так і праваслаўныя святы. Так, гэта дзве традыцыі, але разам з тым гэта — вера ў Бога, які прыйшоў выратаваць чалавецтва.

— Я сказаў бы, што гэта асаблівасць гістарычнага шляху беларускага народа. Чаму еўрапейцам тут цікава бываць? Таму што няма больш такой краіны на скрыжаванні двух культур — заходняга і ўсходняга хрысціянства. Такое можна ўбачыць толькі ў Беларусі на прыкладзе нашых змяшаных сем'яў. Мы ў першую чаргу думаем пра тое, што нас з католікамі аб'ядноўвае, а не раз'ядноўвае. Не з пазіцый ворагаў, а зыходзячы з тых выклікаў, з якімі даводзіцца сутыкацца сучаснай моладзі, грамадству,— сцвярджае ўладыка Антоній.

Ці ёсць якая розніца паміж каталікамі і праваслаўнымі ў барацьбе з наркатычнай, гульнявай залежнасцю моладзі, п'янствам, разбэшчанасцю? Нядаўна, як паведамілі сродкі масавай інфармацыі, у Расіі памёр падлетак, які прасядзеў за камп'ютарам больш за 20 дзён. Жудасна. Гэта той стан, аб якім царква папярэджвае, — апантанасць, калі чалавек гатовы зрабіць усё, каб задаволіць сваю ненатуральную патрэбу, што перарасла ва ўтрапёнасць. Няўжо мы не павінны аб'ядноўваць намаганні католікаў і праваслаўных? І мы гэта робім. І шмат у нас іншых напрамкаў, дзе працуем разам, — падсумоўвае сказанае ўладыка Антоній.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.** lazovskaya@zviazda.by

■ 70 гадоў без вайны

# ПА ТРЫ БАКІ ПАЛОНУ

## Кніга, якая выйшла ў Выдавецкім доме «Звязда», расказвае аб лёсах савецкіх, польскіх і нямецкіх ваеннапалонных на тэрыторыі Беларусі

**Пераліваюцца цымбалы, гучыць адзінокая скрыпка... У такой атмасферы была прэзентавана кніга «Цяжкае бярэмя палону: ваеннапалонныя і інтэрніраваныя Другой сусветнай вайны на тэрыторыі Беларусі 1939 — 1951 гг.», якая ўбачыла свет у Выдавецкім доме «Звязда».**

Каб абмеркаваць новы твор, у гістарычнай майстэрні імя Леаніда Левіна сабраліся гісторыкі і эксперты ў галіне ваеннай гістарыяграфіі. Галоўнымі героямі сустрэчы сталі аўтары кнігі — прафесар, доктар гістарычных і кандыдат юрыдычных навук Анатоль Шаркоў і кандыдат гістарычных навук Алена Мох-Дакунова.

— Мы шмат пісалі пра герояў, пра герайчныя ўчынкі, але не трэба забываць, што найперш вайна — гэта трагедыя, — лічыць Анатоль Шаркоў. — І найбольш трагічны лёс напаткаў ваеннапалонных. Прычым усіх ваюючых бакоў. Да нядаўняга часу аб гэтай з'яве і ўвогуле аб людзях, якія трапілі ў палон, не прынята было гаварыць. Але гэта таксама было, і пра гэта трэба ведаць.

Калі для Анатоля Шаркова праца над кнігай стала не першым пісьменніцкім досведам, у тым ліку па гэтай тэме, то для Алены Мох-Дакуновай гэта дэбют. Як расказала даследчыца, праблематыкай Вялікай Айчыннай вайны яна займаецца яшчэ са студэнцкіх гадоў.

— Прычым вялікая колькасць даследаванняў закранае лёс маёй сям'і ў гады Вялікай Айчыннай вайны, — гаворыць Алена Мох-Дакунова. — Мой дзядуля ваяваў на фронце, бабуля была сагнана ў Германію. Такім чынам, асабісты вопыт перарос у навуковае даследаванне, прысвечанае лёсам былых савецкіх ваеннапалонных, якія знаходзіліся ў нямецкіх лагерах.

У кнізе «Цяжкае бярэмя палону» адлюстраваны лёс як савецкіх, так польскіх і нямецкіх ваеннапалонных. Параўнаць умовы іх утрымання ў лагерах, жыццё пасля заключэння і ўвогуле акунуцца ў атмасферу зняволення можна дзякуючы дакументам і ўспамінам былых вязняў.

Барыс Папоў, адзін з герояў кнігі, прайшоў праз пакуты канцлагераў Драздзы, Масюкоўшчына, лагераў у Гомелі і Мюльбергу (Германія). «Лагеры былі розныя, — успамінае Барыс Антонавіч. — Самы страшны — Драздзы. Гэта першы лагер, гэта сотні тысяч салдат і афіцэраў... Нічога не было падрыхтавана для забеспячэння жыццядзейнасці такой колькасці людзей. Я там знаходзіўся 12 дзён, 10 з якіх нас не кармілі. Пілі толькі ваду з забруджанай ракі. Не ведаю, як выжыў...»

А між іншым, Барысу Антонавічу ідзе 94 год! І ён у гэтай зале, сярод прысутных. Прыйшоў, каб павіншаваць аўтараў з кнігай, якая, на іх погляд, павінна стаць сімвалам міру, узаемаразумення паміж народамі.



У кнізе «Цяжкае бярэмя палону» змешчаны ўнікальныя кадры, знойдзеныя ў архівах.

**Вераніка КАНЮТА.** kanyuta@zviazda.by




Фота Аляксандра ШАБЛЮКА.

Аўтары кнігі Анатоль ШАРКОЎ і Алена МОХ-ДАКУНОВА.

■ Праблема

# ЦІ МОЖНА АБАРАНІЦЦА АД РЭКЛАМЫ ВА ЎЛАСНЫМ ПАД'ЕЗДЗЕ?

**Упраўленне гандлю і паслуг Мінгарвыканкама па прапанове «Звязды» плануе звярнуцца ў Мінгандлю, каб ініцыяваць змены ў «Закон аб рэкламе»**




**Цяпер у сваёй паштовай скрыні гараджане амаль заўсёды знаходзяць цэлую кучу ўлётак і буклетаў, якія прапануюць розныя спосабы патраціць сумленна зробленыя грошы. Падобнымі аб'явамі нярэдка бязлітасна залеплены стэнды для карыснай інфармацыі і дзверы пад'ездаў, кабіны ліфтаў і тамбурныя дзверы, рэкламныя лісткі часам тырчаць нават у шчылінах уваходных дзвярэй у кватэру...**

## «ДАСТАЛІ ЎЖО!»

Грамадзяне, мякка кажучы, не адчуваюць з гэтай нагоды захаплення. «Кідаюць нам сваю макулатуру ў скрыні проста ў велізарных колькасцях», — кажа інтэлігентнага выгляду пажылая жанчына, якая сустрэлася нам ля дома №29 па вуліцы Асаналіева ў Мінску.

Малады мужчына, які назваўся Аркадзем, яшчэ больш катэгарычны: «Спачатку рынак вывучыце (маюцца на ўвазе рэкламадаўцы. — **Рэд.**), а потым рэкламу сваю суньце. Наш дом пасля рамонту, усюды стаяць шклопакеты, дык не — высціляюць пад'езд паперкамі з рэкламай «Памяняйце вокны». Дасталі ўжо!»

«Зразумець, што гаспадары кватэры з'ехалі з горада, можна ўжо па тым, колькі паперы назбіралася ў паштовых скрынях, — кажа мінчанка Галіна Уласенка. — А гэта ўжо можа быць прамым сігналам для злодзея»...

## ШТО КАЖУЦЬ СПЕЦЫЯЛІСТЫ

Ці можна змагацца з надакучлівай рэкламай у сваім доме? І як гэта лепш зрабіць?

З гэтымі пытаннямі мы звярнуліся да **начальніка аддзела па суправаджэнні рэформаў і інфармацыйна-грамадскай дзейнасці Мінскай гарадской жыллёвай гаспадаркі Людмілы ШМАРЛОЎСКАЙ**, але яна толькі развяла рукамі:

— Вам трэба звярнуцца ва ўпраўленне гандлю Мінгарвыканкама. Мы тут нічога зрабіць не можам. Нашы работнікі па комплекснай прыборцы перыядычна чысцяць дошкі інфармавання ля пад'ездаў ад непатрэбнай рэкламы, якую наляпліваюць нядбайныя рэкламшчыкі, заклейваючы пры гэтым нашу інфармацыю, якую мы спрабуем данесці да жыльцоў. Мы тлумачым на сходах апошнім, што нельга размяшчаць несанкцыянаваную рэкламу. Больш ніякіх захадаў мы прымяніць не можам.

Звяртаемся ва **ўпраўленне гандлю і паслуг Мінгарвыканкама. Яго начальнік Ніна ЕМЯЛЬЯНАВА** тлумачыць:

— Кідаючы рэкламныя ўлёткі ў паштовыя скрыні, ніхто закон не парушае. Заканадаўства нашай краіны не змяшчае забароны на размяшчэнне і распаўсюджванне рэкламы ў жылых дамах, а таксама з дапамогай паштовых скрынь абанентаў. Іншае пытанне, калі б рэкламу распаўсюджвалі вандальным спосабам, г. зн. пашкодзілі паштовую скрыню, напрыклад. Тады пацярпелы мог бы напісаць заяву ў органы ўнутраных спраў аб прыцягненні вінаватай асобы да адказнасці, але пры гэтым трэба ведаць, хто вінаватая асоба. І, дарэчы, у нас цяпер усе пад'езды замкнутыя, усюды дамафоны. Хто пускае гэтых распаўсюджвальнікаў у пад'езд? Самі ж жыльцы...

— Але калі чалавек супраць рэкламы ў сваёй паштовай скрыні, што ён павінен зрабіць, каб пазбавіцца ад яе?

— Можна напісаць зварот рэкламадаўцу (арганізацыя або грамадзянін, дзейнасць або тавары якіх рэкламуюцца) з просьбай аб спыненні размяшчэння (распаўсюджвання) рэкламы пры дапамозе паштовых скрынь па вашым адрасе. Рэкламадавец у адпаведнасці з заканадаўствам абавязаны разгледзець ваш зварот і падрыхтаваць адказ.

Але ж кожнаму не напішаш...

## ДЗЕ МОЖА БЫЦЬ РЭКЛАМА

Рэкламная інфармацыя можа размяшчацца на спецыялізаваных дошках аб'яваў, але толькі з дазволу ЖЭСа і на дагаворнай аснове. Жыльцы дома могуць выкарыстоўваць іх для падачы інфармацыі некамерцыйнага характару — напрыклад, пра зніклых або знойдзеных свойскіх жывёл. Скарыстацца дошкай можа і арганізацыя, якая адказвае за ўтрыманне будынка.

— А калі рэкламу размяшчаюць на фасадах, слупах, тады нядобрасумленных рэкламадаўцаў можна прыцягнуць да адказнасці, — тлумачыць Ніна Емяльянава. — Наша ўпраўленне сёлета склала 41 пратакол аб адміністрацыйным правапарушэнні за неналежную рэкламу. Пры гэтым мы штрафуем тое прадпрыемства, якое такім чынам рэкламуе сваю дзейнасць. Складсі пратакол аб адміністрацыйным правапарушэнні мы можам таксама і ў дачыненні да таго, хто распаўсюджвае рэкламу на слупах ці фасадах. Памер штрафу за размяшчэнне (распаўсюджванне) неналежнай рэкламы складае ад 20 да 50 базавых велічынь.

## ДЗЕ Ж ВЫЙСЦЕ?

Безумоўна, можна паглядзець на рэкламу і як на карысную інфармацыю, якая можа спатрэбіцца ў выпадку, калі вы захочаце аддаць дзяцей у новы развіваючы цэнтр, пра які вы не ведаеце, або наведаць новую цырульню, што адкрылася каля вашага дома. Але што рабіць, калі вы шукаеце падобную інфармацыю ў інтэрнэце і катэгарычна супраць рэкламы ў сваім пад'ездзе?

Пакуль нам даступна толькі наступнае: перш за ўсё, трэба абзавесціся надзейным дамафонам — гэта заўсёды карысна, у тым ліку з меркаванняў бяспекі. І не адчыняць дзверы «паштальёну» або «сантэхніку», якія тэлефануюць у вашу кватэру, каб патрапіць у пад'езд: у паштальёна ёсць свой ключ, у сантэхніка з ЖЭСа таксама, а прыватны майстар ідзе ў канкрэтную кватэру і яго павінны сустрэць гаспадары.

Але, можа быць, пара ўжо, як на Захадзе: калі на паштовай скрыні маецца налепка «Не кідаць аб'явы!», а табе яе кінулі — штрафаваць фірму, якая рэкламуе падобным чынам? Праўда, для гэтага патрэбны змены ў заканадаўстве. Дарэчы, ва ўпраўленні гандлю і паслуг Мінгарвыканкама нас запэўнілі, што плануюць звярнуцца ў Мінгандлю, каб ініцыяваць падобныя змены ў «Закон аб рэкламе».

**Святлана БУСЬКО.**
*busko@zviazda.by*

■


Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, офис 1703** |
| **Продавец** | **ОАО «Строммаш», г. Минск, Бетонный проезд, д. 6, к. 309** |
| **Месторасположение предмета аукциона** | **Минская обл., Молодечненский р-н, г. Молодечно, ул. Громадовская, 20** |

**Предмет аукциона (имущество реализуется одним лотом)**

| Наименование | Назначение | Общая площадь | Инвентарный номер |
|---|---|---|---|
| **Главный корпус – производственный цех** | Здание специализированное для производства машин и оборудования | 1 775,5 | 630/С-46711 |
| **Сварочный цех – механическая мастерская** | | 852,5 | 630/С-46708 |
| **Склад-магазин** | Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ | 361,8 | 630/С-46709 |
| **Здание склада** | | 175,5 | 630/С-46710 |
| **Склад** | | 44 | 630/С-73831 |
| **Гараж** | Здание специализированное автомобильного транспорта | 23,7 | 630/С-73652 |
| **Проходная** | Здание неустановленного назначения | 9,7 | 630/С-46712 |
| **Подкрановая площадка*** | Сооружение специализированное складов, хранилищ | 683 | 630/С-73651 |
| *Составные части и принадлежности: | Рельсы, кран козловой с электроталью | | |
| **Подкрановая площадка*** | Сооружение специализированное складов, хранилищ | 677 | 630/С-73649 |
| *Составные части и принадлежности: | Рельсы, кран козловой с электроталью | | |
| **Теплотрасса** | Сооружение специализированное коммунального хозяйства | 225,6 м | 630/С-73656 |
| **Фекальная канализация** | | 91,6 м | 630/С-73655 |
| Водопроводная сеть | | 17,9 м | 630/С-73650 |
| **Объекты благоустройства*** | Сооружение неустановленного назначения | 387,4 | 630/С-73647 |
| *Составные части и принадлежности: | Ограждения (металлическое 147,3 м и железобетонное 240,1 м), площадки (асфальтобетонная 2094 кв.м и цементобетонная 943 кв.м) | | |

В состав предмета аукциона входит **оборудование:** кран однобалочный, кран-балки 2 шт., электроталь, трансформаторы 2 шт., распределительное устройство, компрессор, ресивер, молот пневматический, водонагреватели 3 шт.

**Начальная цена с НДС 20% – 3 569 847 168 белорусских рублей (снижена на 60%)**

| | |
|---|---|
| **Сведения о земельном участке**: | Для обслуживания зданий и сооружений продавцу предоставлен на праве постоянного пользования земельный участок пл. **1,6288 га** |

**Задаток 10% от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с №3012343260010; нерезидентами РБ в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – 3012343265044; в евро (EUR) – 3012343265060; в российских рублях (RUB) – 3012343265028; в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области, БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»**

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **15** рабочих дней после проведения аукциона |

По согласованию с продавцом возможно предоставление рассрочки оплаты на 6 (шесть) месяцев со дня заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by**

**Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Рэспубліка» от 18.08.2015**

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения аукциона** | **12.10.2015 в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки».** |
| **Дата и время окончания приема документов** | **09.10.2015 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки».** |
| **Контактные телефоны** | **Тел.: +375 17-280-36-37; +375 29-183-69-71. E-mail: auction@cpo.by** |



**РУП «Институт недвижимости и оценки» (Организатор аукциона) извещает о проведении повторного открытого аукциона со снижением цены**

**ПО ПРОДАЖЕ КУХНИ-СТОЛОВОЙ с инв. №500/С-49614,**

**расположенной по адресу: г. Минск, ул. Славинского, д. 4К, принадлежащей ОАО «Алевкурп» (Продавец). Земельные участки площадью 0,3679 га и 0,1151 га.**

**Начальная цена с НДС – 4 982 131 392 бел. руб. Задаток – 500 000 000 бел. руб. Шаг аукциона – 5%.**

*Задаток перечисляется на р/с №3012154337010 в ОАО «БПС-Сбербанк» ЦБУ №703, 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а, код 369. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в повторном аукционе по продаже кухни-столовой ОАО «Алевкурп»,* **проводимом 20 октября 2015 г.**

Аукцион состоится **20.10.2015 в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4. Заявления на участие и необходимые документы принимаются **по 16.10.2015 до 12.00** по адресу проведения аукциона.

*Первое полное извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 23.07.2015.*

Условия участия, срок заключения договора купли-продажи, условия оплаты, а также полный текст извещения содержатся на сайте Организатора аукциона **ino.by.**

**Телефоны для справок: 8 (017) 306-00-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52.**


■ Добрая навіна

# КАРТКА З ІНТЭРНЭТ-БОНУСАМ ДЛЯ СТУДЭНТАЎ

**Нацыянальная плацежная сістэма «БелКарт» і Белінвестбанк пачалі выпуск спецыяльных студэнцкіх картак, якія дапамагаюць трымальнікам атрымліваць ад 1 да 3 ГБ бясплатнага інтэрнэт-трафіку ад мабільнага апарата life :), калі трымальнік такога «пластыку» актыўна здзяйсняе безнаяўныя плацяжы.**

У прэс-службе «БелКарт» нам паведамілі, што студэнцкая картка павінна стымуляваць безнаяўныя плацяжы. Справа ў тым, што гэты плацежны сродак валодае ўсімі функцыямі звычайнай банкаўскай карткі, бо з яе дапамогай трымальнік можа расплачвацца ў крамах або аплачваць камунальныя паслугі, але пры гэтым пры ажыццяўленні безнаяўных плацяжоў ён назапашвае бясплатны інтэрнэт-трафік. Акрамя таго, карткай можна расплачвацца ў інтэрнэце і за мяжой.

На першапачатковым этапе такі банкаўскі прадукт стане даступным бясплатна для студэнтаў некалькіх беларускіх ВНУ і ССНУ. Ім дастаткова звярнуцца ў банк і прад'явіць студэнцкі білет. Усе астатнія могуць аформіць картку, звярнуўшыся ў банк. Поўны кошт афармлення складае 75 тысяч рублёў, а са зніжкай — 60 тысяч.

Каб атрымаць бонусы ад мабільнага аператара life :), трымальнікі картак павінны падключыцца да тарыфнага плану «йо1200». Ён дазваляе абанентам рабіць бясплатныя званкі, SMS і MMS у сетцы life :), дае 150 бясплатных хвілін у іншыя сеткі і вялікую колькасць інтэрнэт-трафіку. Памер бонусу залежыць ад сумы расходаў на паслугі life :). Чым актыўней трымальнік разлічваецца карткай — тым больш інтэрнэт-трафіку атрымлівае. Першыя карткі «life :) Бонус» ужо атрымалі студэнты першага курса БДУ.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

■

ОБЪЯВЛЕНИЕ

**Пуховичский районный исполнительный комитет**

## ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

**на право заключения договора аренды земельных участков, который состоится 27 октября 2015 в 15.00**

**в зале заседаний райисполкома, расположенного по адресу:**

**Минская область, Пуховичский район, г. Марьина Горка, ул. Ленинская, 47, 2-й этаж, к. 227**

НА АУКЦИОН БУДУТ ВЫСТАВЛЕНЫ:

**ЛОТ 1 – земельный участок с кадастровым номером 624450100001003466, расположенный по адресу: Минская область, Пуховичский район, г. Марьина Горка, площадь – 0,2100 га, для строительства и обслуживания 40-квартирного жилого дома, срок аренды – 25 лет, начальная цена – 313 010 293 рубля, размер задатка для участия в аукционе – 31 301 029 рублей, расходы, связанные с формированием земельного участка, – 11 887 577 рублей.**

**ЛОТ 2 – земельный участок с кадастровым номером 624450100001003528, расположенный по адресу: Минская область, Пуховичский район, г. Марьина Горка, Шацкое шоссе (вблизи СТО), площадь – 0,4370 га, для строительства автоматизированной автозаправочной станции, срок аренды – 25 лет, начальная цена – 297 881 081 рубль, размер задатка для участия в аукционе – 29 788 108 рублей, расходы, связанные с формированием земельного участка, – 16 311 294 рубля.**

Возместить потери сельскохозяйственного производства сумме 45 798 490 рублей, вызванные изъятием 0,3582 га сельскохозяйственных земель для использования в целях, не связанных с ведением сельского хозяйства, перечислив средства на их возмещение на расчетный счет 3602916010009. Получатель: Главное управление Министерства финансов Республики Беларусь по Минской области, УНП 600003383 в открытом акционерном обществе «Сберегательный банк Беларусбанк» г. Минск, код банка 795.

Желающим участвовать в аукционе необходимо внести соответствующий размер задатка на счет финансового отдела Пуховичского райисполкома, ф-л 500, АСБ «Беларусбанк», сч. № 3600625000021, код платежа – 4616.

**Участники аукциона должны предоставить следующие документы:**

- заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков;
- заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка.

**Кроме того, представляются:**

- гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования;
- индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;
- представителем гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;
- представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии устава и свидетельства о государственной регистрации юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;
- представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;
- представителем иностранного гражданина – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

**Заявления на участие в аукционе с необходимыми документами принимаются по адресу: г. Марьина Горка, ул. Ленинская, 47, Пуховичский райисполком, 2-й этаж, к. 220 с 19 октября по 23 октября 2015 г., с 8.00 до 13.00 по рабочим дням.**

**Заключительная регистрация – с 14.30 до 14.55 в день проведения аукциона по адресу: Минская обл., г. Марьина Горка, ул. Ленинская, 47, 2-й этаж, к. 227, зал заседаний райисполкома.**

Аукцион состоится по лоту при наличии не менее двух участников.

Оплата победителем за предмет аукциона производится разовым платежом путем безналичных расчетов.

Победитель аукциона вносит плату за право заключения договора аренды земельного участка: возмещает расходы, связанные с проведением аукциона и государственной регистрацией в отношении созданного земельного участка; получает разрешение на проведение проектно-изыскательских работ и строительного проекта на строительство объектов в срок, не превышающий два года.

Участки аукциона предварительно могут ознакомится с земельными участками, которые предлагаются для продажи на право заключения договоров аренды по результатам аукциона, путем выезда на место нахождения земельного участка.

**Дополнительную информацию можно получить по адресу: г. Марьина Горка, ул. Ленинская, 47, к. 220, контактный тел.: 8 01713 35879 с 8.00 до 13.00 по рабочим дням.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении 08 октября 2015 года повторных торгов с условиями по продаже изолированных помещений, принадлежащих ОАО «МАПИД»

**Сведения о предмете торгов (продаваемом имуществе)**

| № | Наименование, характеристики и местонахождение продаваемого имущества | Начальная цена, бел. руб. | Размер задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1. | Двухкомнатная квартира № 112, расположенная по адресу: г. Минск, ул. Каменногорская, 60-112 (9-й этаж, общая площадь – 60 кв. м (по СНБ – 62,0 кв. м), с выполненным полным комплексом отделочных работ | 993 000 000 | 99 000 000 |
| 2. | Административное помещение № 120, расположенное в жилом доме № 5 по ул. Прушинских, площадью 52,2 кв. м (инв. № 500/D-708120374) | 541 200 000 (без учета НДС) | 54 000 000 |

**Продавец имущества: ОАО «МАПИД», ул. Р. Люксембург, 205, 220036, г. Минск.**

**Организатор торгов: УП «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск.**

**Условие торгов**: победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «МАПИД», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

*Задаток (задатки) перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012104971019 в региональной дирекции №700 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369, УНП 190398583 в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.*

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае, если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов после предъявления копии платежных документов о перечислении вознаграждения за организацию и проведение торгов.

Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется победителем торгов (покупателем) в течение 30 календарных дней со дня заключения договора купли-продажи.

Расходы, связанные с государственной регистрацией договора купли-продажи и основанного на нем перехода права собственности, оплачиваются победителем торгов (покупателем).

Торги проводятся **08 октября 2015 года в 16.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 24.09.2015 по 06.10.2015 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К.Маркса, 39, каб. 6.

По вопросу ознакомления с продаваемым имуществом следует обращаться по телефону: 207-19-15.

**Телефоны для справок:**
**(017) 327-48-36 (УП «Минский городской центр недвижимости»);**
**(017) 207-19-15 (ОАО «МАПИД»).**

**Открытое акционерное общество**

## «Дорожно-строительный трест № 3»

**СООБЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ВНЕОЧЕРЕДНОГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ, которое состоится 06 октября 2015 года в 11.00 по адресу: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23.**

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**

1. Об утверждении результатов проведения закрытой подписки и увеличения уставного фонда.
2. Об утверждении решения о дополнительном выпуске акций Общества.
3. О внесении изменений в устав открытого акционерного общества «Дорожно-строительный трест № 3».

Регистрация лиц, имеющих право на участие в собрании, будет проводиться **06.10.2015 г. с 10.00 до 10.45 по адресу: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23.**

Дата составления списка лиц, имеющих право на участие в собрании, — **30.09.2015 г.**

Лицам, имеющим право на участие в собрании, можно ознакомиться с материалами к собранию **с 30 сентября 2015 года по адресу: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, каб. 33.**

Лицам, имеющим право на участие в собрании, при себе иметь документ, удостоверяющий личность (для представителей акционеров — доверенности, зарегистрированные в соответствии с действующим законодательством).

***Справки по телефонам: 28-40-20, 23-64-24 — ОЭАиП, Наблюдательный совет***

УНН 700049607

**Кобринский районный исполнительный комитет**

## РАССМАТРИВАЕТ НА КОНКУРСНОЙ ОСНОВЕ ПРЕДЛОЖЕНИЯ ПО ОРГАНИЗАЦИИ ПРОИЗВОДСТВЕННОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ

**на базе ликвидируемого открытого акционерного общества «Кобринский консервный завод», под которые предусматривается передача на безвозмездной основе объектов недвижимости и оборудования (линии по производству зеленого горошка и фруктовых соков)**

Базовые условия:

1. заключение инвестиционного договора с Республикой Беларусь в рамках Декрета Президента Республики Беларусь от 6 августа 2009 г. № 10 «О создании дополнительных условий для инвестиционной деятельности в Республике Беларусь»;
2. гашение кредиторской задолженности (на 16.09.2015 – 4 128 000 000 бел. руб.);
3. поэтапное создание не менее 50 рабочих мест;
4. осуществление деятельности на объектах в сфере производства в течение 5 лет (преимущественно с сохранением профиля предприятия);
5. инвестирование не менее 1,5 млн евро в эквиваленте (кроме пункта 2).

**Контактные телефоны:**
**8 01642 22804, 8 029 7228273, 8 01642 22099.** УНП 200042468

Утерянное страховое свидетельство «Обязательное страхование гражданской ответственности владельцев транспортных средств на территории Республики Беларусь» серии ВА № 4383523 в количестве 1 штуки в Представительстве Белгосстраха по Минскому району **считать недействительным.** УНП 600013344

## ГАЙНЕНСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

**проводит аукцион по продаже земельных участков в частную собственность гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов**

| № лота | Адрес земельного участка | Площадь земельного участка | Наименование инженерных сетей | Начальная цена (бел. рублей) | Задаток (бел. рублей) | Расходы по изготовлению документации |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | д. Старое Городище, уч. № 10, кадастровый номер 623280812001000048 | 0,1500 | Подъездные пути удовлетворительные | 22 692 500 | 4 538 500 | 14 206 100 |
| 2 | д. Медухово, уч. № 5б, кадастровый номер 623280807401000095 | 0,1469 | Подъездные пути удовлетворительные | 28 759 800 | 5 752 000 | 13 708 400 |
| 3 | д. Селище, уч. № 7, кадастровый номер 623280811301000066 | 0,1426 | Подъездные пути удовлетворительные | 23 857 200 | 4 771 400 | 14 126 600 |

**Аукцион проводится 27.10.2015 года в 10.00 по адресу: д. Логоза, ул. Центральная, д. 2 Логойского района Минской области, здание Гайненского исполнительного комитета.**

**Документы принимаются ежедневно с 8.00 до 17.00, кроме субботы и воскресенья, до 22 октября 2015 года (последний день подачи документов 21 октября до 17.00) по адресу: д. Логоза, ул. Центральная, д. 2 Логойского района Минской области.**

*Задаток перечисляется на р/с № 3600619021104 в ЦБУ № 611, филиал 500 Минского управления ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Логойск, ОКПО 04431493, УНН 600181697, Гайненский сельский исполнительный комитет, код платежа 04901. Победитель аукциона обязан в течение 10 (десяти) рабочих дней после утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за земельный участок и возместить расходы, связанные с подготовкой документации.*

**Контактные телефоны: 801774-56436, 56498.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ ЗЕМЕЛЬНОГО УЧАСТКА ДЛЯ СТРОИТЕЛЬСТВА И ОБСЛУЖИВАНИЯ ОДНОКВАРТИРНОГО ЖИЛОГО ДОМА В БОБРУЙСКОМ РАЙОНЕ

| Номер лота по порядку | Местоположение земельного участка | Начальная цена (руб.) | Размер задатка (руб.) | Расходы, связанные с подготовкой аукциона и документации, необходимой для его проведения | Условие проведения аукциона | Характеристика земельного участка | Кадастровый номер | Инженерная и транспортная инфраструктура | Дата проведения аукциона | Последний день приема заявлений |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1. | Бобруйский район, Сычковский сельисполком, д. Щатково, пер. 3-й Масловского, 15 | 9 843 404 | 984 340 | 15 027 514 (расходы возмещает победитель аукциона) | Наличие не менее двух участников | Площадь 0,1064 га | №720884012601000218 | - | 26.10.2015 г. | 20.10.2015 г. до 17.00 |
| 2. | Бобруйский район, Сычковский сельисполком, д. Щатково, пер. 3-й Масловского, 16 | 10 694 526 | 1 069 453 | 15 027 514 (расходы возмещает победитель аукциона) | Наличие не менее двух участников | Площадь 0,1156 га | №720884012601000219 | - | 30.10.2015 г. | 26.10.2015 г. до 17.00 |

**ПРИМЕЧАНИЕ:** Аукцион состоится в 15.30 по адресу: г. Бобруйск, ул. Пушкина, 215-а, 2-й этаж, малый зал заседаний. Заявления принимаются по адресу: г. Бобруйск, ул. Пушкина, 215-а, каб. 61 в рабочие дни с 08.00 до 17.00 с 1-ого дня после публикации извещения в СМИ.

Информация о земельных участках по контактным телефонам в г. Бобруйске: 72-05-40, 71-74-30.

Для участия в аукционе гражданин Республики Беларусь (лично или через своего представителя) в установленный в извещении о проведении аукциона срок обязан предоставить следующие документы в комиссию по проведению аукционов:

- заявление на участие в аукционе (с указанием кадастрового номера и адреса земельного участка);
- заверенную копию платежного поручения о внесении задатка (10% от начальной цены) на расчетный счет Сычковского сельисполкома №3600712110013 в АСБ «Беларусбанк», филиал 703, код 760, УНН 700045734, код платежа 04901;
- представителем гражданина Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность;
- при подаче документов на участие в аукционе граждане предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Порядок проведения аукциона:

1. К участию в аукционе допускаются лица, подавшие в указанные в извещении сроки соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении расчетный счет задаток.
2. Первая объявленная аукционистом цена предмета аукциона определяется в соответствии с шагом аукциона. Торги продолжаются до тех пор, пока по новой объявленной аукционистом цене аукционный номер поднял только один участник аукциона. Аукционист называет последнюю цену и номер данного участника трижды и объявляет проданным предмет аукциона словом «продано», а участника аукциона – победителем в отношении соответствующего предмета аукциона.
3. При отсутствии лиц из участников аукциона, готовых выкупить предмет аукциона по названной цене, аукционист называет эту цену три раза. Аукцион завершается, если после трехкратного объявления новой цены предмета аукциона ни один из участников аукциона не поднял своего номера.
4. Предмет аукциона снимается с аукциона по решению комиссии или организации до начала проведения аукциона в случае отсутствия участников аукциона либо если на объект аукциона претендует только один гражданин.

В течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона победитель аукциона обязан внести плату за земельный участок, возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, и выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона, которые подлежат выполнению до обращения за государственной регистрацией в отношении земельного участка.

Всем желающим предоставляется возможность предварительного ознакомления с объектом.

ПРЕДСЕДАТЕЛЬ СЫЧКОВСКОГО СЕЛЬСКОГО ИСПОЛНИТЕЛЬНОГО КОМИТЕТА З.С. Трубочка

■ 36,6°

# БЕРАЖЫСЯ, ГРЫП, — МЫ ІДЗЁМ ПРЫШЧАПЛЯЦЦА!

**Дзеці пайшлі ў садкі і школы, а значыць, прывітанне, рэспіраторныя захворванні. Перадаюцца зараз галоўным чынам рынавірусы. Лячыць іх трэба з усёй сур'ёзнасцю (яны, дарэчы, як і грып, здольныя выклікаць такое ўскладненне, як пнеўманія). Бо ў кастрычніку-лістападзе трэба быць гатовым да вакцынацыі ад грыпу. Сёлета, як і летась, плануецца прышчапіць 41 працэнт нашага насельніцтва, для чаго ўжо набыта 3 млн 800 тыс. вакцын.**



**За кошт рэспубліканскага бюджэту** будуць прышчэплівацца дзеці ад 6 месяцаў да 3 гадоў; дзеці ад 3 гадоў і дарослыя з хранічнай паталогіяй; дзеці з імунасупрэсіяй; тыя, каму за 65; цяжарныя; медыцынскія работнікі; дзеці і дарослыя, якія звязаны з бяспекай. **За кошт мясцовых бюджэтаў** будуць прышчэплены дзеці ад 3 да 6 гадоў, арнітолагі, работнікі прадпрыемстваў птушкагадоўлі, сферы абслугоўвання, гандлю, адукацыі, грамадскага харчавання, транспартных арганізацый, навучэнцы ўстаноў сярэдняй адукацыі, прафесійна-тэхнічных устаноў, ССНУ, ВНУ. Вакцыну будуць набываць і самі прадпрыемствы для вакцынацыі сваіх работнікаў.

— Грып — сур'ёзнае інфекцыйнае захворванне, якое патрабуе адпаведнай увагі, — кажа **кіраўнік Нацыянальнага цэнтра па грыпе Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра эпідэміялогіі і мікрабіялогіі Наталля ГРЫБКОВА.** — У першую чаргу мы кажам аб прафілактыцы. Супрацьгрыпозныя вакцыны зніжаюць колькасць цяжкіх ускладненняў, змяншаюць цяжкасць захворвання. 96 працэнтаў з тых, у каго выяўляецца грып, не вакцынаваліся. У апошнія гады не назіралася цяжкіх выпадкаў грыпу ў вакцынаваных, толькі лёгкія формы або вострыя рэспіраторныя захворванні. Усяго вядома каля 200 вірусных і бактэрыяльных агентаў, якія выклікаюць грыпападобныя захворванні. Таму не трэба чакаць, што калі вы прышчапіліся ад грыпу, то і іншых інфекцый у вас дакладна не будзе.

У прышчэпленых захворванне грыпам завяршаецца праз 7-10 дзён без развіцця цяжкіх наступстваў, без пнеўманіі. У групе рызыкі па гэтым ускладненні — не вакцынаваныя ад грыпу людзі сярэдняга ўзросту, з хранічнымі захворваннямі, прычым не толькі, скажам, з артэрыяльнай гіпертэнзіяй, але нават з лішняй вагой.

«Восенню і зімой, калі мы больш часу праводзім у памяшканнях, неабходна выпрамліваць пэўныя правілы гігіены, — тлумачыць **намеснік начальніка аддзела гігіены і прафілактыкі Міністэрства аховы здароўя Іна КАРАБАН.** — Пажадана вельмі часта праветрываць памяшканне, каб вірусы ў ім не затрымліваліся, рабіць лёгкую вільготную прыборку свайго працоўнага месца... Пры кашлі трэба карыстацца насоўкай, калі чхаць, то ў локцевы згіб».

### ЯКАЯ ВАКЦЫНА НАБЫТА ДЛЯ БЯСПЛАТНАГА ПРЫШЧЭПЛІВАННЯ?

Падчас сёлетняй кампаніі вакцынапрафілактыкі будзе выкарыстоўвацца «Грыпол плюс» (расійскай вытворчасці). Яна выклікае мінімум пабочных рэакцый, у тым ліку алергічных. Змяшчае поліаксідоній, што дазваляе павысіць супраціўляльнасць арганізма да іншых рэспіраторных інфекцый, якія могуць быць актыўнымі ў эпідсезон. Поліаксідоній — імунамадулятар, які слабую імунную сістэму ўзмацняе, а калі яна працуе занадта актыўна, зніжае да нармальнага стану. Такія вакцыны рэкамендаваны для дзяцей ад 6 месяцаў.

### ЯКІМІ ВАКЦЫНАМІ МОЖНА ПРЫШЧАПІЦЦА ЗА ЎЛАСНЫ КОШТ?

«Інфлювак» (Нідэрланды), «Ваксігрып» (Францыя), «Ультравак» і «Грыпол плюс» (Расія), «Флювак-сін» (Кітай). Іх могуць набыць прадпрыемствы для сваіх работнікаў. Сярэдні кошт вакцын — 90-150 тысяч рублёў.

• Усе партыі вакцын, якія паступаюць у нашу краіну, правяраюцца на алергеннасць і рэактагеннасць.

• Супрацьпаказаннем да прышчэплівання з'яўляецца алергічная рэакцыя на вакцыну або на бялок курынага яйка, а таксама рэспіраторная інфекцыя ў вострай фазе.

• Заразіцца грыпам падчас самой вакцынацыі немагчыма.

• Прымаць супрацьгрыпозныя прэпараты самастойна нельга (вірусы, як і бактэрыі, хочуць выжыць, а таму бескантрольнае злоўжыванне прэпаратамі можа прывесці да лекавай устойлівасці).

• Эфірны алей часнаку змяшчае вялікую колькасць фітанцыдаў, здольных прыгнятаць рост бактэрый, але супрацьвірусную актыўнасць апошніх не валодаюць.

• Паводле рэспубліканскага маніторынгу, пачатак эпідэміі грыпу прыпадае на канец студзеня — пачатак лютага і працягваецца 5-6 тыдняў.

• Пасля вакцынацыі ахоўны эфект з'яўляецца праз 2-3 тыдні. Эфект трымаецца 6-9 месяцаў (у розных людзей па-рознаму).

• Аптымальным тэрмінам для вакцынацыі ў нашай краіне з'яўляецца кастрычнік-лістапад.

• Мяркуецца, што і ў гэтым сезоне распаўсюджанасць грыпу не дасягне высокай інтэнсіўнасці.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**
*protas@zviazda.by*

# СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 6.58 | 19.04 | 12.06 |
| Віцебск — | 6.47 | 18.54 | 12.07 |
| Магілёў — | 6.48 | 18.54 | 12.06 |
| Гомель — | 6.44 | 18.51 | 12.07 |
| Гродна — | 7.13 | 19.20 | 12.07 |
| Брэст — | 7.14 | 19.20 | 12.06 |

## Месяц

*Першая квадра 21 верасня. Месяц у сузор'і Вадалея.*

## Імяніны

*Пр. Віктара, Дзмітрыя, Мікалая, Сяргея. К. Марыны, Яніны, Германа, Тодара.*



Фота Ліны МАЛІНІНАЙ.

# ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

— Фіма, ты ж такі пакараеш мяне сёння ноччу?

— Кінь, Софачка, ты ні ў чым не вінаватая.

**— У цябе ў галаве адны серыялы. Я сыходжу!**

**— Але мы разам ужо пяць сезонаў!..**

Прараб Васіль настолькі добра валодае інтанацыяй, што фразай «Тваю мацы!» можа і павітацца, і абляяць, і пахваліць, і нават выказаць спачуванне.

**— Ты можаш папраўляць іншых менш?!**

**— Радзей.**

Калі хочаш змяніць свет, зрабі гэта да жаніцьбы, бо пасля сам ты не зможаш змяніць нават колер шпалераў на кухні.

**Вельмі люблю чытаць гараскопы. Гэта адзінае месца, дзе ў мяне ёсць грошы, вандроўкі і ідэальныя адносіны.**




caricatura.ru

Даты | Падзеі | Людзі

## 24 ВЕРАСНЯ

*Сусветны дзень мора. Адзначаецца з 1978 года па ініцыятыве ААН і Міжнароднай марской арганізацыі.*

**1501** год — нарадзіўся Джэралама Кардана, італьянскі матэматык, філосаф, урач, вынаходнік кардана вала. Вучыўся ва ўніверсітэтах Павіі і Падуі. Спачатку займаўся выключна медыцынай, але да 1534-га да сферы яго інтарэсаў дадалася матэматыка — ён быў прафесарам матэматыкі спачатку ў Мілане, а пазней — у Балоньі. Медыцыну пры гэтым не кідаў. У вольны час падпрацоўваў складаннем астралагічных альманахаў і гараскопаў. У 1570 годзе быў абвінавачаны ў ерасі за складанне і публікацыю гараскопа Ісуса Хрыста. Некалькі месяцаў правёў у турме, затым паехаў у Рым прасіць адпушчэння грахоў у Папы. Джэралама Кардана ўнёс значны ўклад у развіццё алгебры: яго імя носіць формула для знаходжання каранёў кубічнага няпоўнага ўраўнення віду x3+ax+b=0. Новы метад вылічэння натхніў матэматыкаў Еўропы на новыя адкрыцці. Кардана ўвайшоў таксама ў гісторыю крыптаграфіі — вынайшаў нескладанае шыфравальнае прыстасаванне, якое называецца «рашоткай Кардана» (квадрат з выразанымі клеткамі). Поўны збор твораў Кардана змяшчае 10 тамоў, надрукаваных дробным шрыфтам. Паводле легенды, Джэралама Кардана прадказаў дзень сваёй смерці і, каб апраўдаць сваё прадказанне, сам замарыў сябе голадам да 21 верасня 1576 года ў Рыме.



**1904** год — нарадзіўся (вёска Цяцёркі, цяпер Браслаўскі раён) Мар'ян Іосіфавіч Пецюкевіч, беларускі этнограф. У 1926 годзе скончыў Віленскую беларускую гімназію, у 1938-м — Віленскі ўніверсітэт. Працаваў у перыядычным друку, бібліятэках, быў дырэктарам Беларускага музея ў Вільні. Даследаваў народную культуру беларусаў. Аўтар прац «Мікалай Нікіфароўскі — беларускі этнограф», «Аб паходжанні назвы Беларусь, беларус», «Беларуская этнаграфія ў працах польскіх даследчыкаў» і іншых. У 1949 годзе быў рэпрэсаваны, рэабілітаваны ў 1956-м. Да 1970 года — супрацоўнік этнаграфічнага музея ў г. Торунь (Польшча), дзе стварыў экспазіцыі матэрыяльнай культуры беларусаў. Памёр у 1983 г.

**1939** год — савецкія лётчыцы В.С. Гризадубава, П.Д. Асіпенка і М.М. Раскава на самалёце АНТ-37 «Радзіма» здзейснілі беспасадачны пералёт па маршруце Масква — Далёкі Усход. За 24 гадзіны 29 хвілін была пройдзена адлегласць у 6450 км і ўстаноўлены жаночы міжнародны рэкорд далёкасці. 2 лістапада яны сталі першымі жанчынамі ў СССР, якіх удастоілі ганаровага звання Героя Савецкага Саюза.

## Было сказана

**Валянціна АКОЛАВА, паэтэса:**
*За чубы хай бяруцца ўсе тыя,*
*Хто душою, як смецце, — пустыя.*

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 284 44 04, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, 287 17 21, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.022. Індэкс 63850. Зак. № 3755.

Нумар падпісаны ў 19.30 23 верасня 2015 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12